Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 ВЕРАСНЯ 2008 г.
ЧАЦВЕР
№ 181
(26294)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Званок у карпункт

У ПАЛОНЦЫ ХОЧУЦЬ НЯШМАТ...

На гэты раз у дарогу паклікаў тэлефоны званок з в. Палонка. Старшыня Савета ветэранаў працы Аляксей Шчэрбацэвіч паведаміў, што 23 верасня павінен разглядацца адказ на ліст-скаргу і сказаў, што добра было б, каб карэспандэнт «Звязды» на той сустрэчы папрысутнічаў. Хоць Палонка далекавата, за ёй канчаецца асфальт, а там, за лесам ужо Гродзеншчына, але як да чытачоў газеты не паехаць?

Мяне чакала расчараванне, бо па нейкай там прычыне сустрэчу адмянілі і ніхто з райвыканкама не прыехаў. Але Савет ветэранскай арганізацыі ўсё ж сабраўся і разгледзеў пытанне аб правядзенні «Агеньчыка», прысвечанага Сусветнаму дню састарэлых людзей. Са 155 удзельнікаў арганізацыі на вечар выказала жаданне прыйсці палова. Кожны ўносіць па 10 тысяч, накрываюцца сталы, дзеці мясцовай школы даюць невялікі канцэрт, адным словам, пенсіянеры самі стараюцца клапаціцца пра свой адпачынак. Здараецца і павіншаваць тыя сем'і, дзе муж і жонка пражылі 50 гадоў ці больш. Адзначу, што падобныя ветэранскія арганізацыі ў нашых вёсках рэдкасць, а ў Палонцы пенсіянеры разам ужо больш за 20 гадоў. І гэта сіла, з якой на мясцовым узроўні даводзіцца лічыцца.

А чаго хочуць жыхары Палонкі? Праблемы ў тым, што вёска даволі старадаўняя і для яе больш падыходзіць назва нават не пасёлак, а мястэчка. Тут два магазіны, дзіцячы садок, турбаза, лясніцтва, царква і касцёл, сярэдняя школа... Некалі, пасля вайны, была бальніца — адкрылі, калі наўкол беднасць і разруха стаялі. Затым бальніцу замянілі амбулаторыяй, а цяпер тут працуе ФАП. Для населенага пункта, у якім пражывае каля 800 чалавек, а яшчэ ФАП абслугоўвае 4 бліжэйшыя, няхай і неперспектыўныя вёскі, гэтага мала. А галоўнае, што да Баранавічаў — 25 кіламетраў. Ёсць амбулаторыя ў пас. Жамчужным за 12 км, але там свае пацыенты.

Тэма для «Звязды» не новая, да гэтай праблемы даводзіцца вяртацца пастаянна, бо людзі скардзяцца.

У Палонцы хочуць не многа: каб пры ФАПе было некалькі ложкаў дзённага стацыянару, каб пасля нейкіх там працэдур стары чалавек мог перадыхнуць, каб быў свой ці хоць бы з горада прыязджаў часцей доктар. Раз у два тыдні — гэта мала. Ды і калі прыязджае, то ўсіх абысці і прыняць яму няпроста. А што чалавеку рабіць, калі ў яго ўзнікае патрэба ў той жа кропельніцы?

(Заканчэнне на 3-й стар.)

ШАРАШОЎСКАЯ ВЯРГІНЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У гарадскім пасёлку Шарашова на Брэстчыне сёння многія «хварэюць» кветкамі, але не ў такой ступені як ***Настасся АЛЯХНОВІЧ.*** *І толькі таму, што ў яе зялёным куточку сёлета красуюць ажно 82 (!) віды вяргіняў, якія яна сама ж і вывела. Выводзіць новыя гатункі — гэта яе хобі, невычэрпная любоў да кветак праз усё жыццё і захапленне, перанятае ад маці.*

— Калі мы з сёстрамі збіраемся ў мамы, мы толькі пра кветкі і гаворым, — кажа Настасся, зразаючы вялікі букет вяргіняў унуку Паўлу (на фотаздымку), — нават сын падзяляе маю кветкавую хваробу, не кажучы пра дачку...

Настасся Уладзіміраўна — колішняя настаўніца пачатковых класаў, на пенсіі. Яна любіць выпякаць пірагі з кветкавымі ўпрыгажэннямі, вышывае кветкі, удзельнічае ў кветкавых выстаўках і верыць у цуды.

— Бывае, падумаю, чаму ў мяне малавата жоўтых кветак, — прыводзіць прыклад кветкавод-аматар, — на наступны год з'яўляюцца жоўтыя. І дастаткова мне падумаць, што няма кветак іншага колеру, як у наступны сезон яны абавязкова з'яўляюцца. Містыка нейкая.

Цяпер між шарашоўцамі ідзе сапраўднае, хоць і негалоснае, спаборніцтва на прыгажэйшы і квятнейшы двор. Але ўзнагароды ад гарсавета ў выглядзе грамат заслужана атрымлівае аўтарка новых гатункаў вяргіняў Настасся Аляхновіч.

Выбары-2008

АДЛІК ПАЧАЎСЯ

Колькі ж грамадзян наведала выбарчыя ўчасткі ў першы дзень датэрміновага галасавання? Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» сакратар ЦВК Мікалай Лазавік, 23 верасня па ўсёй краіне прагаласавала 2,7 працэнта выбаршчыкаў. У Віцебскай і Гомельскай абласцях з выбарам свайго прадстаўніка ў парламент вызначыліся 3,1 працэнта выбаршчыкаў (ад агульнай колькасці электарату ў адпаведнасці са складзенымі спісамі), крыху менш выбаршчыкаў наведалі ўчасткі ў сталіцы — 3 працэнты, на Магілёўшчыне датэрмінова прагаласавала 2,6 працэнта грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам, 2,5 працэнта галасоў ужо аддадзеныя жыхарамі Гродзенскай вобласці, у прысталічным рэгіёне свой унёсак у фарміраванне беларускага парламента зрабілі 2,3 працэнта грамадзян, а на Брэстчыне сваім правам прагаласаваць датэрмінова скарысталіся 2,2 працэнта выбаршчыкаў. Сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў заўважыў таксама, што чым бліжэй да канца датэрміновага галасавання, тым больш з'яўляецца ахвотнікаў. «Проста зараз выбаршчык яшчэ асабліва не задумваецца аб планах на выхадныя», — патлумачыў Мікалай Лазавік. Ён таксама нагадаў, што ў перадвыбарнай гонцы на сёння ўдзельнічаюць 265 прэтэндэнтаў на дэпутацкія крэслы. Такім чынам, можна казаць аб больш чым дзесяці знятых кандыдатурах. «Бюлетэні перадрукоўвацца не будуць, — запэўніў сакратар Цэнтрвыбаркама. — У іх проста з'явіцца адзнака аб тым, што той ці іншы кандыдат выбыў».

Ала МАЧАЛАВА.

Большасць выбаршчыкаў галасуюць датэрмінова па бытавых прычынах

Аб гэтым выканаўчы сакратар СНД Сяргей Лебедзеў заявіў у Мінску ў час сустрэчы са старшынёй Цэнтрвыбаркама Беларусі Лідзіяй Ярмошынай. «Многія з удзельнікаў датэрміновага галасавання, з якімі размаўлялі наглядальнікі з СНД, хочуць у дзень галасавання, нядзелю, папрацаваць на дачы, выкапаць бульбу», — растлумачыў Сяргей Лебедзеў. «Ніхто не прымушае выбаршчыкаў галасаваць датэрмінова», — дадаў ён, удакладніўшы, што наглядальнікі ад СНД задавалі гэта пытанне выбаршчыкам непасрэдна.

БЕЛТА.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

Ідзе падпіска на IV квартал 2008 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	*на 1 месяц*	*на 3 месяцы*
63850 (індывідуальны)	**9200**	**27600**
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**8700**	**26100**
63858 (ведамасны)	**14700**	**44100**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**13400**	**40200**

НОВЫ ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ З ПРАВАМ НА ВЫБАР?

Сярэдняя чаканая працягласць жыцця ў Беларусі павялічылася на два гады. Як паведаміла падчас сустрэчы з журналістамі з нагоды Дня пажылых людзей намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна Каралёва, цяпер у цэлым па краіне гэты паказчык складае 70,3 года, і ў прыватнасці, 64,5 і 76,2 года для мужчын і жанчын адпаведна.

На ўліку — кожны шосты

Тым часам спецыялісты адзначаюць: паступовае павелічэнне сярэдняй працягласці жыцця разам з прыкметным змяншэннем нараджальнасці даюць цалкам лагічны вынік. 14,6 працэнта нашых грамадзян маюць узрост больш за 65 гадоў, прычым гэты паказчык удвая перавышае адзнаку, за якой краіна пачынае лічыцца «старой». Паводле слоў Валянціны Каралёвай, цяпер у Беларусі налічваецца 2,5 млн пенсіянераў, сярод якіх 157 тысяч — цалкам адзінокія і каля 592 тысяч — жывуць асобна ад дзяцей і іншых працаздольных сваякоў. Плюс да таго 55,4 тысячы грамадзян маюць статус ветэрана вайны, 50 тысяч — былых вязняў канцлагераў, а 669 чалавек з'яўляюцца доўгажыхарамі, пры гэтым 14 чалавек маюць больш за 110-гадовы ўзрост.

Так выглядае сітуацыя сёння. Прычым прагнозы адназначныя: колькасць пажылога насельніцтва ў Беларусі будзе ўзрастаць. І, адпаведна, працягне павялічвацца патрэба ў сацыяльнай падтрымцы. Як адзначыла Валянціна Каралёва, стаўка тут будзе рабіцца на дапамогу праз тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання. Цэнтры працуюць ва ўсіх раёнах, а агульная колькасць грамадзян, якія знаходзяцца тут на ўліку, наблізілася да 1,6 млн чалавек — гэта практычна кожны шосты грамадзянін Беларусі.

Ці не найбольш папулярнай дапамогай цэнтраў застаецца надомнае абслугоўванне непрацаздольных пенсіянераў і інвалідаў — сацыяльныя работнікі наведваюць амаль 80 тысяч чалавек. Аднак, заўважаюць у міністэрстве, апошнім часам многія цэнтры прапануюць новыя віды падтрымкі, такія, як кругласутачнае пражыванне пажылых людзей, выкананне заказаў гаспадарчымі брыгадамі, сацыяльнае таксі ці служба сядзелак. Агульная колькасць сядзелак на сёння складае 40 чалавек, пры гэтым кошт іх паслуг у цэнтрах атрымліваецца меншым, чым у прыватнікаў або Чырвоным Крыжы.

Яшчэ адным перспектыўным напрамкам застаецца прадастаўленне адрасная сацыяльнай дапамогі. Пасля павелічэння «планкі даплат», сёлета колькасць яе атрымальнікаў прыкметна ўзрасла, за студзень—чэрвень адрасная падтрымка была прызначана 191 тысячы чалавек і ў тым ліку дзвюм тысячам адзінокіх пажылых людзей. Праўда, падобныя даплаты ўсё ж нельга лічыць галоўнымі — на першым плане былі і застаюцца пенсіі.

Што прынясе кастрычнік?

Паводле слоў Валянціны Каралёвай, суадносіны сярэдняй пенсіі і сярэдняй зарплаты ў краіне складаюць 42 працэнты. Гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў на постсавецкай прасторы, прычым забяспечыць яго ўдаецца дзякуючы рэгулярным перараразлікам. Пасля апошняга павышэння ў жніўні сярэдняя працоўная пенсія па Беларусі склала 394,1 тысячы рублёў. Інакш кажучы, на 110 тысяч больш, чым у жніўні-верасні летась. Прычым з пачатку года тэмп росту пенсій перавысіў тэмп росту інфляцыі на 9,6 працэнта.

Што ж да тэрмінаў наступных перараразлікаў працоўных пенсій, то, зазначыла Валянціна Каралёва, тут усё будзе залежаць ад росту сярэдніх заробкаў. І, у прыватнасці, ад таго, наколькі павысяцца зарплаты пасля кастрычніцкага змянення «бюджэтнай» тарыфнай стаўкі І разраду.

«Пенсійны пірог» з варыянтамі

Адна з актуальных тэмаў зараз — магчымае павышэнне пенсійнага ўзросту. Як зазначыла Валянціна Каралёва, з улікам дэмаграфічнай сітуацыі, павелічэннем колькасці пенсіянераў і скарачэннем насельніцтва ў працаздольным узросце, нічога іншага па сутнасці не застанецца — у адваротным выпадку айчынная пенсійная сістэма можа сутыкнуцца з вялікімі праблемамі. Аднак *пытанне, калі могуць адбыцца змяненні, застаецца без адказу — пакуль ніякіх праектаў на гэты конт няма, няма і канкрэтных прапаноў.*

Разам з тым, на думку Валянціны Каралёвай, у любым выпадку новы пенсійны ўзрост павінен уводзіцца не адразу, а паступова. Да таго ж большасць спецыялістаў схіляецца да думкі, што неабходна захаваць магчымасць афармляць пенсіі мужчынам у 60, а жанчынам — у 55 гадоў. «Хутчэй за ўсё, кожнаму будзе прадастаўлена права выбару: выходзіць на пенсію ў цяперашнім узросце і атрымліваць яе ў меншым памеры, або выходзіць на пенсію пазней і атрымліваць больш, — заўважыла Валянціна Каралёва. — Бо, на жаль, сітуацыя складваецца так, што мець рана і шмат ужо не атрымаецца».

Сяргей ГРЫБ.

Беларусь разлічвае, што гранічны кошт расійскага газу ў 2009 годзе складзе $140 за 1 тыс. куб.м

Цана на расійскі газ для Беларусі павінна быць канкурэнтнай, заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, адказваючы на пытанне расійскіх журналістаў аб тым, якая цана на газ будзе ў 2009 годзе.

«Якая цана будзе на газ? Па якой прададуць. Але гэта перагаворны працэс», — сказаў беларускі прэм'ер. Ён нагадаў, што 6 кастрычніка адбудзецца пасяджэнне саюзнага Саўміна і дадаў, што добра знаёмы з расійскім прэм'ер-міністрам і з глыбокай павагай ставіцца да яго. Сяргей Сідорскі ў чарговы раз падкрэсліў, што «ў Саюзнай дзяржаве трэба мець агульны рынак». У снежні 2006 года бакі падпісалі дагавор, дзе вызначана формула разліку цаны на газ. На 2009 год там стаяла прыкладная лічба $140 за 1 тыс. куб.м. «Я думаю, яна будзе гранічнай. Мы падлічвалі, што цана на расійскі газ для Беларусі будзе прыкладна $129—140, не вышэйшая. Але гэта пытанне перагавораў», — адзначыў прэм'-ер-міністр.

БЕЛТА.

«ВЫПІСВАЮ «ЗВЯЗДУ», КАБ ВЕДАЦЬ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ»

Адзін, два, тры, чатыры, пяць... адлічвалі мы ўручаныя па выніках падпіскі на III квартал і II паўгоддзе тэлевізары «Віцязь». Так што ў кожнай вобласці і сталіцы цяпер будзе ісці на адзін «звяздоўскі» тэлевізар больш. Супрацоўнікі пошты, якія звычайна былі на цырыманіях уручэння нашымі прыемны-

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Алена МАРКЕВІЧ і Святлана ТАРАСЁНАК уручаюць «звяздоўскі» «Віцязь» Івану ГАРАЛЬЧУКУ.

даным прыхільнікі нашай газеты.

З нашым сталічным шчасліўчыкам Іванам Гаральчуком мы сустрэліся ў 92-м аддзяленні паштовай сувязі г. Мінска ў аўторак. І не проста сустрэліся, а наладзілі ўрачыстае, з шарыкамі і каляндарыкамі, уручэнне чарговага, шостага па ліку тэлевізара. Наведвальнікі пошты, якія ў асноўным ажыццяўлялі фінансавыя аперацыі, з недаверам назіралі за працэсам: дастаўкай і распакоўкай тэлевізара, перадачай дакументаў уладальніку, фотасесіяй. Толькі шчырыя вясёлыя словы начальніцы аддзялення Алены Маркевіч: «Выпісвайце «Звязду» і таксама зможаце выйграць тэлевізар» унеслі яснасць і разрадзілі напружаную абстаноўку.

Алена Міхайлаўна ўжо 12 гадоў ўзначальвае 92-і АПС, а аператар сувязі па дастаўцы Святлана Тарасёнак, якая таксама брала актыўны ўдзел у нашым маленькім свяце, працуе тут усе 19... і за ўсе гэтыя гады не было ніводнага выпадку выйгрышу буйнога прыза на паштовым аддзяленні. Так што жанчыны шчыра радаваліся ўдачы свайго падпісчыка.

Што ж датычыцца самога Івана Іванавіча, то ён сказаў нам па сакрэту, што загадаў сабе тэлевізар у якасці прыза, калі запаўняў картку ўдзельніка:

— Якраз нам тэлевізар у кватэру вельмі спатрэбіўся. Бо стары мы сыну-студэнту ў пакой аддалі.

Вось як, аказваецца, трэба хацець і верыць і быць упэўненым ва ўдачы, каб жаданні спаўняліся.

— А «Звязду» я выпісваю ўжо гадоў 12, — расказаў нам Іван Гаральчук, — удзельнічаў на старонках газеты ў палемічных абмеркаваннях беларускамоўнага навучання. Мне вельмі падабаецца неабыякавае стаўленне рэдакцыі да вострых сацыяльных пытанняў і яе аб'ектыўны погляд. Выпісваю газету, яшчэ і каб беларускую мову ведаць, бо, на жаль, пачуць яе можна ўсё радзей і радзей.

Дарэчы, пляменніка свайго з газетай вашай пазнаёміў. А ён цяпер актыўна ўдзельнічае ў вашым конкурсе апавяданняў і нават другое месца заняў.

— А як пляменніка завуць?

— Генадзь Мішчук, жыве на Брэстчыне, прапаршчык МНС, піша вершы, апавяданні, ім уся наша сям'я ганарыцца. Ён вельмі любіць і паважае «Звязду», а я радуюся, што стаў пасрэднікам у такім шчырым сяброўстве.

Таццяна ЛЯЎКОВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПРАДУКТЫ ХАРЧАВАННЯ Ў РАСІІ ДАРАЖЭЮЦЬ У ЧАТЫРЫ РАЗЫ ХУТЧЭЙ, ЧЫМ У ЕЎРОПЕ



Асноўныя прадукты харчавання — хлеб, мяса, алей, цукар, рыба і гародніна — падаражэлі ў Расіі з пачатку года ў 4 разы больш, чым у Еўрасаюзе. Такую непрыемную статыстыку коштаў на прадукты харчавання апублікаваў Расійскі статыстычны камітэт.

Эксперты тлумачаць анамальную харчовую інфляцыю адсутнасцю канкурэнцыі на рынку, а таксама пратэкцыянісцкай абаронай уласных вытворцаў, чые цэны часта перавышаюць сусветны ўзровень. Прадукты харчавання ў Расіі падаражэлі са снежня 2007 года па жнівень гэтага ў сярэднім на 12,2 працэнта. У той жа час у 27 краінах Еўрасаюза аналагічны паказчык склаў усяго 3 працэнты. Чатырохразовая розніца ў тэмпах росту цэнаў на прадукты прасочваецца амаль па ўсіх групах тавараў. Так, цэны на хлебабулачныя вырабы і крупы падняліся ў Расіі на 21,6 працэнта, а ў Еўропе — толькі на 5,5.

Па даных сацыёлагаў, дзве трэці жыхароў Расіі адзначаюць, што менавіта хлеб даражэе хутчэй за ўсё, і гэта сур'ёзна адбіваецца на кашальках.

АНДРОННЫ КАЛАЙДАР ВЫКЛІКАЎ НЯПРАВІЛЬНЫ «ВЯЛІКІ ВЫБУХ». І ЗЛАМАЎСЯ

У мінулую пятніцу Вялікі андронны калайдар (ВАК) выклікаў няправільны «вялікі выбух». Гэта настолькі сур'ёзная памылка, што Еўрапейская арганізацыя ядзерных даследаванняў (CERN) была вымушана аб'явіць аб прыпыненні работы калайдара для таго, каб правесці рамонт.

Усталяваная ў паскаральніку сістэма магнітаў, якая ў выніку разгоніць пратоны да 99,99 працэнта хуткасці святла, астуджаецца да тэмпературы ў 1,9 Кельвіна, дзякуючы чаму ток ідзе па іх катушках без супраціўлення. Гэтая звышправаднасць дазваляе магнітам ствараць значна мацнейшыя палі, чым звычайна. Аднак, калі магніты награваюцца і губляюць свае звышправодныя ўласцівасці, адбываецца перагрэў. У часопісе назіранняў навукоўцаў інцыдэнт, які адбыўся, быў названы «моцным перагрэвам». Папярэдняе расследаванне паказала, што з-за дэфектнай электраправодкі паміж двума звышправоднымі магнітамі з астуджальнай сістэмы ВАКа адбылася буйная ўцечка гелію — цэлая тона рэчыва. Некаторыя магніты нагрэліся да 100 градусаў Кельвіна. На месца была выклікана пажарная брыгада.

Вызначаных у адпаведнасці з планам на гэты тыдзень выпрабавальных сутыкненняў часціц не будзе, бо эксперыменты, хутчэй за ўсё, будуць адноўленыя ў канцы сакавіка або ў пачатку красавіка будучага года.

Аднак Роберт Эймар, генеральны дырэктар CERN, не сумняваецца, што ім удасца пераадолець гэтую няўдачу. Вучоныя ўжо аб'явілі, што запланаваную на 21 кастрычніка цырымонію афіцыйнага адкрыцця паскаральніка не адменяць.

ДЗВЕ ТРЭЦІ ЎКРАІНЦАЎ ПА-РАНЕЙШАМУ НЕ ХОЧУЦЬ У НАТА

Большасць грамадзян Украіны па-ранейшаму негатыўна ставяцца да ўступлення сваёй краіны ў НАТА, сведчаць даныя сацапытання, праведзенага Цэнтрам сацыяльных даследаванняў «Сафія» ў верасні. Апытанне таксама паказала, што нядаўні канфлікт на Каўказе практычна не паўплываў на стаўленне грамадзян Украіны да Расіі.

Па даных даследавання, калі б рэферэндум па пытанні ўступлення Украіны ў НАТА праводзіўся зараз, то дзве трэці (61,2 працэнта) апытаных прагаласавалі б супраць уступлення ў альянс.

У маі 2008 года гэты паказчык быў амаль ідэнтычным — 61 працэнт. Колькасць прыхільнікаў уступлення ў НАТА ў параўнанні з маем гэтага года неістотна ўзрасла: з 21,4 працэнта да 23,7.

СЕРБІЯ НЕ БУДЗЕ ПРЫЗНАВАЦЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ АБХАЗІІ І ПАЎДНЁВАЙ АСЕЦІІ

Аб гэтым заявіў міністр замежных спраў Сербіі Вук Ярэміч у інтэрв'ю аўстрыйскім СМІ.

Кіраўнік сербскага знешнепалітычнага ведамства адзначыў, што Сербія рада, што атрымала падтрымку Масквы па пытанні Косава, аднак Бялград не падзяляе палітыкі Расіі ў пытанні Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, перадае Reuters.

Падобная заява сербскага ўрада было цалкам чаканай. Бялград настойваў на тым, што любыя сепаратысцкія рухі з'яўляюцца парушэннем міжнароднага права. У той жа час Расія лічыць, што Косава і Абхазія — цалкам розныя праблемы, якія не маюць паміж сабой амаль нічога агульнага.

Нагадаем, Косава абвясціла аб сваёй незалежнасці 17 лютага гэтага года. Яе прызналі каля 40 дзяржаў, у тым ліку ЗША, Вялікабрытанія, Францыя, Германія. 9 красавіка 2008 г. парламент Косава прыняў канстытуцыю, якая ўступіла ў сілу 15 чэрвеня.

Афіцыйны Бялград працягвае лічыць Косава сербскай правінцыяй, з сусветных дзяржаў гэты пункт гледжання падтрымліваюць Расія і Кітай.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.09.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 111,00
1 еўра	3 098,00
1 латвійскі лат	4 376,04
1 літоўскі літ	897,19
1 чэшская крона	128,03
1 польскі злоты	936,77
1 расійскі рубель	84,20
1 украінская грыўня	416,17

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,0703
10 UAH	49,7673
1000 BYR	11,8704
EUR	36,7957

Курс у гандлёвых кампаніях (на 24.09.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Убралі трэць бульбы

У сельгасарганізацыях Беларусі бульба ўбрана з 15 тыс. га, што складае 31 працэнт да ўборачнай плошчы, паведамілі БЕЛТА ў галоўным упраўленні раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Сярэдняя ўраджайнасць бульбы складае 211 ц/га, што на 21 ц больш, чым у мінулым годзе.

БЕЛИНВЕСТБАНК

СООБЩАЕТ

7 октября 2008 года в помещении Центрального банка по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 29, в 15.00 проводится внеочередное общее собрание акционеров банка в заочной форме.

В повестку дня собрания внесены следующие вопросы:

1. О процедурных вопросах
2. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи

Лица, имеющие право на участие в собрании (владельцы простых (обыкновенных) акций ОАО «Белинвестбанк»), желающие принять в нем участие, могут обратиться за получением под роспись бюллетеней для голосования и иной информацией по месту нахождения банка (филиала, отделения) до 3 октября 2008 года включительно в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 17.00.

Адреса филиалов банка и телефоны для справок:

г. Брест, ул. Советская, 50, тел./факс (8-0162) 23-08-36;
г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, тел./факс (8-0212) 29-75-46;
г. Гомель, ул. Советская, 7, тел./факс (8-0232) 74-11-45;
г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, тел./факс (8-0152) 77-06-56;
г. Минск, пр. Машерова, 29, тел. (8-017) 290-22-95, 239-01-42;
г. Минск, ул. Коллекторная, 11, тел./факс (8-017) 217-30-66;
г. Минск, ул. Мельникайте, 2, тел./факс (8-017) 226-79-45;
г. Могилев, ул. Первомайская, 29-а, тел./факс (8-0222) 22-03-35.

Заполненные бюллетени для голосования предоставляются Центральному банку по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 29, либо филиалам по вышеуказанным адресам до 3 октября 2008 года включительно.

Правление ОАО «Белинвестбанк»

www.belinvestbank.by

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк». УНП 807000028. Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 3 от 27.10.2006 г.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Слуцком райисполкоме

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства *административного здания, об. пл. 285,8 кв.м*, расположенного по адресу: г. Слуцк, ул. М. Богдановича, д. 57 а. Начальная цена – 183 000 000 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты проведения торгов. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **28.10.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.10.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

«Паляпшэнне бізнэс-клімату ў Рэспубліцы Беларусь»

Для забеспячэння прамой, аператыўна-інфармацыйнай сувязі паміж прадстаўнікамі бізнэсу і дзяржавы ў сетцы інтэрнэт створана рубрыка «Паляпшэнне бізнэс-клімату ў Рэпубліцы Беларусь». Размешчана яна на афіцыйным сайце Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў па адрасе center.gov.by.

Рубрыка павінна забяспечыць атрыманне прапаноў ад суб'ектаў гаспадарання аб неабходнасці ўдасканальвання заканадаўства, аб праблемах узаемадзеяння з дзяржорганамі, якія маюцца.

Яе з'яўленне абумоўлена маштабнай работай, якая праводзіцца ў краіне па паляпшэнні бізнэс-клімату і стварэнні спрыяльных умоў для ажыццяўлення прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай дзейнасці, дэбюракратызацыі адміністрацыйных працэдур, павышэнні інвестыцыйнай прыцягальнасці краіны.

На галоўнай старонцы рубрыкі размешчана форма, якая дазволіць пакінуць паведамленне з канкрэтнымі прапановамі. Яе наведвальнікі змогуць таксама азнаёміцца з інфармацыяй аб адміністрацыйных працэдурах, якія ажыццяўляюцца ў адносінах да юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, адпаведным заканадаўстве і дзяржаўных органах, якія выконваюць такія працэдуры, з магчымасцю пераходу на сайты гэтых органаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Пракуратура «адшукала» 100 пустых кватэр

Большасць жыхароў нашай краіны вырашае свае жыллёвыя праблемы самастойна, але ёсць пэўная катэгорыя сацыяльна неабароненых грамадзян, якія маюць права атрымліваць дзяржаўнае жыллё. Такое жыллё ў краіне будуецца, кватэры такога статусу ў гарадах існуюць, але чыноўнікі часам «забываюць» іх своечасова размяркоўваць...

Генеральнай пракуратурай былі праведзены кантрольныя праверкі ў выканаўчых камітэтах гарадоў наконт таго, як выконваюцца патрабаванні жыллёвага заканадаўства, паведаміў журналістам **намеснік начальніка аддзела Генеральнай пракуратуры па наглядзе за захаваннем правоў і свабод грамадзян Павел РАДЗІВОНАЎ.**

У выніку прынятых органамі пракуратуры мераў, ва ўсіх населеных пунктах мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі была праведзена суцэльная інвентарызацыя пустых жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду. Пасля праверак было выяўлена больш за 100 кватэр, якія неабгрунтавана пуставалі даволі працяглы час (год і болей) і не размяркоўваліся. Толькі пасля ўмяшання пракуратуры пустое жыллё атрымала гаспадароў з уліку тых, хто меў на яго права.

Напрыклад, каля паўсотні кватэр у горадзе Бабруйску ў адпаведнасці з патрабаваннем пракурора былі выдзелены дзецям-сіротам і інвалідам. Менавіта гэта катэгорыя грамадзян даволі працяглы час не магла скарыстацца правам на атрыманне сацыяльнага жылля. Суразмоўца падкрэсліў, што гэтыя пустыя кватэры ўвесь час заставаліся на балансе гарадскіх службаў. З вінаватых асобаў па гэтай справе будзе спагнана 26 мільёнаў рублёў, якія былі патрачаны на ўтрыманне неразмеркаваных кватэр.

Былі выяўлены сур'ёзныя парушэнні ў дзейнасці Бабруйскага гарадскога выканаўчага камітэта. Генеральнай пракуратурай у верасні была ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да аднаго з былых службовых асобаў Бабруйскага гарвыканкама, якому інкрымінуецца злоўжыванне ўладай і службовымі паўнамоцтвамі пры размеркаванні кватэр і ўмяшанне ў дзейнасць жыллёва-будаўнічага кааператыва. У адпаведнасці з патрабаваннем пракуратуры асобным грамадзянам неабходна будзе пералічыць стаўкі па крэдытах, якія былі атрыманы для набыцця жылля ў ільготным рэжыме.

З сур'ёзнымі парушэннямі без правядзення аўкцыёну мясцовы чыноўнік выдзеліў камерцыйнай арганізацыі вялікі зямельны ўчастак плошчай 1,5 гектара ў прэстыжным раёне Бабруйска для будаўніцтва гандлёва-забаўляльнага цэнтра. Гэты ліквідны ўчастак гарадской зямлі дастаўся камерцыйнай фірме амаль бясплатна. Сёння, у адпаведнасці з патрабаваннем пракуратуры, рашэнне аб выдзяленні гэтага ўчастка адменена, а зямельны надзел цяпер выстаўлены на аўкцыён. Трэба заўважыць, што па інфармацыі Паўла Радзівонава, рынкавы кошт гэтай зямельнай нерухомасці складае прыкладна мільён долараў.

Спецыялісты пракуратуры паведаміў, што ў Бабруйску былі ўскрыты парушэнні па выкарыстанні камунальнай уласнасці. Так адно мясцовае прадпрыемства, якое займаецца ігральным бізнэсам істотна заніжала плацяжы па арэндной плаце ў гарадскі бюджэт. Сёння гэтыя парушэнні ўжо выпраўлены. У адносінах да кіраўніка гэтага казіно ўзбуджана крымінальная справа за сакрыццё ад уплаты падаткаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Замежныя турысты за 7 месяцаў папоўнілі беларускую казну на $58,3 млн

Аб гэтым паведаміў дырэктар дэпартамента па турызму Міністэрства спорту і турызму Беларусі Віктар Янкавенка.

У гэтым годзе захоўваецца тэндэнцыя павышэння тэмпу росту экспарту турыстычных паслуг — за сем месяцаў гэтага года ён склаў 191,3 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года, турыстычных паслуг аказана на Br171 млрд.

У мінулым годзе аб'ём паслуг, аказаных турыстычнымі арганізацыямі, у паўтара раза перасягнуў аб'ём паслуг гасцініц. Гасцінічная гаспадарка існуе ў краіне ўжо шмат гадоў, і калі даходы турарганізацый перасягаюць даходы месцаў размяшчэння, якіх у нас больш як 300, то можна гаварыць аб тым, што галіна адбылася.

Яшчэ тры гады таму ў Беларусі ўдзельная вага паслуг, аказаных турфірмамі (без уліку грошай, пакінутых у гасцініцах і рэстаранах), складала 0,5 працэнта. «Відаць, дзякуючы таму, што людзі сталі больш зарабляць, больш аб'ектаў паказу адрамантавана, больш пабудавана спартыўных аб'ектаў, сёння паказчык складае ўжо 2 працэнты», — адзначыў дырэктар дэпартамента.

БЕЛТА.

Слухаць, каб разумець

Мсціслаў — гэта горад, дзе ў апошнія некалькі гадоў сталі ўшаноўваць выдатных беларускіх кампазітараў шэрагам канцэртаў, сэнс якіх можна вызначыць так: «Славутыя імёны Беларусі». Сёлета праграма пад такой назвай будзе прысвечана творчасці Генрыха Вагнера.

— Гэта постаць адметная ў беларускім мастацтве, — гаворыць мастацкі кіраўнік фестывалю ў Мсціслаўі Міхаіл Фінберг. — У яго творах адчуваецца дасканалае валоданне еўрапейскай музычнай тэхнікай. Гэта невыпадкова: ураджэнец Польшчы, ён належыць да тых майстроў, для каго Беларусь стала другой радзімай.

У 1939 годзе, калі ў Польшчы пачалася Другая сусветная вайна, Вагнер знайшоў паратунак, эміграваўшы ў Беларусь. Але жыццё вымусіла яго стаць не толькі грамадзянінам нашай краіны, але і беларускім кампазітарам. Ён тут працягваў вучобу як піяніст і як кампазітар. Але адчуў асабівасць сваёй новай Айчыны — праз беларускі фальклор і багатую гісторыю, якая яго натхняла на стварэнне музыкі. Напрыклад, яго таленту належыць опера «Воўчая зграя» паводле сюжэту Васіля Быкава.

Урокі гісторыі паводле Вагнера можна будзе засвоіць падчас фестывалю, які працягнецца 26 і 27 верасня. Падчас праграм, якія падрыхтаваныя Нацыянальным канцэртным аркестрам Беларусі, заўсёды можна не толькі паслухаць музыку, але даведацца ад музыказнаўцы Вольгі Дадзіёмавай пра тое, якім было творчае жыццё нашай краіны. Акрамя таго, майстар-клас для маладых музыкантаў правядзе прафесар Барыс Нічкоў, які кіруе вядомым ансамблем салістаў на драўляных духавых інструментах.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЛАРУСЬ ЯК ЦЭНТР ЕЎРОПЫ ВЫКОНВАЕ ВАЖНЕЙШЫЯ ФУНКЦЫІ НА КАРЫСЦЬ УСЯГО ЕЎРАПЕЙСКАГА РЭГІЁНУ»

Аб гэтым заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю заходнееўрапейскім СМІ.

«Так склалася, па волі Бога. Хацелі вы гэтага ў Вялікабрытаніі, у Германіі, у Францыі або не, але мы як цэнтр Еўропы павінны працаваць і на вас. Не стварацъ, прынамсі, вам праблем», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб тым, што Беларусь паспяхова змагаецца з патокамі наркотыкаў, кантрабанды і нелегальных мігрантаў, якія накіроўваюцца ў Еўропу. «Сёння практычна ні адзін чалавек праз нашу граніцу ў Еўрасаюз не праходзіць. Мы на граніцы некалькі разоў (такія эпізоды не былі адзінкавымі ў мінулым годзе) затрымлівалі ядзерныя кампаненты», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Вазьміце НАТА — вам трэба перакідваць грузы ў Афганістан. Мы што, вам праблемы ў гэтым ствараем? Ды не, ніколі. Што, прэм'-ер-міністр або канцлер Германіі, накіроўваючыся ў Маскву, мелі якія-небудзь праблемы, пралятаючы над Беларуссю?» — задаў рытарычнае пытанне беларускі лідар. Ён таксама нагадаў, што трэць прыроднага газу і амаль палова нафты, якія паставляюцца з Усходу на Захад, праходзяць праз Беларусь.

«Мы нешта дрэнна зрабілі па гэтых напрамках для Еўропы? Узнікае пытанне, навошта вам перарабляць Беларусь пад Вялікабрытанію або ж пад Германію ці Францыю, — сказаў Прэзідэнт. — Калі, дапусцім, Вялікабрытанія хоча, каб Беларусь была падобная на Вялікабрытанію, а Германія хоча, каб мы былі падобныя на Германію, я гэта разумею. Больш таго, я ўспрымаў бы гэта. Але Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі і іншым трэба мець на ўвазе, што, нягледзячы на тое, што мы з вамі жывём у Еўропе, у нас ёсць пэўныя адрозненні, і ў нас у пэўны перыяд гістарычнага развіцця ёсць пэўныя складанасці і цяжкасці». Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, гэта абумоўлена, перш за ўсё, тым, што мы былі часткай вялікай імперыі, вялікай краіны — Савецкага Саюза. «І ў нас адбылося не раздзяленне Савецкага Саюза, а развал Савецкага Саюза — аднамомантны. І гэта адбылося на фоне вельмі вострага эканамічнага стану тады Савецкага Саюза», — нагадаў ён.

Прэзідэнт сказаў, што ў тыя гады, калі ён прыйшоў да ўлады, галоўным было — выратаваць краіну, уберагчы народ ад катастрофы. «І тады, зразумела, для таго, каб выратаваць эканоміку, людзей, дзяржаву, стварыць дзяржаву (а пытанне стаяла аб стварэнні незалежнай дзяржавы), натуральна, патрэбны былі і воля, і жорсткая ўлада», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

«І заўсёды так у гісторыі было: і ў Вялікабрытаніі, і ў Германіі, і ў Францыі. Вазьміце дэ Голя. Для таго, каб выратаваць тады Францыю, даводзілася звяртацца да вельмі жорсткіх мераў, асабліва ў эканоміцы. Чаму такі варыянт быў бы немагчымы ў Беларусі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Нам удалося вырашыць галоўную задачу — стварыць свабодную незалежную дзяржаву, вызначыўшы яе граніцы, што таксама было вельмі няпроста». Прэзідэнт таксама адзначыў, што ў Беларусі ўдалося захаваць высокатэхналагічную эканоміку, павялічыць у два з паловай разы ВУП у параўнанні з тым, што было ў СССР, не дапусціць рознага роду сутыкненняў і катастроф ні на рэлігійнай, ні на нацыянальнай глебе.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Можа, мы і прыйдзем да таго, чаго дасягнулі вы. У дзяржаўным ладзе, у эканоміцы, у сацыяльным жыцці. Што датычыцца сацыяльнага жыцця, абароненасці людзей, мы ў вас, і асабліва ў Германіі, шмат чаго бяром. Мы вучымся ў вас гэтаму. Асабліва цяпер. Перабудоўваючы ахову здароўя, мы перасягнём Германію ўжо праз два гады па выніках». Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусі патрэбен час, каб прайсці пэўныя этапы і пераканацца, ці прыдатныя ёй тыя або іншыя варыянты дзяржаўнага ладу або сацыяльнага жыцця. «Але вы не павінны нас падганяць і штурхаць у спіну», — рэзюмаваў ён.

У Беларусі створаны адны з лепшых у Еўропе ўмовы для прыцягнення інвестараў.

«У нас для інвестараў лепшае заканадаўства, чым у Англіі, Амерыцы і Германіі», — сказаў беларускі лідар.

«Мы гаворым усяму свету: «Мы не супраць, каб інвестары з Англіі, Германіі, Францыі, Расіі, Амерыкі прыйшлі да нас». І мы іх вітаем. Мы ўвесь час на працягу апошніх 5—7 гадоў удасканальвалі і спрашчалі наша заканадаўства, каб інвестараў прыцягнуць. І мы яго стварылі», — прадоўжыў ён.

Пры гэтым Прэзідэнт адзначыў, што, прыцягваючы інвестараў, беларуская дзяржава не мае намеру бясплатна раздаваць ім аб'екты сваёй эканомікі.

«Хто будзе адмаўляць, што англічане і немцы жывуць значна лепш, чым беларусы. У сувязі з гэтым, чаму мы забясплатна павінны вам аддаваць нашы прадпрыемствы? Вы багатыя. Заплаціце нам, каб і наш народ жыў лепш. У будучыні і вы не будзеце мець ніякіх прэтэнзій з боку нашага народа, не будзе ніякіх канфліктаў. Народ наш будзе вас паважаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь вырашыць пытанне аб прызнанні Абхазіі і Паўднёвай Асеціі выходзячы з уласных інтарэсаў.

«Калі хто-небудзь думае, што прызнанне Беларуссю Абхазіі і Паўднёвай Асеціі — пытанне падтрымкі Расіі і толькі, той памыляецца, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Гэта, зразумела ж, ускосна падтрымка Расіі. І мы як саюзнікі аб гэтым помнім. Але гэта перш за ўсё нашы адносіны — Беларусі, Абхазіі і Паўднёвай Асеціі». Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што Беларусь вельмі даўно супрацоўнічае і з гэтымі рэспублікамі, і з гэтымі народамі, і з іх кіраўнікамі. «Па эканамічных пытаннях у нас вельмі цесныя адносіны, асабліва з Абхазіяй. Таму ў асноўным гэта наша асабістае пытанне, калі можна так выказацца», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт нагадаў, што працэс узнікнення дзвюх новых каўказскіх дзяржаў адбыўся ў выніку доўгага процістаяння, якое завяршылася вайной. «Гэты канфлікт выклікаў вельмі вострыя дыскусіі ў свеце. Ён прывёў да сутыкнення інтарэсаў. У гэтым працэсе многае неадназначна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Але паколькі пытанне стаіць вельмі востра, як я сказаў, і яно прывяло да сутыкнення, амаль да халоднай вайны, я не хацеў бы гэта рабіць у спешцы і аднаасобна», — адзначыў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы выказаў жаданне, каб «нават не гэты Парламент, які так не падабаецца на Захадзе, на Усходзе або дзе-небудзь яшчэ, а новы Парламент выказаў сваю думку».

«І наогул, куды спяшацца? Каму гэта спешка патрэбна? Пройдзе пэўны час, і мы, абмеркаваўшы гэта пытанне, прымем адпаведнае рашэнне», — заявіў беларускі лідар.

Пры гэтым ён нагадаў, што прэцэдэнт прызнання самаабвешчаных дзяржаўных утварэнняў быў створаны зусім не Расіяй, а заходнімі дзяржавамі пасля таго, як яны прызналі незалежнасць Косава. «Калі не было б Косава, гэта я вам гавару дакладна, не было б, мабыць, і Абхазіі, і Асеціі. І я думаю, што Расіі цяжка было б ісці на прызнанне Абхазіі і Асеціі», — перакананы Прэзідэнт Беларусі.

«Я ведаю Сербію добра. Я там не адзін раз бываў. Я ведаю гісторыю і настроі людзей Сербіі. Бо Сербія пайшла з Косава. Там святыні сербскія. А вы ўзялі і раздзялілі не толькі Югаславію, але і Сербію, адарваўшы калыску гэтага народа ад яе. Вы стварылі жудасны прэцэдэнт», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў: «Мы не баімся ніякага сепаратызму, у нас ёсць адносіны з гэтымі рэспублікамі даўнія, асабліва з Абхазіяй. І не забывайце, мы ж саюзнік Расіі. Там, дзе гэта магчыма, патрэбна і не супярэчыць нашым інтарэсам, мы павінны дзейнічаць як саюзнікі, пагадзіцеся». Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што і краіны ЕС не ўсе былі аднадушныя па косаўскім пытанні, але паступілі, як саюзнікі, як адзінае цэлае. «І вы вельмі згуртаваныя ў гэтых адносінах. Нягледзячы на тое, што і ў Францыі, і ў Бельгіі, і ў Іспаніі праблемы такія ж ёсць. Але тым не менш, вы пераступілі праз гэтыя праблемы. Таму я не ведаю, у чым вы, заходнееўрапейцы, можаце нас папракнуць у нашай палітыцы па Абхазіі і Асеціі? Ні ў чым», — сказаў беларускі лідар.

«Таму мне здаецца, што пазіцыя Беларусі вельмі спакойная на гэты момант, акуратная і вытрыманая. І я ўдзячны тут еўрапейскім чыноўнікам. Яны нас у гэтым разумеюць», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

Пэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выключае магчымасць ваеннага канфлікту паміж Беларуссю і Расіяй. Аб гэтым ён заявіў, адказваючы на пытанне прадстаўнікоў заходнееўрапейскіх СМІ аб рэакцыі афіцыйнага Мінска на словы прэзідэнта Расіі Дзмітрыя Мядзведзева аб зонах асаблівага інтарэсу Расіі. «Тут, у Мінску, Вы разглядаеце гэта як пагражальны ў адносінах да Вас каментарый, пагражальную рэмарку?», — цікавілася замежныя журналісты.

«Абсалютна не. Зразумейце адну пэўную рэч. Гэта, відаць, ужо ад нашай апазіцыі зыходзіць, якая тут завыла, што «сёння — Грузія, а заўтра — Беларусь». Што, маўляў, заўтра Расія можа гэтак жа разабрацца з Беларуссю, падпарадкаваўшы яе сабе. Абсалютна недарэчная і беспадстаўная думка і заява!», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Не давядзі Бог, Расія, гіпатэтычна дапусцім, захацела б вырашыць такім чынам нейкія праблемы ў Беларусі, вось тады б ужо была поўная падстава ў сусветнай супольнасці і перш за ўсё ў вас, еўрапейцаў, паставіць Расію на месца».

На думку беларускага лідара, Расія гэта цудоўна разумее. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ваенны канфлікт паміж Беларуссю і Расіяй немагчымы ў прынцыпе. «Таму што рускі чалавек, ваенны чалавек, ніколі ствол аўтамата, пісталета, гранатамёта не накіруе ў бок беларуса. Мы настолькі блізкія, народы нашы блізкія адзін аднаму, наколькі немцы блізкія да немцаў. Таму гэта немагчыма. Калі Вы, вядома, намякалі на гэта», — рэзюмаваў Прэзідэнт Беларусі.

Перагаворы па цане на пастаўляемы з Расіі ў Беларусь газ працягваюцца. Аб гэтым паведаміў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанні прадстаўнікоў заходнееўрапейскіх СМІ аб датычацца намеру «Газпрама» ўзняць цэны на газ для Беларусі да ўзроўню Польшчы.

«Мы не памром. І тое, што «Газпрам» сёння заяўляе, дык у нас ідуць яшчэ наконт гэтага перагаворы. І вы павінны добра разумець: калі Расія такім чынам будзе весці палітыку ў адносінах да Беларусі, адпаведным чынам і мы будзем паступаць», — адзначыў беларускі лідар. Пры гэтым ён падкрэсліў, што Беларусь «можа дамовіцца з Расіяй».

Паводле слоў Прэзідэнта, «ёсць шмат рэчаў і напрамкаў, якія сведчаць аб тым, што Беларусь для Расіі — важнейшы фактар, асабліва сёння». «Калі мы атрымліваем у іх вуглевадароды таннейшыя, чым вы ў Германіі, дапусцім, або ў Вялікабрытаніі, то і вялікі экспарт, які ідзе ў Расію, — значна ніжэйшы за сусветныя цэны. Асабліва прадукты харчавання», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што «не ў інтарэсах Расіі, каб наша эканоміка загінула». «Вы ведаеце, што нашы эканомікі вельмі цесна ўзаемазвязаны. І тавараабарот паміж Расіяй і Беларуссю ў канцы гэтага года складзе больш як $30 млрд. Амаль у тры разы больш, чым паміж такімі гігантамі, як Расія і ЗША. Пры гэтым я не гавару аб такіх кампанентах, як палітыка, сацыяльныя і ваенныя пытанні, дзе цана Беларусі для Расіі значная. Пагадзіцеся, можна павысіць на $50—100 цану на газ за тысячу кубаметраў, страціўшы многае з таго, што я сказаў. І пры гэтым не забывайце, што «Газпрам» Польшчы за прапампоўванне па яе тэрыторыі прыроднага газу плаціць на мільярд — паўтара мільярда долараў у год больш, чым нам», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка хацеў бы, каб на беларускай зямлі прайшла сустрэча Папы Рымскага і Патрыярха Маскоўскага.

«Я вельмі хацеў бы, каб у цэнтры Еўропы, на стыку паміж праваслаўем і каталіцызмам, тут, у Беларусі нарэшце прайшла гэта сустрэча паміж Патрыярхам Маскоўскім і Папам», — сказаў ён.

«Калі па нейкіх прычынах гэта немагчыма цяпер, то мы, прытрымліваючыся прынцыпаў гасціннасці, павагі да нашых католікаў (а ў нас іх нямала: у былых постсавецкіх рэспубліках мы займаем другое месца пасля Літвы, і ігнараваць жаданні нашых католікаў мы не маем намеру, гэта частка нашага народа), мы запрасілі гэтага вялікага чалавека (Папу Рымскага Бенедзікта XVI) наведаць нашу Беларусь», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка выказаў шкадаванне наконт таго, што папярэднік дзеючага пантыфіка Іаан Павел II не наведаў Беларусь — «ён вельмі хацеў прыехаць у нашу краіну, ён шчыра любіў Беларусь».

«У нас даўно абвешчаны мною, тады яшчэ маладым Прэзідэнтам, прынцып — кожны павінен знайсці сваю дарогу да храма. Калі ён хоча ісці па гэтай дарозе, то ў нас з аднаго боку праваслаўны храм, праз вуліцу — каталіцкі. Ні папрокаў, ні скосых позіркаў католікаў на праваслаўных, а праваслаўных на католікаў. Ніколі! Ні на нацыянальнай, ні на рэлігійнай глебе ў нас ніколі не было канфліктаў. І не будзе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што галоўная прычына палітычных няўдач, якія церпіць беларуская апазіцыя, у тым, што яна далёкая ад народа.

«Перад вамі сядзіць чалавек, які прыйшоў да ўлады з апазіцыі. Я ж не быў ва ўладзе — я прыйшоў з апазіцыі. І яна не была сістэмнай. Але тым не менш, невялікая група палітыкаў, якая была разам з Лукашэнкам, перамагла. Вы думаеце, нам было лёгка тады? А каму, скажыце, у Германіі або Вялікабрытаніі на выбарах у барацьбе за ўладу лёгка? Гэта вельмі сур'ёзнае процідорства. Нават у такіх старых дэмакратычных дзяржавах. А вы ведаеце, чаму Лукашэнка тады перамог разам са сваімі калегамі? Таму што мы гэтага хацелі. І мы шчыра, сумленна ішлі да народа са сваімі ідэямі. І мы ні ў кога не прасілі грошай: ні ў вас, ні ў Расіі», — сказаў Прэзідэнт.

«І калі ў нас не было магчымасці на аўтамабілі ехаць у які-небудзь рэгіён на сустрэчу з выбаршчыкамі, мы, вобразна кажучы, ішлі пяшком. Мы ехалі на грамадскім транспарце. А цяперашнія апазіцыянеры прывыклі да камфорту. І ў нашай краіне народ гэта ўсё бачыць. Вельмі ж далёкія яны ад народа. І ў гэтым галоўная прычына, чаму яны не могуць дасягнуць сваёй мэты», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Але я яшчэ раз хачу паўтарыць, вы разбярыцеся: хочуць яны гэтай улады або не? Улада — гэта вялікая адказнасць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У Еўропы няма іншых варыянтаў, акрамя адмены візавых абмежаванняў для беларускіх чыноўнікаў.

«Іншых варыянтаў у Еўропы няма. Мне здаецца, што апошнім часам чыноўнікі ў Бруселі, добра гэта разумеючы, пастаянна падаюць нам сігналы аб тым, што пасля парламенцкіх выбараў яны гатовы нармалізаваць з намі адносіны», — сказаў беларускі лідар. «Пажывём — убачым. Мы слухаем, што нам гавораць з Бруселя, улічваем гэта, а галоўны крытэрый ісціны — гэта канкрэтныя факты і справы. Паглядзім, як павядзе сябе Еўропа пасля выбараў», — дадаў ён.

Прэзідэнт адзначыў высокую ступень празрыстасці і дэмакратычнасці выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, з правядзеннем якіх часта звязваюць перспектывы далейшага развіцця адносінаў паміж Беларуссю і краінамі Еўрапейскага саюза. «Выбары ў Беларусі не проста празрыстыя, не проста дэмакратычныя — яны беспрэцэдэнтна дэмакратычныя і празрыстыя. Але толькі вы на гэта паглядзіце аб'ектыўна. І майце на ўвазе, што тая апазіцыя, якую вы на Захадзе падкормліваеце і хочаце падтрымаць у Беларусі, яна па колькасці на ўзроўні арыфметычнай хібнасці», — сказаў беларускі лідар.

«Я вам скажу так: калі вы ўжо гэтыя выбары не прызнаеце ў Беларусі, то тады, відаць, нам і не трэба траціць час на перакананні Еўропы ў тым, што Беларусь — гэта цэнтр Еўропы, гэта Еўропа і вельмі патрэбная дзяржава для Расіі», — сказаў на заканчэнне Аляксандр Лукашэнка.

БЕЛТА.

Тэлевізары застаюцца лідарамі продажу ў сталіцы сярод бытавой тэхнікі

За восем месяцаў гэтага года сталічнымі магазінамі было прададзена 47 418 тэлевізараў. Прычым ільвіную долю тут склалі апараты айчыннай вытворчасці — 92,5 працэнта.

Аб гэтым паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні статыстыкі. Халадзільнікаў і маразільнікаў жыхары і госці сталіцы купілі за ўказаны перыяд удвая менш, чым тэлевізараў, — 23 261. Пры гэтым амаль 70 працэнтаў прададзеных агрэгатаў — беларускай вытворчасці. А вось пральныя машыны карыстаюцца меншым попытам. Магчыма, іх пакупку мінчане па нейкіх прычынах адкладваюць. За студзень—жнівень 2008 года куплена ўсяго 10 553 пральныя машыны, з іх толькі пятая частка выраблена ў нашай краіне.

Калі ж гаварыць у цэлым аб забяспечанасці жыхароў сталіцы матэрыяльнымі дабротамі, то сёння на 100 сем'яў прыпадае 157 тэлевізараў, 105 халадзільнікаў і 80 пральных машын.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».

Сурганава і Арлоўская — самыя брудныя

На гэтых сталічных магістралях утрыманне аксіду вугляроду ў паветры часам у 1,15—1,2 раза вышэй за гранічна дапушчальную разавую канцэнтрацыю.

Як паведаміла загадчыца аддзела ацэнкі рызыкі Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Іна Прасвіракова, у васьмёрку праблемных участкаў, дзе ГДК утрымання шкодных рэчываў у паветры перавышае дапушчальную норму, уваходзяць праспект Ракасоўскага, вуліцы Я. Коласа, Сурганава, Арлоўская, Ляшчынскага, Каржанеўскага, Астрашыцкая і Чыгуначная, а таксама праспект Незалежнасці.

Да слова, адбор проб атмасфернага паветра для даследавання ажыццяўляецца ў 38 кропках горада 2 разы ў месяц.

Уладзімір ЖДАНОВІЧ, «Мінск—Навіны».

Абзац

■ Камерсант з Гомеля затрыманы аператыўнай групай упраўлення КДБ па Гомельскай вобласці за спробу арганізаваць расправу над сваім кампаньёнам. Як высветлілася, дырэктар аднаго з гомельскіх таварыстваў з абмежаванай адказнасцю быў затрыманы ва ўласным офісе пасля таго, як перадаў іншаму гамяльчаніну пісталет «ТТ» і боепрыпасы да яго. Зброя стала перадапластай за нанясенне цялесных пашкоджанняў кампаньёну затрыманага. У выніку маёмаснай спрэчкі камерсант вырашыў дабіцца згаворлівасці метадам запалохвання, для чаго наняў за $600 і пісталет «ТТ» раней судзімага за рабаванне спартсмена. Вядзецца расследаванне.

■ **Група аршанскіх камерсантаў падазраецца ў абнаяўцы праз падстаўныя фірмы буйных грашовых сум. Упраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Віцебскай вобласці ўзбуджана крымінальная справа. Аб'яднаўшыся ў арганізаваную групу, падазроныя зарэгістравалі на падстаўную асобу прыватнае ўнітарнае прадпрыемства і аказвалі суб'ектам гаспадарання паслугі па незаконным пераводзе безнаяўных грашовых сродкаў у наяўныя. Даход групы ад незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці склаў Br8,5 млрд.**

■ Схованку са 100 адзінкамі боепрыпасаў часоў Вялікай Айчыннай вайны выявілі ў Лёзненскім раёне супрацоўнікі праваахоўных органаў. Са схрона даставілі больш за 90 мінамётных мінаў, 10 гранат, якія знаходзіліся ў баявым становішчы. У трацільным эквіваленце арсенал склаў каля 50 кг. Боепрыпасы, хутчэй за ўсё, рыхтаваліся да рэалізацыі. Выбухованебяспечныя знаходкі знішчаныя групай размінавання.

■ **У сталіцы Украіны ўвялі мараторый на высечку дрэў, якім больш за 60 гадоў. Зараз для таго, каб высекчы такое дрэва, патрэбны дазвол мэра Кіева. Такі дазвол можа быць выдадзены толькі ў крайнім выпадку — для сацыяльных патрэбаў горада. Пры гэтым за паслугу трэба выкласці кругленькую суму — да 150 тыс грыўняў. Плаціць давядзецца і за больш маладыя дрэвы: да 20 тыс. грыўняў — за 20-гадовае і да 50 тыс. — за насаджэнні, якім ад 20 да 60 гадоў. Сума залежыць і ад месцазнаходжання дрэва.**

■ У Сочы расследуецца крымінальная справа ў сувязі з забойствам радавога адной з вайсковых часцей. Згодна з данымі следства, 19 верасня 23-гадовы лейтэнант з пісталета Макарава стрэліў ва ўпор у галаву радавога. Апошні памёр на месцы. Следства ўстанаўлівае матывы злачынства.

■ **У Арлоўскай вобласці вадзіцель іншамаркі забіў гаспадара «Жыгулёў», што абагналі яго. Жыхар горада Мцэнска ехаў на сваім аўтамабілі Mercedes па загарадняй трасе. У нейкі момант яго рэзка абагналі «Жыгулі» 9-й мадэлі, стварыўшы пры гэтым памеху для руху. Пакрыўджаны вадзіцель іншамаркі прыціснуў «дзявятку» да абочыны, абодва шафёры выскачылі на дарогу, і ўладальнік Mercedes ударыў у твар гаспадара «Жыгулёў». Пацярпелы ўпаў на праезную частку, пасля чаго атрымаў яшчэ некалькі ўдараў нагамі. Крыўдзіцель з'ехаў з месца здарэння, а пацярпелы памёр у раённай бальніцы.**

Поўны абзац

■ **Нямецкая паліцыя затрымала жанчыну, якую падазраюць у рабаванні банка. Сведкі змаглі апазнаць яе па асаблівасцях целаскладу. Некалькі тыдняў таму жанчына ў масцы, пагражаючы супрацоўнікам банка зброяй, запатрабавала аддаць ёй дзённую выручку. Яна забрала прыкладна 25 тыс. долараў. Сведкі заявілі, што да асаблівых прыкметаў рабавальніцы можна было аднесці «вельмі вялікія ягадзіцы». Праз некаторы час адзін з наведвальнікаў банка ўбачыў у чарзе жанчыну, выгляд ззаду якой якраз падыходзіў да апісання, тым болей, што на час рабавання ён быў у банку. Ён пазваніў у паліцыю і паведаміў пра ўбачанае. Сваю ўпэўненасць у тым, што ягадзіцы жанчыны ў чарзе належаць рабаўніцы, сведка аргументаваў словамі «забыць нешта такіх памераў проста немагчыма!» Паліцыя арыштавала падазроную. Ёй аказалася 26-гадовая Сандра Майзэр. Пры ёй выявілі лыжную маску і зброю. Яна, было відаць па ўсім, меркавала паўтарыць злачынства.**

■ Пакупнікі гандлёвага цэнтра ў невялікім гарадку Санта-Марыя (амерыканскі штат Каліфорнія) некалькі гадзін адседжваліся ў магазіне, ратуючыся ад... пчол. Вялікі рой надзейна заблакаваў выхад з цэнтра і моцна гудзеў. Менеджар, забарыкадаваўшыся ў кабінеце, пачаў выклікаць пажарных і спецкаманду па барацьбе з насякомымі. Пакупнікі схаваліся пад прылаўкі. І толькі рой, не звяртаючы ўвагі на паніку, пачаў узводзіць сабе жыллё над уваходам у магазін. Але спецслужбы, якія прыбылі, не сталі цырымоніцца з насякомымі і хутка перапынілі іх занятак. У выніку пакупнікі набылі свабоду, трое пажарных і прадстаўнік службы кантролю над шкоднікамі былі моцна пакусанымі, а пчолы адправіліся шукаць больш прыдатнае месца для сваёй новай сям'і.

■ **На капот аўтамабіля кітайскага вадзіцеля ў горадзе Чанчунь упала карова. Жывёліна прадавіла капот, пашкодзіла начынне аўто. Вадзіцель не зразумеў, адкуль звалілася карова, аднак відавочцы расказалі, што яна скінулася з платформы грузавіка, што ехаў упарадзе. Паліцэйскія хутка затрымалі вадзіцеля грузавіка. Ён аказаўся злодзеем, які ўкраў трох кароў у мясцовага селяніна. Злодзей вёз кароў на базар з намерам іх прадаць, але без належных навыкаў не змог замацаваць іх на платформе, у выніку чаго адна з жывёлін і звалілася на аўтамабіль.**

■ Да вялікага засмуч

САПРАДНЫ ЦУД У БОЖАЙ ВЁСЦЫ

Штогод жыхары Ляцягаў, што на Слаўгарадчыне, хросным ходам з абразом Божай Маці «Неапалімая купіна» абходзяць сваю вёску, каб абараніць яе ад агню ды ўсіх бедаў. Гэтай традыцыі сёлетняй восенню споўнілася 65 гадоў.

Ахоўны абраз

...Вясковая дарога. Па збочыне няспешна крочаць людзі з крыжамі, абразамі і свечкамі. Святар ва ўрачыстым чорна-залатым адзенні звяртаецца да святых угоднікаў па падтрымку, і бабулі падхопліваюць просьбу.

Гісторыя гэтага хроснага ходу бярэ свой пачатак у 1943 годзе. Ураджэнка Ляцягаў Таццяна Сяргееўна Сазонава, якой цяпер 82 гады, — сведка тых падзей.

— Фронт набліжаўся, і нашы жанчыны захваляваліся: хутка немцы назад пойдуць і, не дай Божа, спаляць вёску, — расказвае бабуля. — Каб уратавацца, аб'ядналіся і замовілі ў Магілёве, дзе яшчэ заставаліся майстры, абраз. Так з'явілася на свет наша Матачка Божая «Неапалімая купіна», якая выратавала нас.

З гэтым абразом жыхары вёскі абышлі родныя Ляцягі па руху сонца.

— І я, падлетак, за бабамі ўслед, — працягвае Сазонава. — Пайшлі па шляху, а ў баку ў некалькі дзесятках метраў стаяла гумно. Вырашылі ўжо не збочваць і не абышлі яго. І калі немцы адступалі, то спалілі толькі гэтае гумно, а ўся вёска засталася!

Бабулі расказваюць, што на золку аднога дня «нібыта ва ўсе трубы трубанулі». Немцы спахапіліся і з'ехалі.

— Тады нам сказалі, што фронт прарвалі, — тлумачыць Таццяна Сяргееўна. — А насамрэч гэта наша Матачка Божая не спачывала, а нас ахоўвала. Нашы перамаглі, а мы засталіся жывыя!

У Ляцягах усё спакойна

Сёння той самы цудатворны абраз захоўваецца ў сям'і Таццяны Сяргееўны. Яна атрымала яго ў спадчыну ад сваякоў разам з грамадскім абавязкам. Ужо дзесяць гадоў жанчына «адпраўляе абраз». Гэта свята: вяскоўцы памоляцца Богу, ушануюць абраз, а потым разам пасядзяць за сталом.

У акрузе Ляцягі ўвогуле маюць рэпутацыю божай вёскі. Тутэйшых вернікаў, паводле ўспамінаў старажылаў, не ганялі нават за Саветамі, а ў вайну — наадварот, «велічалі».

Са старадаўніх часін жыхары старанна адпраўлялі Святых Міколу і Варвару, Спас ды Пакроў. Гэтыя абразы былі «свячнымі», належалі ўсёй вёсцы і пераходзілі з хаты ў хату. Першымі ў чарзе былі тыя, каму была вельмі патрэбна падтрымка па здароўю ці жыццёвай сітуацыі.

Рознае было ў жыцці жыхарак Ляцягаў. Яны ўзгадваюць, як цяклі ручаіны слёз ад страху перад немцамі і як давялося перажыць голад, калі шчаўе было дэфіцытам, а хлеб пяклі з арэшніка. Але ўсё ж вялікія страсенні абышлі Ляцягі бокам.

— Ведаеце, немцаў няма, а мы ўсе ходзім і молімся, ды і недарэмна, — лічыць 80-гадовая Марыя Васільеўна Гарэлікава. — У суседнім паселішчы і ў мірны час хаты гараць: то маланка трапіць, то праводка загарыцца. А ў Ляцягах усё спакойна. Захавай нас, Госпадзі, ад агню, буры і ветру, граду і навальніцы, ды ўсякай іншай бяды!

Царква па-за часам

Старыя абразы ў вясковых акладах, упрыгожаныя штучнымі кветкамі і карункамі з фольгі. Аздабленне — вышыванкі і рушнікі, букеты гладыёлусаў і астраў. Гараць свечкі, пахне ладанам. Дзве жанчыны спяваюць тонкімі галасамі, якія кранаюць. Адчуванне спакою і знаходжання нібыта па-за рэальнасцю.

У вясковай царкве ідзе святочная служба ў гонар абраза Божай Маці «Неапалімая купіна». Вядзе яе айцец Георгій Сакалоў, ураджэнец і знаўца Слаўгарадчыны, кандыдат багаслоўя і любімы бацюшка вясковых прыхаджанак. Бабулі ў яркіх хустках, пуховых кофтах і старадаўніх крымпленавых паліто ўважліва слухаюць і старанна хрысцяцца. Цяпер яны моляцца за ўсіх добрых праваслаўных хрысціянаў, каб «памянуў іх Гасподзь Бог у царствіі сваім».

Свята-Пакроўская царква, якая была пабудавана ў Ляцягах больш за 150 гадоў таму, была разбурана ў гады вайны. Гавораць, яе купалы служылі добрым арыенцірам для абстрэлу, таму савецкія салдаты разабралі будынак, а драўніну выкарысталі для перапраўвы праз раку Проню.

Таму сёння царква ў Ляцягах — гэта звычайная хата на вясковай вуліцы. Праўда, з вельмі незвычайным лёсам: у ёй жылі людзі — на хутары і ў вёсцы, вучыліся школьнікі, тут было праўленне калгаса і, нарэшце, царква.

Сюды трапляюць старыя абразы з усяго навакольля. Старыя людзі паміраюць, а іх дзеці перадаюць сямейныя каштоўнасці ў царкву.

Напрыклад, абраз Архангела Гаўрыіла. Свячны абраз суседняй вёскі Харанеў, які пераходзіў з хаты ў хату, цудам захаваўся у вайну. Жанчына закапала яго на дварэ і з'ехала ў эвакуацыю. Хата згарэла, а абраз шчасліва выкапалі.

Ад усіх напасцяў

Хросны ход у Ляцягах ураджвае сваёй шчырасцю, але не вялікай колькасцю людзей. Як гэта ні сумна, расказала старшыня Гіжэнскага сельсавета Тамара Мельнікава, вёска паступова вымірае: тут жыве толькі каля сотні жыхароў, многія з якіх — пенсіянеры.

— Ах, як мы хадзілі хросным ходам! — на вачах Марыі Васільеўны з'яўляюцца слёзы. — Паток людзей быў вялікі, бо ўсе мы былі крапчэйшыя. Прыгожа ішлі, са старажытнымі абразамі, і на кожным скрыжаванні гаспадары выносілі з хат гасцінцы. Цяпер нашы дзеці параз'ехаліся, маладзейшыя не вельмі хочуць хадзіць. Ну а мы пакуль будзем жыць — будзем соўвацца...

Бабулі пачынаюць хросны ход. У руках вернікаў — «Неапалімая купіна». Абраз адразу пазнаецца: Божая Маці, якая трымае ў руках лесвіцу выратавання, у цэнтры 8-кутнай зоркі. Чырвоны колер сімвалізуе агонь. Зялёны колер — куст: тую самую купіну, якая гарэла ў агні, але не згарала.

Крыж, які застаўся яшчэ ад старой царквы, бярэ ў рукі самая маладая з удзельніц хода — Ларыса Емяльянава, даярка і шматдзетная маці.

— Мне няцяжка, — гаворыць яна. — Я гэта раблю для ўсёй вёскі, але для сябе і сваіх дзяцей таксама. Каб абараніць іх ад усіх напасцяў. І я сапраўды веру, што хросны ход дапаможа ў гэтым.

Працэсія абыходзіць хату-царкву, праз яблыневы сад паміж клумбаў з кветкамі, якія і халодным восеньскім днём усё яшчэ радуюць па-летняму яркімі фарбамі.

Хросны ход ідзе да помніка аховарам Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта там стаяла за мінулым часам царква. «Ніхто не забыты, нічога не забыта...» Мужчыны трымаюць «Неапалімую купіну», бабулі цалуюць абраз і са словамі «Святая Багародзіца, дапамажы нам!» праходзяць пад ім.

Пераканала камуніста

Дочкі Таццяны Сяргееўны Сазонавай сустракаюць гасцей на парозе хаты і вядуць іх у залу, дзе ў чырвоным куце стаіць той самы абраз, які ўратаваў Ляцягі ад немцаў.

Бабулі застаюцца ў хаце чытаць акафіст, а самыя моцныя фізічна вяскоўцы ідуць хросным ходам далей. Каб абысці ўсю вёску і фермы, патрабуецца нямала часу і сіл.

Лічыцца, што абразы павінны насіць мужчыны альбо ўдовыя жанчыны. Малодшы зяць Таццяны Сяргееўны Міхаіл штогод бярэ на сябе гэты абавязак.

— Я ўжо гадоў 15 нашу абраз, і гэта сапраўды мужчынская праца — ён вельмі цяжкі, — усміхаецца мужчына. — Што ж, гэта для мяне вялікі гонар, і цешча задаволеная.

Сазонавы — вялікі род, які налічвае каля сотні чалавек. Любоў да працы і павага да старэйшых — яго падмурак. Дочкі Таццяны Сяргееўны штогод рыхтуюць вялікі стол на адпраўленне абраза і лічаць гэта не цяжарам, а радаснай і хвалюючай падзеяй.

— Бацькоў нашай маці раскулачылі, і яна трапіла ў вельмі набожную сям'ю, — расказвае гісторыю сям'і Кацярына Шаўкунова. — Маці захавала на ўсё жыццё цвёрдую веру. Яна малілася заўсёды, хоць наш бацька быў камуністам і забараняў ёй. Але і ён урэшце паверыў: на сконе жыцця вырашыў узяць у хату і адпраўляць «Неапалімую купіну».

Дарэчы, бацька Сазонаў таксама завяшчаў дочкам абвянчацца са сваімі мужамі. Так яны і зрабілі гэтым летам: у Ляснянскай царкве тры пары ўжо немаладых людзей урачыста абвянчалі.

З імі Бог

Застолле на адпраўленне абраза — абсалютна цвярозае і сёлета поснае, бо серада. Кіруе гатаваннем страў Антаніна Каткова. Фасоля, грыбы, бульба, рыба, гародніна — усё прыгатавана ў печцы і проста неверагодна смачнае. Да ягаднага кампоту падаюць пірагі з яблыкамі.

— Тут мука, вада, дрожджы і... душа, — усміхаюцца сёстры Сазонавы.

— Дочачкі мне дапамагаюць, — хваліцца гаспадыня хаты і свята. — У мяне 4 дачкі, 8 унукаў і 5 праўнукаў. І ўсе яны людзі добрыя. Гэта яна, святая Матачка Божая, дапамагла.

— І мы шчыра верым, што дапамагае, — падхопліваюць Кацярына і Антаніна. — Бог з намі ў жыцці!

Бабулі хвалююцца, ці будуць маладыя людзі без іх падтрымліваць традыцыю хроснага ходу.

— Будзем спадзявацца на гэта, — разважліва гаворыць айцец Георгій. — Гэта ўнікальная падзея, нідзе на Слаўгарадчыне такога больш няма. Усё ж такі ў 1943-м годзе ў Ляцягах здарыўся сапраўдны цуд, і людзі вырашылі штогод абыходзіць вёску хросным ходам. І як бы ні было складана, рабілі гэта. І мы будзем, пакуль жывыя. Заступніцтва ў Божай Маці трэба прасіць не толькі ў горы і бядзе, але і заўсёды. Як у нас кажуць, без Бога ні да парога.

Лятаць і цягнуць

Ляцягі — нібыта звычайная вёсачка, якая, на першы погляд, наўрад ці прыцягне ўвагу вандроўніка. Між тым, як, падаецца, і ў любым беларускім кутку, тут ёсць свае адметнасці і легенды. Тут і старажытныя курганы, і крыніца Цароў калодзеж — нібыта выкапаны па загадзе Пятра I роўна трыста гадоў таму...

А вось, напрыклад, назва вёскі. Ляцягамі ўвогуле называюцца вавёркі пэўнага віду, аднак якраз у гэтых мясцінах яны не водзяцца. Ёсць паданне пра нейкіх чарцей, якія ляталі, і нібыта з чортавай сілай тутэйшыя справіліся пабудовай царквы. Аднак найбольш верагодная версія — ад прозвішча пана Ляцягі, які меў тут маёнтак.

— Дык Ляцягі — ад «лятаць» альбо «цягнуць»?

— Лятаць! Хаця і цягнуць мы можам!

— Працаваць трэба, — раяць ляцягаўскія бабулі. — Таму што самыя гультаі ўжо там, а мы вечна спіны гнулі і ўсё яшчэ тут!

— Мы жадаем усім людзям дабра, — гаворыць са слязамі на вачах Таццяна Сяргееўна Сазонава. — Каб Бог быў у дапамогу, тады будзе ўсё добра.

І каб Бог не кідаў Ляцягі, на наступны год 17 верасня зноў пойдзе вакол вёскі хросны ход з абразам святой Матачкі Божай «Неапалімая купіна».

Ілона ІВАНОВА.

Слаўгарадскі раён.

РЭЦЭПТ ЛЯЦЯГАЎСКІХ ПІРАГОЎ «З ЯБЛЫКАМІ І ДУШОЙ» АД АНТАНІНЫ КАТКОВАЙ

Паўлітра вады, палова пачка дрожджаў, няпоўная чайная лыжка солі, амаль поўны стакан цукру, мука — колькі возьмецца, прыкладна каля кілаграма. Замешваць, пакуль цеста ўжо не будзе бракца за рукі. Яно павінна падыходзіць гадзіну-паўтары. Калі падымаецца — збіваць. Потым памазаць стол алеем і выкласці кавалкамі цеста. У кожны піражок — парэзаныя яблыкі і лыжку цукру. Смажыць на патэльні.

Савет ветэранаў настроены аптымістычна.

Званок у карпункт

У ПАЛОНЦЫ ХОЧУЦЬ НЯШМАТ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Акрамя пенсіянераў, у Палонцы шмат дзяцей. Калі малое сур'ёзна захварэла, то можна выклікаць «хуткую дапамогу». Інакш трэба везці дзіця за 25 км у горад. А калі ўзнікае неабходнасць, каб дзіця было пад наглядам доктара пэўны перыяд, то што рабіць бацькам?

Быў адпраўлены ліст у Міністэрства аховы здароў'я, пасля чаго ў Палонку прыязджалі некалькі чалавек з Баранавічаў, атрыманы адказ за подпісам галоўнага ўрача Баранавіцкай цэнтральнай паліклінікі А. Стэцко (5 лютага 2007 г. № 840), у якім гаворыцца, што ў адпаведнасці з праграмай адраджэння і развіцця вёскі ў 2009 годзе Палонка стане аграгарадком і пытанне аб амбулаторыі будзе вырашана.

Такі адказ жыхары сустрэлі аптымістычна — не толькі з'явіцца амбулаторыя, але і яшчэ нешта будзе зроблена.

А неўзабаве прайшла чутка, што Палонка аграгарадком не стане, і тады людзі адправілі ліст у райвыканкам, каб там растлумачылі наконт аграгарадка і медыцынскага абслугоўвання.

І з адказу, падпісанага намеснікам старшыні райвыканкама А. Грынкевічам (18.09.2008 г. 04-18/4) выходзіць, што аграгарадка, як і амбулаторыі, у Палонцы не будзе.

«Пералік упарадкаваных аграгарадкоў у Баранавіцкім раёне зменены і зацверджаны на падставе пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь... адкрыццё ўрачэбнай амбулаторыі на базе ФАПа не ўяўляецца магчымым...»

Ківанне на сталіцу на мясцовым узроўні стала даволі папулярным. Гэта там вырашаюць, ці будуць у Палонцы асфальт без ямаў, пафарбаваныя агароджы і ўвогуле, гэта сталічныя начальнікі не далі магчымасці Палонцы ператварыцца ў аграгарадок...

А між тым на справе ў кожным канкрэтным раёне вырашалася, які населены пункт падлягае аднаўленню. Палонку, як вёску аддаленую, пакінулі на потым, а ўзяліся ператварыць у аграгарадкі населеныя пункты нават з меншай колькасцю жыхароў, па сваім меркаванні. Захацела б мясцовая ўлада, і Палонка даўно была б аграгарадком.

Але людзі цяпер не настойваюць на аграгарадку, бо ў іх ёсць аптэка, лазня, пральня, стаматалагічны кабінет і тое, што было пералічана вышэй — яны хочуць, каб у вёсцы стаялі 2-3 ложкі дзённага стацыянару ды быў доктар, а гэта дробязь у параўнанні з затратамі на аграгарадок. Жылі люд-

дзі без яго і будуць жыць далей, бо ў вёсцы нават газ праведзены. І калі браць па вялікім рахунку, то статус аграгарадка для Палонкі — з'ява фармальная. Аб'явіце аграгарадком, адкрыйце амбулаторыю, і праблема будзе знятая.

І ўсё ж, што прапаноўваецца жыхарам Палонкі: «На базе гарадской паліклінікі № 3 (г. Баранавічы) функцыяніруе дзённы стацыянар на 6 ложкаў, які працуе ў дзве змены і чаргі на шпіталізацыю няма. З мэтай забеспячэння даступнасці амбулаторна-паліклінічнай дапамогі ў рэгістратуры паліклінікі праводзіцца папярэдні запіс на прыём да ўсіх спецыялістаў», — напісана ў лісце-адказе.

— Я ніводнага разу не была на бюлетэні — температура пад 40 градусаў, а іду на працу, бо як да таго горада дабрацца? І невядома, ці яшчэ дадуць бальнічны ліст, — кажа Святлана Прончак.

Дзённы стацыянар у горадзе для жыхароў Палонкі — гэта жарт? Чалавек, нават не састарэлы, паляжаў удзень на тым стацыянары, а затым ідзі на вакзал і едзь дадому? Наступіла раніца — і назад, у горад?

А што такое папярэдні запіс у рэгістратуру? Чалавек ведае, што праз тры дні захварэе і будзе тэлефанаваць, каб паставілі на чаргу да доктара?

У чарговы раз вяртаюся да думкі, што не ўсё залежыць ад кіраўніка на месцы, але яго грамадзянская і прафесійная пазіцыя, неабыякавасць выражаюць многае.

Мясцовая ўлада абавязана адстойваць інтарэсы сваіх грамадзян і перад тым, як узводзіць нейкі аб'ект, пажадана паглядзець, ці патрэбна тая будоўля. А можа, за лепшае будзе вырашыць набалелыя праблемы з медыцынскім абслугоўваннем насельніцтва? Калі захацець і падысці па-гаспадарску, то многае можна вырашыць.

Але вернемся ў Палонку.

І хто гэта сказаў, што такая вёска не падпадае пад мінімальныя сацыяльныя стандарты? А магчыма, у такім выпадку, можна падвесці вёску пад максімальныя? Тысяча чалавек — і не ў тых стандартах!? Людзі павінны жыць у нармальных умовах. Хоць у Палонцы на ўмовы ў цэлым не наракаюць, а просяць арганізаваць адпаведнае медыцынскае абслугоўванне.

І не трэба спяшацца з адмоўнымі адказамі, а за лепшае будзе вырашыць праблему станоўча.

Ці хоць бы паспрабаваць зрабіць гэта на месцы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Вярнула доўг... фальшыўкамі

20-гадовая непрацуючая гамяльчанка, якая пазычала ў сваёй знаёмай грошы, расплацілася з апошняй падробленымі купюрамі.

Каб вырашыць праблему з доўгам, махлярка дома запусціла «друкавальны станок»: з дапамогай камп'ютарнай тэхнікі яна вырабіла 10 фальшывак наміналам па 10 тысяч рублёў. Пасля таго, як прайдзісветку выкрылі, у яе дома былі канфіскаваны сістэмны блок камп'ютара і мультысістэмны блок.

Ігар ГРЫШЫН.

Заманіла абяцанкамі...

Буйную суму грошай выманіла ў расійскай грамадзянкі 38-гадовая віцябчанка, у дачыненні да якой узбуджана крымінальная справа.

Пацярпелая даверылася непрацуючай жанчыне, якая паабяцала дапамагчы ёй у вырашэнні пытання з афармленнем дакументаў на куплю кватэры. За што напачатку ўручыла сваёй памагатай тысячу долараў. А пасля махлярка падманным шляхам завалодала яшчэ 18 мільёнамі беларускіх рублёў даверлівай жанчыны. Працверажэнне ж наступіла са спазненнем...

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

Трапіў пад колы машыны

Вучань другога класа адной з брэсцкіх школ выскачыў на праезную частку вуліцы Герояў абароны Брэсцкай крэпасці з-за маршрутнага аўтобуса і трапіў пад колы легкавой машыны. Дзіця атрымала траўмы і дастаўлена ў бальніцу. Паводле інфармацыі дзяржаўтаінспекцыі, вадзіцель машыны была цвярозая.

Яна СВЕТАВА.

У **суд Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **Крыгіна Станіслава Уладзіміравіча**, 8 сакавіка 1970 года нараджэння, ураджэнца г. Сарканда Талды-Курганскай вобласці, Казахстан, які пражываў у г. Ваўкавыску па вул. Жолудзева, д. 141/4 Гродзенскай вобласці, а ў маі—ліпені 1997 года выехаў у г. Чымкент, Казахстан, і з таго часу звестак аб ім няма.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Крыгіна С.У., паведаміць іх суду Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Простыя рэчы

ГАДЗІННІК

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Нехта можа запярэчыць — ну якая ж гэта простая рэч. Ды не, відаць, самым першым гадзіннікам у чалавека было сонца. Па ім ён вызначаў: ці час яму падымацца, снедаць, ісці ў поле альбо з поля. Сонца ўвогуле доўга царавала над чалавекам, ды і цяпер царуе, толькі мы пра гэта не думаем. Ну, а ў старажытных краінах ад Егіпта да Месапатаміі і далей з'явіліся ўжо сонечныя гадзіннікі: круг, пасярод якога ўмацавана палка, на кругу дзяленні на кожную гадзіну, а то і менш. Гэта добра для поўдня, а ў Еўропе такім гадзіннікам з-за дажджоў, туманоў ды аблокаў пакарыстаешся няшмат.

Нашы продкі-беларусы таксама, відаць, здаўна карысталіся сонцам для вызначэння часу. Ды і сёння старыя людзі па сонцы вельмі дакладна скажуць вам час. А быў жа ў беларусаў і жывы гадзіннік — певень. «Узняцца з першымі пеўнямі — устаць вельмі рана. «Прастаяць маладым, закаханым да трэціх пеўняў» — наадварот, у летні час ужо і класціся не трэба. Успомніліся. У рамане Міхаіла Шолахава «Узнятая цаліна» ёсць такі момант. Стары Шчукар, якому па ўзросце не спіцца, і Нагульнаў, якому не спіцца без жонкі, бо выгнаў, узяліся за навуку. Маладзейшы вывучае «агліцкую» мову па слоўніку, каб несці рэвалюцыю ў свет, у старога таксама слоўнік, дзе бачыць ён толькі вялікія літары. Пад раніцу, калі казацкія пеўні па хутары абуджаюць сваіх гаспадароў, яны слухаюць гэтыя галасістыя качатовыя спевы. А не спадабаецца ім які хрыплы голас — тут жа Нагульнаў ідзе да гаспадара, купляе недарэку — і на лапшу.

Успомнілася і ў Сяргея Панізніка:

Зноў пракукарэкала
раніца аглохлая.
Праплываю з Грэкаў я
У Варагаў логава.

Была ў беларускіх дзяцей і свая мера часу. Працытую Янку Брыля. Так ён апісваў дваццатыя—трыццатыя гады мінулага стагоддзя:

«Мы, пастушкі, занятыя былі і ў нядзелю. Ды ў нас, у хлопцаў, былі ж і сяброўкі, якія маглі «адпусціць» калі ўжо такая патрэба. Час мы мералі не гадзіннікам (на ўсю вёску іх са два, можа, і было), а даўжынёю ўласнага ценю. «Пусці мяне на ступак, на паўтара ступака, на чвэртку ступака...»

На маёй памяці ходнікі (так называлі мы гадзіннікі на сцяне з цэпкай і гірай) ужо былі практычна ў кожнай вясковай хаце.Трэба было не забывацца рэгулярна падцягваць гэтую цэпку, бо гадзіннік спыняўся. Гэты абавязак усклаўдалі ў хаце на якога дзядка ці бабулю, што ў палявых работах ужо не ўдзельнічалі.

У сярэднявечнай Еўропе былі распаўсюджаныя гадзіннікі — пясочныя, нават вадзяныя, апошні называўся клепсідра (мерны сасуд, з якога за пэўны час выцякала вада). Але гэта была прывілея багацейшых. Быў яшчэ адзін від гадзіннікаў сярэднявечча адметнай формы. У начны час воін браў на крапасную сцяну факел. Час яго гарэння быў дакладны. Згарэў — прыходзіла змена. А гадзіны гэтага вартаўніцтва нават мелі свае назвы. Гадзіна ваўка, напрыклад.

У 1736 годзе ў Нясвіжы быў на лацінскай мове напісаны спецыяльны трактат па вырабе пераносных сонечных гадзіннікаў рознай канструкцыі.

А першыя механічныя гадзіннікі прыходзілі да нас з Еўропы. Гэта былі вялікія механізмы, якія называліся вежавымі і ўстанаўліваліся менавіта на вежах гарадоў, ратуш, на палацах магнатаў.

Еўрапейцу Х. Гюйгенсу абавязаны мы адкрыццямі, якія зрабілі гадзіннікі падобнымі на цяперашнія — з маятнікам і балансірамі.

Механічныя кішэнныя гадзіннікі прыходзілі ў наша жыццё не адразу. Ад магната і дваранiна да купца, да гарадскога мешчаніна, потым да багацейшага селяніна. Дастаць яму на вечарыне гадзіннік, які ляжыць у спецыяльнай кішэні камізэлькі, ды яшчэ гадзіннік на ланцужку, са звонам — ого!» Гадзіннікі з накладнога золата насілі багатыя купцы. Пачакайце, нядаўна ішоў фільм пра маладога Чайкоўскага. І там крадзеж залатога гадзінніка ў яго — ледзь не цэнтральная частка фільма.

Афіцэрскі гадзіннік — у сямідзясятых гадах быў ён вялікім дэфіцытам, каштаваў шмат. Але ж і высокай якасцю, воданепранікальнасцю вызначаўся. Увогуле ў арміі, на вайне без гадзінніка нельга. Успомніў пра вайну. Васіль Быкаў, у яго аповесцях гадзіннік прысутнічае абавязкова. Дзе нават з усмешкай:

*«Памятаю, бачыў я ў шпіталі салдата, якому хірург аперыраваў сцягно і ўвесь час лаяўся. Аказваецца, нямецкі асколак разбіў у кішэні салдата сем гадзіннікаў, загнаўшы ў нагу ўсялякія кольцы і спружынкі. **«Трэцяя ракета».***

Дзе нейтральна, але вельмі дакладна:

*«Камбат з задавальненнем выцягнуў ногі і, няўважліва слухаючы размову падначаленых, дастаў з кішэні гадзіннік. Гэта быў трафей, узяты ў забітага нямецкага танкіста, з трыма стрэлкамі і надзіва дакладным ходам. **«Здрада».***

А ў той жа «Трэцяй ракеце» гадзіннік на руцэ камандзіра супрацьтанкавай гарматы, якая вядзе цяжкі бой з нямецкімі танкамі, увогуле раўнапраўна прысутнічае ў сюжэце. Спачатку ён некалькі разоў упамінаецца на руцэ камандзіра, што вядзе бой, потым некалькі разоў — на руцэ ўжо загінулага сяржанта. А ў канцы аповесці адзіны ацалелы малады салдацік зайшоў у бліндаж, дзе ляжаць мёртвыя сябры:

«А чырвоная доўгая стрэлачка на Жаўтыховым гадзінніку ўсё рупна бяжыць і бяжыць на чорным цыферблаце. Гэткая яе жывучасць бянтэжыць мяне — з нейкім забабонным страхам я б'ю па ёй біклагай — шкло рассыпаецца, і стрэлка спыняецца на лічбе 11».

Сёння гадзіннікі існуюць у самых разнастайных відах — механічныя, электронныя, кварцавыя, нават атамныя. А колькі іх па функцыянальнасці — гасцінны, кішэнны, наручны, шахматны, напольны і настольны, камп'ютарны ў рэшце рэшт...

Сёння заўважаю, што вельмі многія людзі, асабліва маладыя, адмаўляюцца ад наручных гадзіннікаў. А навошта яны, калі ў кожнага — ад першакласніка да вясковай бабулі, якая праполвае траву ў агародзе, ёсць мабільныя тэлефоны. Дастаў яго з кішэні, зірнуў.

У мяне з гадзіннікамі своеасаблівыя адносіны. Да службы ў арміі, месцачковым дзецюком любіў, каб яны былі на руцэ, ды яшчэ і якія прыгожыя, тыя ж афіцэрскія ці падараныя бацьку на чарговы юбілей Перамогі. А ў арміі першы год мы іх і не насілі. Было — кралі «дзяды» ў маладых сабе на дэмбель. Ды маладому салдату гадзіннік і не патрэбен. У яго ад уздыму да адыходу на сон няма ніводнай вольнай хвіліны. Усё па распарадку. Не патрэбен быў мне гадзіннік і ў стане «дзеда». Бо я лічыўся ў мотастралковай роце, але там толькі начаваў, дзень праводзіў у рэдакцыі дывізійнай газеты.

Ад гадзінніка пайшла і гадзіна. А, можа, наадварот.

Але ж:

Апошняя гадзіна — смерць.

Гадзіна ў гадзіну — прыйсці ці зрабіць нешта дакладна, у вызначаны тэрмін.

З гадзіны на гадзіну — восьвось, хутка.

Не па днях, а па гадзінах — вельмі хутка расці, развівацца.

Бітая гадзіна — калі нехта некага доўга чакаў.

Чорная гадзіна — цяжкі час.

Шэрая гадзіна — калі змяркаецца вечарам пасля захаду сонца.

Гадзіна пік — той, хто ездзіць грамадскім аўтатранспартам, ведае, што гэта такое.

Каменданцкая гадзіна — пэўны час, у які перамяшчэнне па населеным пункце забароненае.

Мёртвая гадзіна — у бальніцах пасля абеду адпачынак для хворых. Іх ужо ніхто не патурбуе.

Але ж гадзіна гэта і **школьны ўрок**.

У рускіх гадзіннік — гэта часы, у палякаў — загарак.

З народнага гумару. *Паехалі два мужчыны з вёскі на кірмаш: адзін — купіць карову, другі — проста складсці кампанію, дапамагчы ў выбары. Выбралі, купілі, прывязалі да воза, едуць назад. Але як жа тут не выпіць барышу? Зайшлі ў карчму і добра так пабарышавалі, аж прыдрамалі за сталом. Падхапіліся. Першы:*

— Колькі часу?

Другі зірнуў на руку. Няма гадзінніка, спёрлі.

Выходзяць на вуліцу, ідуць да свайго воза. Конь ёсць, воз ёсць, а кароўкі няма. Пабедавалі мацней. А потым махнулі рукой, за ўсё адзін адказ. Узялі яшчэ пляшку, едуць. А мужчыны вясёлыя. Пасядзелі моўчкі. Вазнік і пытаецца:

— Колькі там, братка, часу?

— Ды, братка, час даіць.

А крымінальнае — **забіць стрэлку**. Калі ўпершыню ў нейкім дэтэктыве прачытаў такі выраз «крутога», нават і не зразумеў. Аказваецца, проста: прызначыць сустрэчу. «Багацее» наша мова і такімі выразамі.

Але хочацца завяршыць размову пра простую рэч прыгожым, паэтычным. Максім Танк напісаў у 1966 годзе, відаць, калі ўпершыню адчуў вагу пражытых няпростых гадоў:

Стрэлкі гадзінніка — ножніцы
Нястомнага краўца,
Які дзень і ноч
Кроіць час
І шые мне з яго вопратку.
Якіх ён за век
Не нашыў мне дзівосных убораў!

Алесь КАСЦЕНЬ.

г. Паставы.

Не спрабуй аб'ехаць лася

Нядаўна толькі на працягу аднаго вечара і толькі ў наваколлях Мінска адбылося тры дарожна-транспартныя здарэнні з удзелам дзікіх жывёл. А 21-й гадзіне аўтамабіль сутыкнуўся з ласём на аўтатрасе Мінск — Гродна каля вёскі Байдакі Мінскага раёна. Некалькі пазней вадзіцель легкавіка, вяртаючыся з нацыянальнага аэрапорта ў сталіцу, не здолеў пазбегнуць сутыкнення з дзіком, які раптоўна выскачыў на праезную частку дарогі. І такое ж здарэнне адбылося на дарозе Мінск — Маладзечна каля пасёлка Ратамка.

Па ініцыятыве Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь сёлета Дзяржаўтаінспекцыяй МУС краіны прадпрыняты меры па абазначэнні папераджальнымі знакамі ўчасткаў аўтамабільных дарог з павышанай небяспекай з'яўлення на праезнай частцы дзікіх жывёл. Аднак выбегчы на дарогу яны могуць і ў іншых, не абазначаных месцах. Таму спецыялісты Дзяржінспекцыі заклікаюць аўтамабілістаў памятаць пра гэта пры паездках у цёмны час сутак на дарогах, што пралягаюць побач з ляснымі і сельскагаспадарчымі ўгоддзямі.

Убачыўшы на дарозе дзікую жывёлу, не варта спрабаваць павялічыць хуткасць, аб'язджаць яе, паколькі немагчыма прадбачыць рэакцыю напалоханай жывёлы на хуткае набліжэнне аўтамабіля. Апошні жывёлай можа ўспрымацца як крыніца небяспекі, і нават калі ў лася ці дзіка ёсць магчымасць уцячы, яны могуць спыніцца, каб адбіць напад ці пабегчы ў зваротны бок. Калі на дарозе з'явілася дзікая жывёла, незалежна ад яе памераў, лепш прыпыніцца і прапусціць яе. Бо ад сутыкненняў гіне не толькі жывёла, але і часта сур'ёзна траўмуюцца людзі, моцна б'юцца аўтамашыны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Краіна здароўя

Выпуск № 45 (101)

Дзеці і школа

Няўважлівасць і забыўлівасць школьніка пасля канікулаў лічыцца нормай на працягу першага месяца вучобы і не з'яўляецца прычынай для сур'ёзнага хвалявання бацькоў, расказала ў гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА загадчыца кафедры педыятрыі БелМАПА, доктар медыцынскіх навук, прафесар Людміла Бяляева.

Паводле яе слоў, на працягу месяца павінны скончыцца ўсе працэсы псіхалагічнай адаптацыі да новых абставінаў, але калі пасля заканчэння гэтага часу рассеянасць і забыўлівасць у дзіцяці не знікае, то лепш звярнуцца па дапамогу да псіхолага. Фактарамі, якія спадарожнічаюць рассеянасці, у гэтым выпадку стане парушэнне сну, пагаршэнне апетыту, капрызнасць, нервовасць, раздражнёнасць — іншымі словамі, незвычайныя, нетыповыя паводзіны.

Парушэнне памяці ў першакласніка або школьніка, які вярнуўся з канікулаў, — гэта толькі адна з праяў стрэсу, які выклікае ў дзяцей любы новы занятак, што патрабуе напружанасці, павышанай увагі. Хутка пераключыцца на вучобу дзіця проста не можа — у час канікулаў яно адпачывала, яму не трэба было думаць над матэматычнымі прыкладамі, вучыць штосьці на памяць, патлумачыла Людміла Бяляева.

Дарослыя ў стане дапамагчы сваім дзецям справіцца з праблемай — і выйсце ў мінімізацыі нагрузкі на дзіцячы арганізм, у знятці напружання. Спецыяліст параіла больш гуляць з дзіцем у перыяд адаптацыі, сачыць за тым, каб яно не бавіла ўвесь свой вольны час ля тэлевізара або камп'ютара. «Пастарайцеся ўкладваць дзяцей спаць раней, забяспечце іх ежу разнастайнай, багатай на вітаміны і садавіну, выключыце з рацыёну цяжкую ежу», — параіла прафесар.

Яна падкрэсліла, што недаравальна загружаць дзіця вучобай з першага дня заняткаў. «Бывае так, што 1 верасня мама адпраўляе сына ў агульнаадукацыйную школу, 2 верасня — у музычную, а 3 — у яго дадатковыя заняткі па замежнай мове ці рэпетытарства. Між тым рэпетытар у школьніка павінен з'явіцца не раней за кастрычнік, калі дзіця будзе настроена на вучобу», — расказала загадчыца кафедры педыятрыі.

Яна не ўхваліла нетрадыцыйныя методыкі, якія дапамагаюць адаптацыі, а таксама прымяненне прэпаратаў, што павышаюць імунітэт дзіцяці, або любых іншых медпрэпаратаў. Калі дзіця паступова прывучаць да новага распарадку дня, прытрымлівацца вышэйназваных парад, то яго рэакцыя зноў увойдзе ў норму, матэрыял падручнікаў будзе ўспрымацца і запамінацца найлепшым чынам. «У рэдкім выпадку, калі такое не адбываецца, дзіця лепш паказаць спецыялісту, які разбярэцца, як дапамагчы малому. І ніякага самалячэння!» — падкрэсліла Людміла Бяляева.

Прамыя лініі

Наш адказ дзіцячым інфекцыям

Як засцерагчы дзіця ад інфекцыйных хваробаў і прадухіліць ускладненні, выкліканыя апошнімі? Якія інфекцыі будуць «уладарыць» гэтай восенню і зімой? Каму і навошта трэба рабіць прышчэпку ад грыпу? Аб усім гэтым можна распытаць Іну Генадзьеўну ГЕРМАНЕНКУ, дацэнта, загадчыцу кафедры дзіцячых інфекцыйных захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, галоўнага пазаштатнага спецыяліста Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь па дзіцячых інфекцыйных захворваннях.

Задаць свае пытанні можна па нумарах рэдакцыі: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92 у сераду, **1 кастрычніка, з 13.00 да 14.00.** Папярэднія пытанні пакідайце, калі ласка, па нумары 8 (017) 287 18 29.

Як процістаяць сасудзістай паталогіі галаўнога мозга?

Аб асаблівасцях перамагання сасудзістых паталогій галаўнога мозга (інсультаў, анеўрызмаў і інш.), хірургічных метадах лячэння гэтых паталогій і сучасных дасягненнях айчыннай нейрахірургіі можна распытаць Арнольда Фёдаравіча СМЕЯНОВІЧА, прафесара, загадчыка нейрахірургічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Неўралогія і нейрахірургія», члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, Лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

«Прамая лінія» з яго ўдзелам адбудзецца ў рэдакцыі «Звязды», у аўторак, **7 кастрычніка, з 17.00 да 18.00.**

Званіце, калі ласка, па нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумары: 8 (017) 287 18 29.

А на мой погляд...

У ПРЫРОДЫ НЯМА ДРЭННАГА НАДВОР'Я. КОЖНАЕ НАДВОР'Е — ХАРАСТВО?..

Сёлетняя восень, у адрозненне ад мінулай, нас цеплынёй не песціць: халадэча надышла неяк адразу і, як аказалася, надоўга. Паводле выказванняў сіноптыкаў, цяперашні вераснёўскі час па ўмовах надвор'я нагадвае кастрычнік. А як вы ратуецеся ад холаду?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Алег МАГЕР, загадчык аддзела гігіены працы Мінскага абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі:

— Параметры мікраклімату нармуюцца ў залежнасці ад умоў працы. Зноў жа, улічваецца і час года: цёплы ці халодны. Калі гаварыць пра нейкую вытворчасць, на адным і тым жа прадпрыемстве, у залежнасці ад памянёных умоў працы, тэмпература ў памяшканнях можа адрознівацца. Калі гаварыць пра жыллё, дык, вы ведаеце, дапушчальнай лічыцца тэмпература паветра ад 18 да 22 градусаў цяпла.

Як я сам пераношу холад? Яго проста трэба перажыць (*смяецца*). Абагравальнікамі на працы карыстацца забаронена, таму выйсце кожны знаходзіць сам: нехта саграецца кавай—гарбатай, хтосьці апранаецца цяплей. Я вось якраз апрануўся ў больш цёплыя рэчы.

Аляксандр ЖУРАЎСКІ, памочнік генеральнага дырэктара Нацыянальнай кампаніі «Белавія»:

— Ратуюся па тым жа рацэпце, што і многія іншыя (*смяецца*). Памятаеце, як гучыць у адным з фільмаў Эльдара Разанава: у прыроды няма дрэннага надвор'я. Ёсць дрэннае адзенне, вопратка. Таму найперш трэба ўцяпляцца такім чынам.

Не, у цёплыя краіны я ўжо даўно ні па профілю сваёй працы, ні ў водпуску не лятаю. Ведаеце, я ўвогуле не вельмі люблю спякотныя краіны, лічу, што трэба адпачываць у тым клімаце, у якім праводзіш усё сваё жыццё. Наш мне падабаецца, я люблю адпачываць дома.

Вольга ФЯДОТАВА, галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра:

— Сіноптыкі, як і ўсе людзі, ратуюцца тымі ж спосабамі (*смяецца*). Па-першае, трэба апранацца цяплей, шматслойна. Па-другое, дома карыстаемся абагравальнікам. Бясспрэчна, лад і згода ў сям'і спрыяюць душэўнай цеплыні, але, шчыра кажучы, хацелася б, каб і фізічна было цяплей (*смяецца*).

Святлана ШУЛІЦКАЯ, пенсіянерка, гарпасёлак Мір Карэліцкага раёна:

— У мяне газавае ацяпленне і, як інвалід II групы, за 180 «кубоў» блакітнага паліва я плачу палову кошту, астатняе ж аплачваю цалкам. Зімой штомесяц «набягае» 550—600 «кубоў», але ж пакуль сапраўдных халадоў яшчэ не было. Да таго ж, праводзячы газ, я прадбачліва пакінула печ-грубку, не выкінула яе. Пакуль адносна цёпла, у якасці паліва выкарыстоўваю галінкі дрэў з саду, нейкае смецце. Яна абаграе толькі спальню і пакой, але я па чарзе карыстаюся і печчу, і газавым ацяпленнем. У жыллі ў мяне тэмпература паветра 20 градусаў цяпла, я люблю, каб было цёпленька. У мяне бранхіт, астма, патрэбна сухое і цёплае паветра. Ну, і цёплыя шкарпэтачкі, халацік, кофтачку апранаю.

Алена КАВАЛЁВА, прэс-сакратар Міністэрства гандлю:

— Я ведаю, што ў многіх журналістаў, калі яны пішуць матэрыял, есць звычка курыць. А я, калі працую над нейкім дакументам, п'ю добрую моцную гарбату. Вось зараз перада мной кубак з чорнай гарбатай з афрыканскім ройбушам, які вельмі станоўча ўплывае на імунітэт, павялічвае супрацьўляльнасць арганізма прастудным хваробам. Вельмі добры чай — са зборамі траў — выпускае цяпер Мінская агародніная фабрыка. Ну, і дома яшчэ абагравальнік уключаю (*смяецца*).

Генадзь ДЗІЧКОЎСКІ, ветэрынарны фельчар СВК «Раманава», вёска Кажушкі Слуцкага раёна:

— Вось толькі вярнуўся дадому з выклікаў. Адзін быў за кіламетр ад дому, другі — за сем. Ездзіў на кані — за мной замацаваны калгасны. Увогуле па выкліках я выязджаю на матацыкле, але падчас сапраўдных халадоў ён, бывае, не заводзіцца, дык тады ўжо на кані... Асабліва пакуль не ўцяпляюся, у плашчы вось быў. Ведаеце, працую тут з 1970 года, столькі за гэты час было выклікаў і ў спёку, і ў маразы, што я ўжо акліматызаваўся да любога надвор'я (*смяецца*). Дома ў нас паравое ацяпленне, але пакуль ўключаем яго толькі калі сын з дочкамі да нас прыязджае, бо ім 3 і 5 гадоў, нашым унучкам.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦІСК МОЖНА ЗНІЗІЦЬ ПРЫ ДАПАМОЗЕ ДЫЕТЫ З ПАНІЖАНЫМ УТРЫМАННЕМ СОЛІ

Вучоныя высветлілі, што пры гіпертаніі, якая не паддаецца лячэнню нягледзячы на прыём некалькіх прэпаратаў, ціск можна знізіць пры дапамозе дыеты з паніжаным утрыманнем солі, паведамляюць інфарм-агенцтвы.

Паводле слоў галоўнага аўтара даследавання Эдуарда Пірненты, ужыванне вялікай колькасці кухоннай солі ў значнай ступені садзейнічае ўзнікненню артэрыяльнай гіпертаніі, устойлівай да лячэння.

Эдуарда Пірнента і яго калегі з Інстытута Кардыялогіі (Сан-Паўлу, Бразілія) вывучылі сувязь паміж колькасцю солі, якая з'ядаецца, і ўзроўнем артэрыяльнага ціску ў 13 пацыентаў з устойлівай да лячэння гіпертаніяй. У сярэднім пацыенты прымалі 3,6 прэпарата для зніжэння ціску. Сяроднія лічбы артэрыяльнага ціску на прыёме ў доктара складалі 147,9/85,2 мм. рт.сл. Калі людзі перайшлі на дыету з нізкім утрыманнем солі, сісталічны ціск знізіўся ў сярэднім на 22,6 мм.рт.сл, а дыасталічны — на 9,2 мм.рт.сл.

«Мы чакалі, што пры змяншэнні спажывання солі артэрыяльны ціск знізіцца, але ніхто не думаў, што зніжэнне будзе такім значным», — гавораць аўтары работы.

Даследаванне таксама паказала, што лішняя кухонная соль уплывае на работу крывяносных сасудаў і прымушае арганізм затрымліваць вадкасць нават пры лячэнні мачагоннымі прэпаратамі. Пры дыеце з паніжаным утрыманнем солі арганізм пазбаўляецца ад лішняй вадкасці.

Вучоныя прыйшлі да высновы, што даследаванне дакладна прадэманстравала шкодныя эфекты ўжывання празмернай салёнай ежы ў людзей з устойлівай да лячэння гіпертаніяй.

Кар. БЕЛТА.

АГАРОДНІНА Ў КАСМЕТЫЦЫ І НА НАШЫМ СТАЛЕ

Прэзентацыя кнігі «Агародніна ў харчаванні чалавека» А. Аўтка і Ан. Аўтка прайшла ў Інстытуце агародніцтва Нацыянальнай акадэміі навук.

Па словах яе аўтараў, кніга ахоплівае 100 відаў культур з агародніны. Акрамя большменш традыцыйных тэмаў (пра значэнне агародніны для рацыянальнага харчавання чалавека, яе ролю ў прафілактыцы анкалагічных захворванняў, каштоўнасць сокаў з агародніны) на старонках кнігі можна знайсці таксама інфармацыю пра касметычныя ўласцівасці агародніны, парады па захаванні карысных уласцівасцяў агародніны падчас кулінарнай апрацоўкі, і парады па яе захоўванні. Закранаюцца таксама і такія тэмы, як нітраты ў агародніне і агародніна ў астралогіі. Да таго ж гаспадыні змогуць знайсці ў кнізе больш як 300 рэцэптаў з 40 відаў агародніны.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У Мінску могуць забараніць гандаль спіртнымі напоямі на разліў у магазінах

Гандаль спіртнымі напоямі ў разліў у магазінах трэба забараніць, лічаць сталічныя ўлады.

Трэба выкараніць продаж алкаголю ў разліў у магазінах, заявіў мэр горада Міхаіл Паўлаў на аператыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме. У якасці негатыўнага прыкладу ён прывёў універсам «Фрунзенскі», дзе арганізаваны такі гандаль. Пакупнікі ўвесь час бачаць п'яных, якія «вісяць» ля сталоў, адзначыў старшыня Мінгарвыканкама. Скардзяцца... Пасля такога непрыемнага відовішча наўрад ці захочацца прыйсці ў гэты ўніверсам яшчэ раз. Плошчы, занятыя пад так званыя міні-бары, можна выкарыстаць больш эфектыўна.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, *«Мінск—Навіны».*

Парады спецыяліста

АЗБУКА ПРАВІЛЬНАГА ХАРЧАВАННЯ

Па словах загадчыцы аддзялення гігіены харчавання Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Анжэлы Скурановіч, праблема здаровага харчавання з'яўляецца на сёння надзвычай актуальнай для насельніцтва Беларусі. Гэта пацвярджаюць, у прыватнасці, праведзеныя даследаванні, якія ўказваюць на празмернае спажыванне беларусамі тлушчаў і рафінаваных вугляводаў на фоне дэфіцыту ў штодзённым меню свежай ці замарожанай агародніны, садавіны, зеляніны, рыбы і морапрадуктаў.

— У рацыёне беларусаў пастаянна павялічваецца спажыванне кансерваванай ежы і ежы, прайшоўшай тэхналагічную апрацоўку, што зніжае яе карысныя пажыўныя якасці, — канстатуе спецыяліст. — Адзін з прынцыпаў здаровага харчавання — гэта спажыванне разнастайных прадуктаў, паколькі ніводны нават самі дарагі прадукт не ўтрымлівае ўсе харчовыя рэчывы ў аптымальнай колькасці і правільных суадносінах.

Рацыянальным лічыцца чатырохразовы прыём ежы. На першае снеданне павінна прыпадаць 25 працэнтаў сутачнага рацыёну. Другое снеданне павінна быць параўнальна лёгкім — усяго 15 працэнтаў сутачнага рацыёну. 50 працэнтаў сутачнага рацыёну чалавек павінен з'ядаць падчас абеду і ўсяго 10 працэнтаў застаецца ў нас з вамі на вячэру. Калі сярэднясутачны рацыён сучаснага чалавека складае 2-2,2 тысячы кілакалорый, то аптымальны рацыён (у выглядзе піраміды) павінен выглядаць наступным чынам. Падмурак піраміды (да 40 працэнтаў агульнага аб'ёму ежы) павінны складаць разнастайныя крупы (пажадана грэцкія, геркулес і рыс), хлеб грубага памолу, макарона і бульба.

Пазіцыю над падмуркам піраміды (да 35 працэнтаў аб'ёму ежы) займаюць агародніна і садавіна. Далей размяшчаецца бялковая група прадуктаў, на долю якой прыпадае да 20 працэнтаў сутачнага рацыёну: гэта малако, сыр, кефір, ёгурт, курыца, рыба, мяса, яйкі, соевыя прадукты і г.д. А на вяршыні піраміды (5 працэнтаў) знаходзяцца ўсе віды тлушчаў і цукар, у тым ліку пірожныя, кандытарскія вырабы, марожанае і г.д. Менавіта такія суадносіны харчовых прадуктаў можна лічыць здаровымі. Дарэчы, празмернае спажыванне жывёльных тлушчаў і рафінаваных вугляводаў на фоне дэфіцыту гародніны і садавіны не менш небяспечнае, чым недаяданне. Да таго ж багаты на тлушчы рацыён стымулюе пераяданне, паколькі тлустая ежа тармозіць адчуванне насычэння ў адрозненне ад ежы, багатай на вугляводы, пры роўнай іх каларыйнасці.

— Народная мудрасць, якая раіць «Сняданак з'еш сам», перажыла ўжо стагоддзі, — падкрэсліла Анжэла Скурановіч. — Таму калі вы не маеце звычку есці раніцай, то лепш усё ж такі навучыцеся снедаць. Працаздольнасць чалавека самая высокая менавіта ў першай палове дня, і менавіта ежа дае нам неабходны зарад энергіі...

Вельмі важна ў перарывах паміж асноўнымі прыёмамі ежы, асабліва працяглых, перакусваць (для гэтых мэтаў падыходзяць яблыкі ці арэшкі), каб страўнік не займаўся самаперавараннем, а вечарам вы не садзіліся за стол з «воўчым апетытам». Не піце ваду падчас ежы! Яна разбаўляе страўнікавы сок і замаруджвае працэс стрававання. Правільна піць ваду перад спажываннем ежы: у гэтым разе яна «абудзіць» страўнік і прымусіць яго больш актыўна працаваць. Штодня трэба выпіваць да 2 літраў вады, таму што чалавек на 60 працэнтаў складаецца з вады, якая пастаянна патрабуецца для забеспячэння ўсіх жыццёва важных працэсаў у арганізме. А вось спажыванне солі, наадварот, трэба скараціць. У магазінных прадуктах солі, як правіла, дастаткова. А дасольванне ежы прыводзіць да затрымкі солі ў арганізме і адпаведна павышэння артэрыяльнага ціску.

Агародніна і садавіна з'яўляюцца не толькі пастаўшчыкамі «жывых» вітамінаў і мікраэлементаў у арганізм, але і крыніцай складаных вугляводаў, якія абараняюць нас ад шкоднага ўздзеяння простых вугляводаў, што ўтрымліваюцца ў ласунках. Акрамя таго, садавіна і гародніна ўтрымліваюць клятчатку, якая, як шчотка, ачышчае кішэчнік і пазбаўляе нас ад «зашлакаванасці» — пастаяннай спадарожніцы малярухомага ладу жыцця.

Паміж мёдам і цукрам лепш выбраць мёд, таму што мёд змяшчае шмат фруктозы, для засвоення якой не патрабуецца інсулін. Тым самым вы абараняеце сабе ад развіцця дыябету. Адкажыце сабе на пытанне, як часта вы спажываеце малочнакіслыя прадукты? Між іншым, кожнаму чалавеку трэба выпіваць штодня хоць бы адну шклянку кефіру, каб наталіць арганізм вітамінамі групы В, якіх там нашмат больш, чым у малацэ, і знішчыць гніласную мікрафлору зашлакаванага кішэчніка. Дзякуючы карысным мікраарганізмам, што змяшчаюцца ў кісламалочных прадуктах, апошнія нават здольныя замарудзваць заўчаснае старэнне арганізма.

Многіх цікавіць, якое месца ў рацыёне павінны займаць раслінныя тлушчы? Правільна, калі на іх долю прыпадае не менш як трэць ад агульнай колькасці спажываемых тлушчаў. Праўда, не пашкодзіць ведаць, што рафінаваны алей пазбаўлены многіх карысных біялагічна актыўных рэчываў.

Ну і, нарэшце, часцей уключайце ў рацыён марскую рыбу і морапрадукты, якія з'яўляюцца крыніцай лёгказасваяльных бялкоў і жыццёва неабходнага ёду.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Ці ўвесь хлеб карысны?

Мая дачка пастаянна сядзіць на дыетах і катэгарычна адмаўляецца есці хлеб. Я спрабую яе пераканаць, што хлеб — гэта той прадукт, які нельга цалкам выключаць з рацыёну. Дапамажыце мне знайсці аргументы на карысць хлеба...

С.К., *г. Гродна.*

Калі гаварыць пра карыснасць такога прадукту, як хлеб, то трэба заўважыць, што яна напрамую залежыць ад тэхналогіі прыгатавання хлеба. І зусім не ўсе гатункі хлеба, якіх сёння багата прадастаўлена на паліцах нашых магазінаў, трапляюць у катэгорыю «карысны прадукт». Белы хлеб многія і ўвогуле называюць імітацыяй хлеба, паколькі вельмі часта ў працэсе памолу зерне пшаніцы страчвае значную долю каштоўных харчовых рэчываў і да нас на стол трапляе рафінаваны і нават шкодны прадукт. Справа ў тым, што самыя каштоўныя ў харчовым сэнсе — гэта вотруб'е і зародышы зерня пшаніцы, якія змяшчаюць незаменныя поліненасычаныя тлустыя кіслоты, фосфаліпіды, вітаміны В, Е, мікраэлементы, клятчатку і харчовыя валокны. У зародышавай частцы зерня змяшчаюцца таксама бялок, фітаэстрагены і фітастэролы. Аднак менавіта вотруб'е і зародышы пшаніцы выдаляюцца ў працэсе памолу...

Не пашкодзіць таксама ведаць, што хлеб з мукі вышэйшых гатункаў хутка расшчапляецца ў кішэчніку да глюкозы, якая імгненна ўсмоктваецца ў кроў, павышаючы ўзровень інсуліну, а інсулін стымулюе яшчэ большы апетыт. Усё гэта прыводзіць да залішняй вагі. Але нават людзям з атлусценнем дыетолагі рэкамендуюць адмовіцца не ад хлеба ўвогуле, а толькі ад хлеба з мукі тонкага памолу. Да таго ж залішнюю вагу правакуе не сам хлеб, а традыцыі яго спажывання. Лустка хлеба з мукі грубага памолу ўтрымлівае ўсяго 70 калорый — не больш, чым яблык. Але калі намазаць яго маслам, паліць зверху варэннем, то каларыйнасць аднаго бутэрброда можа перавысіць 400 калорый.

Для нармальнага функцыянавання кішэчніка і ўвогуле арганізма чалавека яму патрабуюцца харчовыя валокны, якія ўсмоктваюць і выводзяць шкодныя рэчывы, што трапляюць разам з ежай ці ўтвараюцца ў працэсе стрававання, зніжаюць узровень халестэрыну, умацоўваюць імунітэт і спрыяюць нармалізацыі работы сардэчна-сасудзістай сістэмы. Гэта значыць, што чалавеку проста жыццёва неабходны чорны хлеб як самая даступная крыніца харчовых валокнаў. Рэчывы, што змяшчаюцца ў зерневым хлебе, з'яўляюцца эфектыўным сродкам прафілактыкі злаякасных новаўтварэнняў кішэчніка, змяншаюць рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў і зніжаюць у хворых на дыябет патрэбу ў інсуліне. Што датычыцца жытняга хлеба, то ў параўнанні з пшанічным, ён утрымлівае больш паўнавартасны бялок, у жытнім хлебе ўтрымліваецца больш клятчаткі, калію, кальцыю, жалеза, арганічных кіслот і, што немалаважна, менш вугляводаў. Жытні хлеб менш каларыйны, чым белы, ён у большай ступені ўзмацняе перыстальтыку кішэчніка, спрыяе вывядзенню з арганізма канцэрагенаў і іншых шкодных прадуктаў абмену.

Мінус гэтага хлеба — яго даволі кіслы смак, які можа выклікаць пякотку і ўздуцце кішэчніка. Таму яго не раяць спажываць людзям з павышанай кіслотнасцю страўнікавага соку. І, наадварот, пры гастрытах з паніжанай кіслотнасцю ён вельмі карысны. Вартасці чорнага і белага хлеба спалучае ў сябе хлеб з сумесі жытняй і пшанічнай мукі. Дабаўленне пшанічнай мукі змяншае кіслотную агрэсіўнасць чорнага хлеба, робіць яго больш пышным і лёгкім. Такі хлеб багаты на фосфар, калій, магній, серу, утрымлівае кальцый, натрый, крэмній, а таксама некаторыя іншыя элементы ў невялікай колькасці. Адным словам, адмаўляцца ад чорнага хлеба не варта, але не варта і забывацца на тое, што самым карысным з'яўляецца так званы цэльназерневы хлеб, хлеб з мукі грубага памолу ці з дабаўленнем вотруб'я.

ЖЫЦЬ З ЖАДАННЕМ ДАПАМАГАЦЬ?

У эпоху татальнай камп'ютарызацыі і аўтаматызацыі слова «міласэрнасць» і «дабрачыннасць» здаюцца словамі з мінулага стагоддзя. Ці многія людзі гатовыя сёння бескарысліва дапамагаць свайму блізкаму, ахвяруючы асабістым часам і інтарэсамі?..

Аднойчы на вуліцах аднаго правінцыяльнага горада з'явіўся жабрак. Ён прасіў у людзей грошы, ежу і меў адпаведны выгляд. Нягледзячы на тое, што жабрацтва — з'ява для маленькіх гарадоў абсалютна не характэрная, усе адводзілі вочы, раўнадушна праходзячы міма яго. І толькі адна дзяўчына ўбачыла ў ім жывога чалавека, які проста калісьці спатыкнуўся ў сваім жыцці. Дзякуючы ёй гэты чалавек трапіў у сацыяльны прытулак і атрымаў там не проста дапамогу, ежу, адзенне і дах над галавой, а права на нармальнае існаванне.

— Гэта быў мой не толькі прафесійны, але і чалавечы абавязак, — гаворыць старшыня Бярэзінскага раённага таварыства Чырвонага Крыжа Алена Бабура. — Шкада толькі, што сёння многія забываюць пра яго...

Дабрачыннае таварыства яшчэ зусім маладое — годам нараджэння лічыцца 2006 год. Прынцыпы яго дзейнасці не разыходзяцца з прынцыпамі рэспубліканскага таварыства: дапамога інвалідам, адзінокім састарэлым людзям, маламаёмасным сем'ям, інвалідам, выхаванцам школы-інтэрната, людзям, пазбаўленым волі, словам, сацыяльна неабароненым пластам насельніцтва. Аднак выконваць абяцанні не заўсёды ўдаецца ў поўнай меры. Хтосьці пад уздзеяннем эмацыянальнага парыву ўступае ў таварыства, а потым нават унёсці забывае плаціць. Хтосьці проста адмахваецца, маўляў, сваіх праблем хапае. Стрымлівае працу і адсутнасць уласнага рахунка таварыства, своеасаблівай «скарбонкі», дзе захоўваліся б сродкі на правядзенне мерапрыемстваў, больш маштабных акцый.

— Мала людзей, якія б душой хварэлі за гэтую справу. Некалькі актыўных чалавек мала што змогуць зрабіць, — расказвае Алена Бабура. — Добра, што нам згадзіліся дапамагаць дырэктары сельскіх школ і старшыні сельскіх Саветаў. Яны блізка знаёмыя з праблемамі сваіх аднавяскоўцаў, падначаленых. Менавіта яны перадаюць нам спісы тых людзей, якім патрабуецца наша дапамога. І яны ж бяруць на сябе транспартнае пытанне, што для нас з'яўляецца неацэннай падтрымкай з іх боку, бо свайго транспарту ў нашай арганізацыі няма. Перыядычна нам «пазычае» свой транспарт РТМА або райвыканкам.

Аднак, нягледзячы на цяжкасці ў арганізацыі работы, на гэты момант многія дзеці дзякуючы БРТЧК даведаліся, што такое нармальныя цацкі, дзясяткі сем'яў і проста адзінокіх людзей атрымалі дапамогу ў выглядзе кухоннага посуду і прадуктовых набораў, атрымалі магчымасць насіць прыстойную вопратку і добры абутак.

— Мы перыядычна даём публікацыі ў раённай газеце з заклікам людзей да ахвяравання, паведамляем даты збору рэчаў, пакідаем кантактныя тэлефоны, — працягвае старшыня БРТЧК. — Добра, што людзі адклікаюцца! Даволі часта тэлефануюць з жаданнем ахвяраваць нейкую вопратку, посуд або іншыя прадметы побыту. Тэлефануюць і людзі, якія жывуць у нястачы з просьбай аб дапамозе, жонкі і бацькі інвалідаў. Была такая акцыя — на базе раённай бібліятэкі мы раздавалі сабраныя такім чынам рэчы. Цяпер нам дапамагаюць і БРСМ, і Саюз жанчын. Частку гуманітарнай дапамогі мы перадаём у Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, бо не заўсёды здольныя ўласнымі сіламі справіцца з вялікай колькасцю «гуманітаркі». Не хапае працоўных рук...

Ёсць у таварыства і іншыя праблемы. З-за адсутнасці сваіх памяшканняў зацягваецца пытанне са стварэннем у горадзе Службы міласэрнасці.

Сёння раённая арганізацыя налічвае не больш за 400 чалавек. Па словах Алены Бабура, «няма адмысловых крытэрыяў, якія прад'яўляюцца да тых, хто хоча ўступіць у таварыства. Галоўны крытэрый — жаданне дапамагаць». На жаль, ахвотных не так і шмат. Няўжо словы «міласэрнасць» і «дабрачыннасць» хутка пяройдуць з разраду актыўнай лексікі ў разрад гістарызмаў?..

Таццяна ДАНІЛУШКІНА, студэнтка 4-га курса журфака БДУ.

Суседзі

«Невядомая Еўропа»: напачатку...

Упраўленне па фізічнай культуры і спорту Гродзенскага аблвыканкама і абласное аддзяленне грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз» дамовіліся аб супрацоўніцтве з Сувальскай палатай земляробства і турызму дзеля рэалізацыі сумеснага праекта «Невядомая Еўропа».

Адпаведны дагавор быў падпісаны ў Сувалках (Падляскае ваяводства) пры садзейнічанні Генеральнага консульства Беларусі ў Беластоку. Праект накіраваны на развіццё турыстычнай інфраструктуры польска-беларускага памежжа ў раёне Аўгустоўскага канала і ракі Нёман у рамках праграмы Тасіс. Для каардынацыі дзеянняў будзе створаны ўпраўляючы камітэт праекта ў саставе прадстаўнікоў беларускага і польскага бакоў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЧАМУ БЕЛАРУСАМ ВЫГАДНА ХВАРЭЦЬ?

Сталічныя медыкі выйшлі з прапанвоай аб змяншэнні аплаты кароткатэрміновых лісткоў працаздольнасці

Рашэнне аб устанаўленні штомесячных даплат да акладаў работнікаў установ аховы здароўя, падведамасных Мінгарвыканкаму, прыняў напрыканцы мінулага тыдня Мінгарсавет.

— Мадэрнізацыя і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы сістэмы аховы здароўя, якія актыўна вядуцца ў сталіцы апошнія гады, безумоўна, маюць вялікае значэнне, але яшчэ больш важна, хто будзе ў гэтай сістэме працаваць, — заявіў на прэс-канферэнцыі ў мэрыі **старшыня Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Дзмітрый ПІНЕВІЧ.** — Мы можам закупляць самае сучаснае абсталяванне, самую дарагую апаратуру, якія павінны працаваць практычна кругласутачна, але хто яе будзе абслугоўваць? Між іншым, кадравая сітуацыя ў горадзе вельмі складаная. У некаторых установах аховы здароўя колькасць работнікаў, якія знаходзяцца ў пенсійным узросце, перавышае 20 працэнтаў. Я заўсёды казаў, што пенсіянеры — гэта наш залаты фонд, таму што медыцына — гэта мастацтва, якое прыходзіць толькі з вопытам. Аднак хто прыйдзе ім на змену? Сёння ў горадзе проста крытычна не хапае ад 500 да 600 спецыялістаў. А ўвогуле патрэбы ў кадрах яшчэ больш высокія...

Агульнавядома, што 80 працэнтаў усіх пацыентаў распачынаюць і завяршаюць сваё лячэнне ў амбулаторна-паліклінічных установах, але менавіта першаснае звяно з'яўляецца самым слабым месцам у сталічнай сістэме аховы здароўя ў плане кадравай забяспечанасці. Мы выходзілі ў гарсавет з прапановай аб павышэнні заработных плат неаднойчы, але нам тлумачылі, што толькі матэрыяльнае стымуляванне не прынясе чаканага эфекту, калі не будзе рэалізаваны ўвесь комплекс мераў, ад якіх напрамую залежыць кадравая палітыка. Прафесійная матывацыя ўключае і магчымасці атрымання паслядыпломнай падрыхтоўкі, і інтэнсіўнасць перааснашчэння ўстаноў аховы здароўя, калі ўрач будзе «ўзброены» не адным толькі фанендаскопам. Важнае значэнне мае таксама дэбюракратызацыя і зніжэнне працоўных нагрузак. А ў нас сёння на кожнага жыхара прыпадае 12 наведванняў паліклінік у год, без уліку ведамаснай медыцыны і недзяржаўных медыцынскіх устаноў — гэта вельмі і вельмі многа. Да таго ж мы выдаём 2 млн даведак у год. З гэтым таксама трэба штосьці рабіць, і мы ўжо разглядаем шляхі магчымага вырашэння праблемы.

На думку кіраўніка сталічнай сістэмы аховы здароўя, пры дзеючай на сёння сістэме, беларусам проста выгадна хварэць, таму што седзячы дома на канапе чалавек атрымлівае сваю сярэднямесячную зарплату. Пры гэтым можна не выконваць прадпісанні ўрача, не захоўваць хатні рэжым, асабліва гэта датычыцца вострых рэспіраторных захворванняў. У немалой ступені павышэнню нагрузак на ўрачоў спрыяе і алкагалізацыя насельніцтва. У гэтай сувязі Камітэт па ахове здароўя выйшаў ва ўрад з прапановай перагледзець падставы для выдачы лісткоў непрацаздольнасці і зрабіць больш жорсткімі ўмовы знаходжання чалавека на бальнічным. «Калі чалавек і сапраўды хварэе і яму патрабуецца ложкавы рэжым, значыць, ён не павінен наведваць бібліятэкі ці іншыя грамадскія месцы, а перамяшчацца ён можа толькі з дома ў бальнічную ўстанову і назад, — патлумачыў сваю думку Дзмітрый Піневіч. — Да таго ж трэба адмовіцца ад 100-працэнтнай аплаты лістка непрацаздольнасці ў першыя 10 дзён захворвання, калі, зразумела, размова не ідзе пра цяжкія хваробы ці траўмы. Хоць, пагадзіцеся, што траўма таксама можа быць атрымана ў стадыі алкагольнага ап'янення. Толькі калі будуць задзейнічаны эканамічныя рычагі, хворы будзе імкнуцца да выздараўлення. І, наадварот, працадаўцам трэба эканамічна стымуляваць сваіх работнікаў, якія не хварэюць і не сядзяць на бальнічных. **Я хачу заўважыць, што ні ў адной заходняй краіне пацыент не дыктуе ўрачу свае ўмовы. І толькі ў нас урач прыходзіць дамоў да пацыента, а не наадварот. Прычым падставы для выкліку ўрача ў нас нічым не абмежаваныя, як і падставы для выкліку службы хуткай дапамогі. Фактычна ўрача можна выклікаць з любой нагоды».**

На меркаванні Дзмітрыя Піневіча, нельга павялічваць набор у медыцынскія навучальныя ўстановы бясконца, таму што магчымасці навучальных устаноў абмежаваныя. Да таго ж ад гэтага пацерпіць і эфектыўнасць навучальнага працэсу. Важна не тое, колькі студэнтаў выпусціць медуніверсітэт, а колькі з іх застануцца працаваць у дзяржаўнай сістэме аховы здароўя. Адна з мераў, якая будзе спрыяць замацаванню кадраў у галіне, — гэта вырашэнне жыллёвага пытання. Да канца года горад абяцае выдзеліць медыкам, якія стаяць у чарзе на паляпшэнне умоў жылля, 100 кватэр, і яшчэ каля 100 кватэр, як спадзяюцца ў камітэце, выдзеляць раённыя адміністрацыі. Яшчэ адно выйсце — прадастаўленне месцаў у інтэрнатах. Так, у наступным годзе павінна распачацца будаўніцтва ў сталіцы інтэрната сямейнага тыпу для медыцынскіх работнікаў. Да таго ж некалькі месяцаў таму было прынята рашэнне аб выдзяленні медыкам 200 месцаў у інтэрнаце ў Шабанах, які будаваўся ў 80-я гады для транспартнікаў.

Улічваючы ўвесь комплекс мераў, скіраваных на павышэнне статусу медыцынскіх работнікаў, Мінгарсавет даў нарэшце дазвол і на ўстанаўленне даплат, якія цяпер могуць аказаць асабліва эфектыўныя. У прыватнасці, урачы і сярэдні медперсанал устаноў аховы здароўя будуць атрымліваць дадаткова да акладаў дзве базавыя велічыні. Малодшы персанал — 1 базавую велічыню. Фармацэўты і правізары — 3 базавыя велічыні. Урачы хуткай медыцынскай дапамогі, участковыя ўрачы і ўрачы агульнай практыкі — 4 базавыя велічыні.

— Акрамя ўстанаўлення базавых надбавак мы пайшлі таксама на дыферэнцыяцыю надбавак. Павышаныя надбаўкі было вырашана выплачваць тым спецыялістам, якія ўносяць самы важкі ўклад у зніжэнне смяротнасці — гэта кардыёлагі і анколагі, — падкрэсліў Дзмітрый Піневіч. — У прыватнасці ад 9 да 12 базавых велічынь (у залежнасці ад катэгорыі) будуць атрымліваць дадаткова ўрачы-кардыяхірургі аддзялення рэнтгена-эндаваскулярнай хірургіі. Ва ўрачоў-кардыёлагаў гарадскога кардыядыспансэра і раённых кардыялагічных цэнтраў надбаўкі будуць складаць ад 5 да 7 базавых велічынь (5 велічынь — без катэгорыі і 7 — з катэгорыяй). Ва ўрачоў-кардыёлагаў, што працуюць у стацыянарах, наша рашэнне можа выклікаць незадаволенасць, але мы прытрымліваемся той пазіцыі, што вырашальнае значэнне для зніжэння сардэчна-сасудзістай захваральнасці маюць яе прафілактыка і дашпітальны ўзровень. На другім месцы сярод прычын смяротнасці мінчан знаходзяцца анкалагічныя захворванні (19 працэнтаў у структуры), прычым у сувязі са старэннем насельніцтва гэты паказчык будзе ў далейшым толькі расці. Анкалогія — гэта збой у імуннай сістэме, а з узростам павялічваецца і рызыка «паломак» у імуннай сістэме. Таму не абышлі ўвагай гарадскія ўлады і анкалагічную службу. Персаналу гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансэра і хоспіса ўстаноўлены наступныя даплаты: 6 базавых велічынь — урачам, 5 базавых — сярэдняму медыцынскаму персаналу і 3 базавыя велічыні — інжынерна-тэхнічнаму персаналу. Такім чынам з 1 кастрычніка даплаты да акладаў будуць атрымліваць у сталіцы 770 анколагаў, каля 100 кардыёлагаў і 1300 спецыялістаў першаснага звяна. З гарадскога бюджэту на выплату даплат сталічным медработнікам будзе выдзяляцца штогод 30,1 млрд рублёў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПАСЛУХМЯНАЯ ВАДА

Наваполацкі пяцікласнік Антон ЛЕШЧАНКА трэці год займаецца воднымі лыжамі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

ЦЯПЛО — ДЗЕЦЯМ

Мінскі гарвыканкам дазволіў з 24 верасня ўключаць ацяпленне ў дзіцячых дашкольных установах, дзіцячых сацыяльных прытулках, лячэбна-прафілактычных стацыянарах, дзіцячых дамах і ў спальных карпусах школ-інтэрнатаў.

«Кіраўнікі арганізацый уключаюць ацяпленне па ўзгодненні з арганізацыямі, якія забяспечваюць цяплом, пры наяўнасці пашпартоў гатоўнасці і на час уключэння ацяплення арганізоўваюць дзяжурства персаналу», — гаворыцца ў рашэнні Мінгарвыканкама.

Пры тэмпературы вонкавага паветра вышэй за +10 °С памяшканні павінны абагравацца ў рэжыме працеплівання, а пры стабільным павышэнні сярэднясутачнай тэмпературы павінны прымацца своечасовыя меры па адключэнні ацяплення.

Алег ПАХОЛКІН, «Мінск—Навіны».

Кватэрнае пытанне

ПРАВЫ БЫЛІ

Мне, калі не стала бацькоў, ледзь споўнілася 5, сястрычцы — 10. Нас забрала да сябе, выгадавала і паставіла на ногі бабуля. Яна — няпоўнагадовы вязень, інвалід II групы. Я жыву з ёй у яе доме. Але чуў, што сіротам выдзяляецца сацыяльнае жыллё, ільготныя крэдыты на рамонт, ёсць іншыя жыллёвыя льготы. Ці маю я на іх права, калі мне 27 гадоў?

А.В., *Слуцкі раён.*

Дзецям-сіротам, дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, асобам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, законам гарантуецца права на атрыманне ў пазачарговым парадку жылога памяшкання сацыяльнага карыстання, ільготных крэдытаў, субсідый і іншых формаў дзяржаўнай падтрымкі для будаўніцтва «рэканструкцыі) або набыцця жылога памяшкання, *калі за імі не захавалася жылое памяшканне або калі яны не могуць быць па іншых прычынах уселены ў жылое памяшканне, з якога выбылі.* Пры гэтым вызначана, што гэтыя гарантыі даюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па месцы першапачатковага набыцця статусу дзяцей-сірот або статусу дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, або па месцы іх працаўладкавання.

Падставы для набыцця і атрымання статусу дзяцей-сірот і статусу дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, вызначаны ў главе 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 21 снежня 2005 года № 73-З «Аб гарантыях па сацыяльнай абароне дзяцей-сірот, дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, а таксама асобаў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў». У артыкуле 1 гэтага Закона дадзены і вызначэнні такіх катэгорый дзяцей:

- *дзеці-сіроты* — асобы ва ўзросце да 18 гадоў, у якіх памерлі абодва або адзін з бацькоў;
- *асобы з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў,* — асобы ва ўзросце ад 18 да 23 гадоў, якія мелі да моманту дасягнення імі ўзросту 18 гадоў статус дзяцей-сірот або статус дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, або падставы для яго набыцця і затым не страцілі гэтых падстаў.

Аўтар ліста, якому 27 гадоў, не ўказвае, якія былі ў сям'і жыллёвыя ўмовы, калі ён стаў сіратой. Незразумела, ці захавалася жылое памяшканне, дзе ён пражываў разам з бацькамі і сястрой, і чаму ён пры дасягненні паўналецця не стаў на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, калі ў яго ў карыстанні або ва ўласнасці не было жылога памяшкання...

У сувязі з гэтым заяўніку неабходна звярнуцца з адпаведнымі дакументамі ў жыллёвы аддзел райвыканкама, дзе можна атрымаць адказ на свае пытанні, або напісаць яшчэ раз.

Віктар САВІЦКІ.

Ну і ну!

Спроба рэалізаваць партыю тратылу 30 кг спынена ў Віцебску

Супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю па Віцебскай вобласці ГУБАЗ МУС спынілі спробу продажу партыі тратылу 30 кг, якую жыхар Віцебска ацаніў у суму $6 тыс. Аб гэтым паведаміў начальнік аддзела абласнога ўпраўлення Яўген Сушынскі.

Мужчына быў затрыманы з доказамі злачынства ў момант рэалізацыі тратылу. Як устаноўлена праваахоўнымі органамі, выбуховае рэчыва 30-гадовы хлопец выплаўляў на працягу пэўнага перыяду часу са снарадаў і мін часоў Вялікай Айчыннай вайны, выкапаных ім у Лёзненскім і Дубровенскім раёнах. Пры гэтым ён здабываў тратыл у хатніх умовах, адзначыў Яўген Сушынскі. Пры вобыску па месцы жыхарства былі таксама знойдзены некалькі электрадэтанатараў. Першапачаткова віцябчанін, раней судзімы за аналагічнае злачынства, прапаноўваў купіць тратыл па цане 1$ за 1 г.

Падазроны арыштаваны. Яму прад'яўлена абвінавачанне па частцы 2 артыкула 295 Крымінальнага кодэкса (незаконныя дзеянні ў адносінах да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў), што прадугледжвае пакаранне аж да пазбаўлення волі на тэрмін да 7 гадоў.

БЕЛТА.

ПАСЕЕШ ПРЫВЫЧКУ...

Валянцінкай

Чужы расказ, ды пра гэта, падаўся б невыносным, свой...

У Люсьчыных планах на той травеньскі вечар нічога такога не было: ехала дамоў. Па дарозе — збіралася зайсці ў гастраном, потым — сабраць вячэру, нешта памыць-прыбраць... Карацей — штодзённшына. Да таго ж — палегчаны варыянт, бо ў адрозненне ад іншых дзён, у гэты, — ехала не з пустымі рукамі: са знаёмай вёскі «гуманітарку» прыслалі ў выглядзе масла, смятаны, тварагу... І ад шчырага сэрца. Гэта значыць, пакуль да прыпынку данесла, — рукі абарваліся. Добра, што там лаўка ёсць: прыткнула (побач з нейчымі іншымі). Думала, на хвільку, бо тралейбусы ж — касяком: падыдзе больш-менш свабодны...

Аднак прабачце, гэтым словам я буду «часціць») замест іх пад'язджалі поўныя: ну не ўбіцца з такімі сумкамі.

Люська паглядзела на іх у чарговы раз, «узважыла» ў руках і... Не мела баба клопату — побач са сваімі вандзэлкамі — убачыла яшчэ адзін — чужую жаночую сумачку...

— Э-э, чыя? — кінулася глядзець па баках, кінулася пытацца.

Марна — ніхто не адгукаўся. І ніхто нічога не бачыў...

Адно — меркаванні выказвалі многія. Кшталту — забылася нейкая варона, паехала... Зараз, нябось, спахопіцца і вернецца назад.

У надзеі на гэта (ці, дакладней, у чаканні «варон»?) марудна папоўз Люсьчын вечар — паўгадзіны, гадзіна... За яе, па самых прыблізных прыкідках, можна было заехаць да чорта на рогі і вярнуцца назад. Аднак «вароны» ўсё не было...

Іншага выйсця, як Люсьцы здалося, таксама — адкрыла сумачку, зазірнула ўнутр. Да радасці там сінеўся пашпарт. А ён, як вядома, з прозвішчам, з месцам прапіскі!

Па іх (дзякуй службе 109) Люся мігам знайшла тэлефон, тут жа набрала нумар. Раз, потым яшэ і яшчэ.

Аднак трубку на тым канцы провада ніхто не здымаў. Відавочна было, што «варону» не варта не толькі чакаць, не толькі «лавіць» па тэлефоне, але і шукаць — ехаць па месцы прапіскі: дома ж нікога няма. Сёння... Значыць, трэба ўжо заўтра?..

Але і адкладваць справу штось перашкаджала. Люся ведала, што — змесціва сумкі. У ёй — бачыла ж — ляжаў досыць вялікі (празрысты...) пакет з нейкімі паперамі-дакументамі, яшчэ адзін з лекамі, досыць пульхны кашалёк. Таму да заўтра (ну як не разумець жанчыне жанчыну?) тая, досыць сталага веку «варона» ў лепшым выпадку магла проста сплакацца...

Калі не ўжо...

Таксі да патрэбнага дома дамчала ўмомант. На званок у дзверы, як і чакала, не азваўся ніхто. Пазваніла ў суседнія. Выйшаў мужчына, сказаў, што Савічна, ну зразумела ж, ведае; а дзе яна зараз — не. Хоць здагадацца можна — у яе сяброўка ў суседнім пад'ездзе. У яе, маўляў, трэба спытаць...

Разам яны пайшлі ў той пад'езд — пабудзілі, відаць, сяброўку (дужа растрапаная была)... Але ж, што называецца, «у курсе»: з-за парога з хуткасцю АК (аўтамата Калашнікава) выдала, што тая Савічна сёння на Камароўку ездзіла, у Дом мэблі скураны мяккі вугал купляць, што колер недабраўшы, папаўзла на рынак — «намяла» гародніны, рада была, што дзве тысячы зэканоміла. А па дарозе — сумку згубіла, ці нехта скраў. Да таго ж з дакументамі — дачу афармляе... Дык цяпер, во, ходзіць галосіць, ды валяр'янку п'е, міліцыю на ногі паставіла...

— На прыпынку яе сумка была, на лаўцы. Вы ж перадасцё? — спытала ў кабеты Люся.

Тая раптам заціхла, насцярожылася, але сумку забрала, тут жа адчыніла, паглядзела ўнутр, потым на «гасцей»...

Позірк цікавы быў. Не, не здзіўлены. Не ўдзячны...

У Люсьчыным дзяцінстве, акурат з такім, прамаўлялі крылатае: «Не ўсіх дурных машынаю пабіла»...

У Люсьчыных планах на гэты панядзелак зноў нічога (ну такога...) не было — штодзённшына: на працу-дамоў. Але праз гастраном: выходзячы з дому яна звычна зазірнула ў халадзільнік (чаго б дакупіць?), потым — у кашалёк. Там паўсотні яшчэ блакітнела — значыць, грошай павінна хапіць.

Таму вечарам у краме яна спакойна прайшла паўз прылаўкі, спакойна паклала ў карзінку сыр-смятану-хлеб-малако, спакойна пастаяла ў чарзе каля касы. А ўжо там...

Мякка кажучы, ёй няёмка было. І крыўдна... Хоць і суцяшалі: калі верыць чарзе — на гэтыя граблі ці не кожны ступаў: замест тысячы аддаваў пяцьдзесят.

Аднак Люсі ад гэтага не лягчэй было...

І лягчэй! Бо потым жа ўспомніла, што цягам дня кашалёк даставала толькі аднойчы — купляла мінералку ў маленечкай крамцы.

Назаўтра (ну чым не падстава для радасці. Хоць і вельмі нядоўгай...) за прылаўкам у ёй, склаўшы рукі на грудзях, сядзела тая ж кабета.

— Прабачце, — павінілася Люся, — я ў вас брала ваду і, здаецца... Не, я не магу сцвярджаць, але вы, можа, помніце: замест тысячы я вам...

— Яшчэ чаго?! — перабіла яе прадавачка. І дадала: — Шмат вас тут ходзіць, грошы прафукаўшы... А тады да мяне... Глядзець трэба, лічыць. Я вось — трыццаць гадоў ужо... І ўчора касу «здымала» — ніякіх лішніх тысяч у ёй не было! Так што, мілачка...

Кабета, даючы зразумець, што размова закончана, «раскруціла» рукі, апёршыся імі на прылавак, стала ўставаць, паказаўшы пры гэтым... бэджык*. Прозвішча на ім здалося знаёмым... Як і імя. Але ж іх, дакладна, Люся не ўспомніла б, калі б не апошняе — імя па бацьку — Савічна.

— Вы купілі сабе мяккі вугал?! — узрадавана, як у роднай спытала яна:

— Ну-у, — здзіўлена зацягнула цётка.

Нейкі час яны разглядалі адна на адну. І напэўна аднолькава: Люся — шкадавала кабету-прадавачку, кабета — адназначна — шкадавала яе, бо яно ж і насамрэч — не ўсіх дурных машынаю пабіла.

...Пасееш прывычку — пажнеш характар. Нешта ў ім цягам жыцця, пад уздзеяннем людзей і абставінаў, можа змяніцца.

Асноўнае — застаецца нязменным.

Валянціна ДОЎНАР.

* Бэдж — нагрудны значок з указаннем прозвішча і пасады.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ЗАСТРОЙЩИКА

(з изменениями и дополнениями на 23.09.2008 года в части строительства подземного гаража-стоянки)

Сведения о застройщике:
Белорусско-английское Совместное Предприятие «Лада ОМС—Холдинг» закрытое акционерное общество (СП «Лада ОМС—Холдинг» ЗАО).

Местонахождение: г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 4Н.

Режим работы: рабочие дни — с понедельника по пятницу; рабочие часы — с 8.30. по 17.30.; обед — с 13.00. по 14.00.; выходные дни — суббота, воскресенье.

Данные о государственной регистрации: зарегистрировано Министерством иностранных дел Республики Беларусь в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 29 июня 2001 г. за № 100934617.

Сведения о проектах жилых домов, введенных в эксплуатацию за последние три года:
1. 9-этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 по улице Грушевская в городе Минске;
2. 15—17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом № 15 по улице Маяковского в городе Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки;
3. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом в районе улиц 5-я Щорса — Декабристов (планируемый срок ввода дома — 3-й квартал 2008 г.)

Лицензия на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I, II уровней ответственности и проведения инженерных изысканий для этих целей» № 02250/0264721 со сроком действия по 29.11.2009 г., выданная Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь.

Цель проекта — строительство 7-этажного 135-квартирного 5-секционного кирпичного жилого дома со встроенным подземным гаражом-стоянкой на 57 машино-мест на пересечении улиц Щорса — Разинская с привлечением денежных средств граждан, путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

Сведения об этапах и сроках реализации — жилая часть дома введена в эксплуатацию, срок окончания строительства подземного гаража-стоянки — второе полугодие 2008 г.

У Застройщика имеются: проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу «09» марта 2005 г., государственную экологическую экспертизу «20» декабря 2004 г. и утверждена решением Мингорисполкома от «08» сентября 2005 г. № 1562; разрешение на производство строительно-монтажных работ от «06» марта 2006 г. № 2-203Ж-001/06.

Местонахождение строящегося объекта: город Минск, улица Щорса, дом 3.

Цена одного машино-места в подземном гараже-стоянке: 42 240 000 белорусских рублей (по договорам долевого строительства).

Количество машино-мест в подземном гараже-стоянке, предлагаемых для заключения договоров: 27 машино-мест.

Цена одного квадратного метра общей площади жилых помещений составляет — 4 399 300 белорусских рублей на момент опубликования декларации (заключаются договора купли-продажи готовых квартир).

Данные о правах Застройщика на земельный участок: земельный участок предоставлен Застройщику решением Мингорисполкома от 08.09.2005 г. № 1562. (Государственный акт на земельный участок ГА № 0265143 от 15.11.2005 г.; Государственные акты на право временного пользования земельным участком: УД № 0009078 от 15.11.2005 г.; УД № 0009079 от 15.11.2005 г.; УД № 0009561 от 22.02.2006 г.; УД № 0009067 от 15.11.2005 г.; УД № 0009068 от 15.11.2005 г.; УД № 0009069 от 15.11.2005 г.; УД № 0009070 от 15.11.2005 г.; УД № 0009071 от 15.11.2005 г.; УД № 0009072 от 15.11.2005 г.; УД № 0009073 от 15.11.2005 г.; УД № 0009074 от 15.11.2005 г.; УД № 0009075 от 15.11.2005 г.; УД № 0009076 от 15.11.2005 г.; УД № 0009077 от 15.11.2005 г.), площадью 1.9776 га, граничит с земельными участками г. Минска.

Элементы благоустройства: создаются площадки для отдыха, занятия спортом, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому — двухслойный асфальтобетон, тротуаров — мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок — спецсмесь и плитка.

Общее имущество дольщиков — несущие, ограждающие конструкции, оборудование, элементы благоустройства и озеленения.

Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию — второе полугодие 2008 года.

Сведения о договорах строительного подряда:
Договор подряда с СУ-9 ОАО «Стройтрест-4» № 30-2007 от 24.01.2007 г. (строительство дома).
Договор подряда с ОАО Трест № 15 «Спецстрой» № 32 от 12.02.2007 г. (строительство инженерных сетей).

Условия ознакомления с информацией по проекту:
по телефонам: 219 78 22, МТС 553 46 83, Velcom 677 97 69, 609 44 78, на сайте lada.by, непосредственно в коммерческом отделе службы застройщика-заказчика СП «Лада ОМС—Холдинг» ЗАО, ул. Грушевская, 91, пом. 4Н.

УНП 100934617

Галоўны бухгалтар — раскрадальнік

Галоўны бухгалтар СВК «Гярвяты» ў Астравецкім раёне нанёс прадпрыемству ўрон на суму больш як Br85 млн. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Генеральнай пракуратуры Беларусі.

Пракуратурай Астравецкага раёна ўстаноўлена, што ў ліпені 2007 года галоўны бухгалтар гэтага СВК перавысіла свае службовыя паўнамоцтвы, наўмысна падрабіўшы подпіс кіраўніка СВК у таварна-транспартнай накладной на водпуск 28 395 слоікаў мясных кансерваў замежнаму прадпрыемству «Вілтус груп». Пры гэтым насуперак умовам дагавора яна не запатрабавала дакумент аб папярэдняй аплаце прадукцыі, а таксама даверанасць прадпрыемства на яе атрыманне.

Як высветлілася пасля, прадстаўнік замежнага прадпрыемства, які атрымліваў прадукцыю, на той час у працоўных адносінах з прадпрыемствам ужо не знаходзіўся, а копія дагавора аб куплі-продажы, прадастаўленая ў СВК, была ім падроблена. У выніку гэтых махінацый СВК «Гярвяты» быў нанесены матэрыяльны ўрон на суму больш як Br85 млн.

Згодна з прыгаворам суда Ашмянскага раёна былы галоўны бухгалтар асуджана па ч. 3 арт. 426 (перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў) Крымінальнага кодэкса Беларусі да 3 гадоў пазбаўлення волі. Прыгавор уступіў у законную сілу.

Ілжэпрадстаўнік замежнай фірмы па раней вынесеным прыгаворы асуджаны за махлярства і ў цяперашні час таксама адбывае пакаранне ў месцах пазбаўлення волі.

Уладзімір МАЦВЕЕЎ, БЕЛТА.

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже изолированного помещения – гаража № 242 в гаражном массиве «Зеленый Луг» по адресу: г. Минск, пер. Кольцова А.В, 1-ый, д. 29 (кирпичный гараж со смотровой ямой общей площадью 16,9 кв. м, инв. № 500/D-63394).

Начальная цена – 15 549 000 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 1 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **10 октября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **08 октября 2008 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефоны для справок: (017)227 48 36, 227 40 22.

УНП 190398583

ПАМЕЖНІКІ ВЫКРЫЛІ ГРУПУ КАНТРАБАНДЫСТАЎ

Брэсцкія памежнікі выкрылі групу кантрабандыстаў. Аб гэтым паведаміў начальнік прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Аляксандр Цішчанка.

«У Брэсцкім рэгіёне ў поле зроку пагранічнікаў трапіла група мясцовых жыхароў, якія прафесійна займаліся кантрабандным промыслам і подкупам службовых асобаў на беларуска-ўкраінскай мяжы. Учора затрыманы адзін з лідараў групы, а ў дачыненні да іншых удзельнікаў вырашаецца пытанне аб выбранні меры стрымання і прыцягнення да адказнасці», — паведаміў ён.

Пры вобыску па месцы жыхарства аднаго з членаў злачыннай групы быў знойдзены крымінальны арсенал: граната Ф-1 («лімонка»), 125 дробнакаліберных патронаў, форма супрацоўніка ДПС, наручнікі і радыёстанцыя. У другога ўдзельніка групы канфіскаваны камплект беларускіх і ўкраінскіх рэгістрацыйных нумарных знакаў для аўтамабіляў і буйная партыя кантрабандных тавараў: трыкатаж, джынсы, касметыка, бензапілы з камплектуючымі, электратавары. Асартымент канфіскаванага вылічваецца сотнямі найменняў.

У цяперашні час актыўна вядуцца першасныя мерапрыемствы па дакументаванні і збору доказаў, неабходных для прыняцця працэсуальнага рашэння.

Уладзімір МАЦВЕЕЎ, БЕЛТА.

г. Віцебск

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Спорт-тайм

ТЭНІСІСТЫ СУСТРЭНУЦЦА З ПЕРАМОЖЦАМ МАТЧА ПАР-МАКЕДОНІЯ

Адбылася жараб'ёўка матчаў новага сезона розыгрышу Кубка Дэвіса. Зборная Беларусі пачне выступленні з другога раўнда. Свой стартавы паядынак у першай Еўра-Афрыканскай зоне наша каманда правядзе 8—10 мая супраць пераможцы супрацьстаяння ПАР-Македонія, якое адбудзецца ў пачатку сакавіка. Раней айчынныя тэнісісты двойчы змагаліся са зборнай ПАР — у 1999 годзе ў гасцях пацярпелі паражэнне (1:4), а праз год у Мінску з такім жа лікам узялі рэванш. Са зборнай Македоніі беларусы не сустракаліся ні разу. У рэйтынгу Кубка Дэвіса наша каманда займае 25-е месца, а дружыны Македоніі і ПАР знаходзяцца ў гэтым спісе на 32-й і 42-й пазіцыях адпаведна.

АСТРОЎСКІ Ў ШАСЦЁРЦЫ ЛЕПШЫХ

Беларус Дзмітрый Астроўскі замкнуў шасцёрку лепшых еўрапейскага конкурсу «Узыходная зорка лёгкай атлетыкі-2008». Гэта лепшы вынік сярод прадстаўнікоў краін Усходняй Еўропы. За прэстыжную прэмію спрачаліся маладыя атлеты, чыё выступленне ў гэтым сезоне стала сапраўдным адкрыццём. Наш 19-гадовы скакун у даўжыню стаў сярэбраным прызёрам юніёрскага чэмпіянату свету ў польскім Быдгошчы. Тады ён паказаў вынік 7 м і 64 см. Усяго сярод мужчын на званне лепшага трэнтэндавалі 14 спартсменаў. Па выніках галасавання, у якім узялі ўдзел грамадскасць, прадстаўнікі СМІ, члены еўрапейскіх федэрацый і спецыяльная група экспертаў, роўных сабе не ведаў скакун з шастом Рафаэль Холсдэпе з Германіі. Ён устанавіў рэкорды планеты сярод юніёраў — 5 м і 68 см (у памяшканні) і 5 м і 80 см (на адкрытых пляцоўках).

СІМВАЛ ЧС-2010 — ЛЕАПАРД ЗАКУМІ

Афіцыйным сімвалам чэмпіянату свету-2010 па футболе, які пройдзе ў ПАР, аб'яўлены леапард па мянушцы Закумі. Падчас урачыстай прэзентацыі ў Йаханэсбургу сімпатычны талісман згуляў з адным з лепшых гульцоў краіны Маркам Фішам, разам з якім зборная ПАР завявала Кубак Афрыкі-1996. Арганізатары невыпадкова выбралі леапарда: у афрыканскай традыцыі гэта сімвал улады, у леапардавых скурах маюць права хадзіць толькі правадыры. Плямы Закумі маюць пяцівугольную форму, нагадваючы афарбоўку футбольнага мяча. Першыя дзве літары ў мянушцы леапарда абазначаюць абрэвіятуру Паўднёвая Афрыка на адной з 11 дзяржаўных моў — афрыкаанс. А кумі перакладаецца са шматлікіх моў Чорнага кантынента як дзесяць — год правядзення чэмпіянату свету.

ТРЭЗЭГЕ Ў МІНСКУ ТАКСАМА НЕ ЎБАЧЫМ

Акрамя варатара Буфона, які атрымаў траўму, у матчы з БАТЭ праз тыдзень не згуляе французскі нападаючы «Ювентуса» Давід Трэзэге. Форвард пашкодзіў сухажылле на правым калене ў матчы першага тура Лігі чэмпіёнаў супраць «Зеніта». Футбалісту зрабілі аперацыю, і паводле прагнозаў медыкаў, ён вернецца на поле не раней чым праз чатыры месяцы.

ЗОРНАЯ ЦЯЖАРНАСЦЬ, альбо Дзіця да лістапада

Астролагі сцвярджаюць, што зачацце дзіцяці на касмічным узроўні адбываецца значна раней за фізіялагічнае і што душа дзіцяці пачынае кантактаваць са сваімі будучымі бацькамі за 9—12 месяцаў да непасрэднага апладнення яйцаклеткі.

«ПРАДЧУВАННЕ» БАЦЬКОЎСТВА

Паводле іх шматвяковых назіранняў, любая жанчына так ці інакш адчувае касмічную інфармацыю аб будучым зачацці і нараджэнні ў яе малога. Гэта можа праяўляцца па-рознаму: у форме няясных прадчуванняў, сноў, незразумелых супадзенняў і збегу падзей (у кожнай індывідуальна). У любым выпадку ў жанчыны прыкладна за год да зачацця мяняецца ўспрыманне навакольнага свету і адчуванне сябе ў ім.

Як ні дзіўна, у гэты ж час змяняюцца і паводзіны будучага таты. У больш маладых мужчын «прадчуванне бацькоўства» праяўляецца ў павышанай узбуджальнасці, агрэсіі. У больш сталых — у лёгкім смутку і задуменнасці. Астролагі характарызуюць гэты стан як неакрэсленыя адчуванні, на фоне якіх перыядычна могуць узнікаць імгненныя «ўспышкі» выключнай яснасці ўсведамлення сябе і навакольнага свету. Эфект прыблізна такі, які бывае пасля таго, як чалавек з дрэнным зрокам надзявае акуляры і пачынае добра бачыць і блізкія, і аддаленыя прадметы. Такія «ўспышкі», як правіла, бываюць у абодвух будучых бацькоў, хоць у жанчын яны праяўляюцца з большай інтэнсіўнасцю. Таму калі пара збіраецца завесці дзіця, і ў абаіх з'явіліся апісаныя вышэй незразумелыя адчуванні і «ўспышкі», можна ў бліжэйшы год чакаць здзяйснення іх планаў.

Каб нарадзіць здаровае дзіця, будучым бацькам трэба не толькі весці здаровы лад жыцця. Неабходна прытрымлівацца пэўнай «гігіены думкі»: настроіцца на пабудову свайго жыцця ў больш аптымістычным рэчышчы, з прыўнясенням большага творчага элементу, адмовіцца ад дрэнных звычак, змяніць сваю псіхалогію, светаўспрыманне і сістэму жыццёвых прыярытэтаў з улікам хуткага з'яўлення новага члена сям'і (аднак, папярэджваюць астролагі, «зацыкліванне» на чаканай цяжарнасці не варта, каб не «прыцягнуць» негатыў). Такі падыход дазволіць зрабіць усе этапы прыходу новага чалавека ў гэты свет больш якаснымі і гарманічнымі.

— Якасны перынатальны перыяд забяспечвае якаснае нараджэнне (хуткае, без лішняга болю, траўмаў і ўскладненняў), — расказвае Уладзімір Васюк. — Адпаведна якаснае нараджэнне дзіцяці абумоўлівае якасныя першыя гады яго жыцця, захаванне здароўя, паспяховае пераадоленне ўсіх праблем і перашкод.

У астралогіі прапісаны пэўныя правілы паводзінаў будучых бацькоў перад зачаццем. Ёсць дні, спрыяльныя для апладнення, і процілеглыя ім. Для кожнай пары астролаг можа скласці індывідуальны гараскоп зачацця. Напрыклад, Яўген Йонас — гінеколаг, доктар медыцыны з Чэхіі складаў графік зачацця ў уліках становішча планет у гараскопах будучых бацькоў і дапамог многім бяздзетным парам нарадзіць дзіця. Прычым — з загадзя абранымі якасцямі і здольнасцямі. Многія жанчыны, якія лічыліся бясплоднымі, дзякуючы яго методыцы станавіліся мамамі.

Шмат увагі надавалася гэтай тэме ў сярэднявечных трактатах па астралогіі і медыцыне. Існаваў нават месяцовы каляндар зачацця, дзе былі пазначаны спрыяльныя і неспрыяльныя дні. У старажытным тыбецкім трактаце «Джуд-шы» («Дрэвы здароўя») змешчаны дасканалыя астралагічныя веды, якія дазвалялі па суаднясенні дзён цыкла канкрэтнай жанчыны са становішчам Сонца і Месяца на небе спрагназаваць — як будзе працякаць яе цяжарнасць, якімі будуць роды, хто народзіцца і як будзе развівацца дзіця ў першыя дні жыцця.

ЯШЧЭ ВА ЎЛОННІ МАЦІ ДЗІЦЯ ЎСПРЫМАЕ ЯЕ НАСТРОЙ, ДУМКІ, РЭАГУЕ НА ЯЕ ПАВОДЗІНЫ. ЯК НІ ДЗІЎНА, ПРЫКЛАДНА ТАКІМ ЖА ЧЫНАМ ПЛОД АДГУКАЕЦЦА І НА СВАЙГО ТАТУ.

Такім чынам, з пункту гледжання астралогіі, зачацце — кіраваны працэс, які (пры выкананні пэўных правілаў) дае будучым бацькам магчымасць пазбегнуць многіх праблем і ўскладненняў на фізічным, генетычным і нават на псіхалагічным узроўні развіцця іх нованароджанага.

БАЦЬКАВА РОЛЯ

...Ва ўсходніх народаў нездарма прынята плюсаваць да дня нараджэння чалавека адзін дадатковы год (чалавек лічыцца жывым з моманту яго зачацця). Яшчэ ва ўлонні маці дзіця ўспрымае яе настрой, думкі, рэагуе на яе паводзіны. Як ні дзіўна, прыкладна такім жа чынам плод адгукаецца і на свайго тату. З гэтай прычыны паводзіны будучых бацькі і маці з моманту зачацця і да народзінаў маюць вельмі важнае значэнне для іх немаўляці і ў многім мадэлююць яго лёс. Гэта трэба ведаць і адпаведным чынам скаардынаваць свае паводзіны.

РОЛЯ БУДУЧАГА ТАТЫ Ў ФАРМІРАВАННІ ЛЁСУ СВАЙГО НАШЧАДКА ВЕЛІЗАРНАЯ, ПАДКРЭСЛІВАЮЦЬ АСТРОЛАГІ. ПАВОДЗІНЫ БАЦЬКІ Ў ПЕРЫЯД ЦЯЖАРНАСЦІ ЯГО ПАРТНЁРШЫ Ў ДАЛЕЙШЫМ ПАЎПЛЫВАЮЦЬ НА ЎЗАЕМААДНОСІНЫ ДЗІЦЯЦІ З НАВАКОЛЬНЫМІ, З БЛІЗКІМІ ЛЮДЗЬМІ.

Астролагі вылучаюць перыяды, калі цяжарнай жанчыне асабліва неабходна знаходзіцца разам са сваім партнёрам, адчуваць яго падтрымку і клопат. Мужчына павінен як мага больш часу прысвячаць сваёй «палове». У пэўныя перыяды будучай маці карысна знаходзіцца на прыродзе, дыхаць свежым паветрам, любавацца прыгожымі краявідамі. Ёсць перыяды, калі з-за высокай рызыкі эмацыянальнай перагрузкі ёй непажадана кантактаваць з навакольнымі (лепш засяродзіцца на сваіх адчуваннях, на думках аб дзіцяці).

Роля будучага таты ў фарміраванні лёсу свайго нашчадка велізарная, падкрэсліваюць астролагі. Паводзіны бацькі ў перыяд цяжарнасці яго партнёршы ў далейшым паўплываюць на ўзаемаадносіны дзіцяці з навакольнымі, з блізкімі людзьмі. Напрыклад, калі будучы тата мала часу бавіў са сваёй «палавінай» у перыяд цяжарнасці на шостым і восьмым месяцах, іх дзіця на этапе першага ўкаранення ў калектыў (у 3-4 гады) будзе адчуваць няўпэўненасць, адзіноту, адарванасць ад групы. Агрэсія, злосць, якую праяўляў бацька ў адносінах да навакольных і да сваёй цяжарнай жанчыны, у будучым выльецца ў праблемы з аднагодкамі ў яго сына ці дачкі. У дзіцячым садку, у школе такое дзіця будзе праяўляць варожасць і агрэсію, астатнія дзеці будуць плаціць той жа манетай. Адносіны будучага таты да сваёй партнёршы ў перыяд яе цяжарнасці мадэлююць характар стасункаў дзіцяці са сваімі бацькамі ў больш сталым узросце. Калі дарослыя бясконца сварыліся і скандалілі на другім і трэцім месяцы развіцця плода, іх сын ці дачка ў 8—12 гадоў непазбежна сутыкнецца з праблемай «бацькоў і дзяцей».

МНОГІЯ НЮАНСЫ ПАВОДЗІНАЎ НЕМАЎЛЯЦІ Ў ПЕРШЫ ЯГО ДЗЕНЬ МОГУЦЬ РАСКАЗАЦЬ ДАСВЕДЧАНАМУ, ЯКІМ БУДЗЕ ПЕРШЫ ГОД ЖЫЦЦЯ ДЗІЦЯЦІ, ЯКІЯ МАГЧЫМЫЯ ПРАБЛЕМЫ, ХВАРОБЫ, ЯК ЛЕПШ ЯГО ВЫХОЎВАЦЬ, ЯКІМІ БУДУЦЬ СТАСУНКІ З БАЦЬКАМІ І Г.Д.

ДЗЕНЬ — ЗА ГОД

Асобае значэнне ў жыцці кожнага чалавека мае першы яго дзень жыцця, дзень, які напоўнены глыбокім сакральным сэнсам.

У першы свой дзень на Зямлі нованароджаны надзвычай адчувальны да ўплыву навакольнага асяроддзя, таму ў старажытнасці ў гэты дзень яго строга абаранялі ад любога знешняга ўздзеяння. Пакідалі толькі з маці і жрацом, які старанна фіксаваў асаблівасці паводзінаў малога, запісваў усе нюансы. Гэта дазваляла на ранніх этапах выявіць магчымыя праблемы са здароўем, схільнасці да захворванняў, прыроджаныя парушэнні.

З пункту гледжання астралогіі, у першы дзень дзіця пражывае свой першы сімвалічны цыкл (абарачэнне Зямлі вакол сваёй восі). А з улікам таго, што ўсе астралагічныя цыклы падпарадкоўваюцца прынцыпу аналогіі, дзень можна суаднесці з годам. Многія нюансы паводзінаў немаўляці ў першы яго дзень могуць расказаць дасведчанаму, якім будзе першы год жыцця дзіцяці, якія магчымыя праблемы, хваробы, як лепш яго выхоўваць, якімі будуць стасункі з бацькамі і г.д.

У славян быў цікавы звычай: у першы дзень нованароджанаму прачыталі спіс імёнаў, якія яму падыходзілі, і па яго рэакцыі меркавалі, якое імя выбраць.

Другі, трэці дзень пасля нараджэння і так да канца першага месяца можна суаднесці з годам жыцця чалавека (другім, трэцім і так да 30).

Кожны дзень адпавядае аднаму году. Усю гэтую інфармацыю пажадана запісваць, бо аслаблівасці паводзінаў дзіцяці ў першы месяц могуць даць ключ да падзей, якія надарацца з ім у далейшым. Астролагі сцвярджаюць, што лёс чалавека да 30 гадоў можна прадказаць па яго першым месяцы жыцця. Напрыклад, неяк у Сібіры, на сёмы дзень навяспечаны бацька забіраў з радзільнага дома жонку і дзіця. Усё, як трэба — з сябрамі, на двух санях, зранку «пад мухай». Пакуль ехалі дамоў, працягвалі адзначаць народзіны. Раптам схамянуліся — дзіцяці няма! Згубілі па дарозе. Дарослыя і не заўважылі, як спавіты клунак скаціўся з саней. Давялося вяртацца назад. А тут бура ўзнімаецца. Ледзь адшукалі дзяўчынку ў снезе... Яно быццам бы і нічога, але калі малой ішоў сёмы год, яна ледзь не ўтапілася ў рацэ. Паехала з сябрамі купацца, нырнула і ледзь не загінула.

Яшчэ адзін прыклад: у прысутнасці немаўляці, якому было 24 дні, навяспечаныя бацькі моцна пасварыліся. Пасварыліся і забыліся. Прайшоў час, а калі сыну споўнілася 24 гады, у яго ўзніклі вельмі напружаныя адносіны з начальствам, процістаянне вылілася ў канфлікт, які завяршыўся звальненнем.

Такім чынам, ведаючы падзеі, якія надарыліся з чалавекам у першы месяц жыцця, можна спрагназаваць яго далейшы лёс да 30 гадоў. Каб зазірнуць крыху далей — пасля 30, трэба ведаць асаблівасці яго жыцця на працягу першага года пасля нараджэння. Астролагі раяць маладым бацькам у першыя месяцы весці спецыяльны дзённік паводзінаў свайго дзіцяці. Гэта дапаможа потым скласці прагноз лёсу іх нашчадка і скарэктаваць некаторыя непрыемныя моманты.

Інга МІНДАЛЁВА.

Азія — кантынент самагубцаў?

Жудасную статыстыку самагубстваў прыводзіць Сусветная арганізацыя аховы здароўя.

За апошнія пяцьдзесят гадоў іх колькасць у свеце ўзрасла на 60 працэнтаў. У сярэднім штогод амаль мільён мужчын і жанчын па розных прычынах зводзяць рахункі з уласным жыццём. Усё больш самагубцаў рэгіструецца сярод маладых людзей, што выклікае асаблівую трывогу ў ААН. Павышаны рост самагубстваў апошнім часам быў зарэгістраваны ў Азіі. На долю ўсяго трох краін — Кітая, Індыі і Японіі прыпадае чатыры з дзесяці самагубстваў. Калі на Захадзе самагубцамі становяцца 90 працэнтаў людзей, якія пакутавалі ад цяжкіх псіхічных хваробаў, то ў Азіі такіх менш за палову. Там на шлях самагубства становяцца па іншых прычынах: празмерна частыя стрэсы і канфлікты, вострыя праблемы і г. д. Сусветная арганізацыя аховы здароўя заклікае да больш шырокага разумення тых складаных праблем, якія падштурхоўваюць чалавека да небяспечнага рашэння пайсці з жыцця. І тым самым садзейнічаць спыненню хвалі самагубстваў. Бо такую смерць можна папярэдзіць агульнымі намаганнямі. Сусветная арганізацыя аховы здароўя лічыць, што гэтаму моцна замінае існуючае ў многіх краінах табу на адкрытае абмеркаванне дадзенай праблемы. А тым часам у свеце колькасць самагубстваў ужо перабольшвае агульную штогадовую колькасць ахвяраў усіх войнаў, тэрарыстычных актаў і крымінальных забойстваў.

Леанід ТУГАРЫН.

Сусед забіў суседа

25-гадовы жыхар дома па вуліцы Герояў абароны Брэсцкай крэпасці абласнога цэнтра напіўся і літаральна забіў да смерці рукамі і нагамі 26-гадовага жыхара такога ж дома. А іх равеснікі на гэтым месцы больш за паўвеку таму дэманстравалі мужнасць і гераізм...

Яна СВЕТАВА.

КАЗАХІ ЛЮБЯЦЬ ЧЫРВАНАСКУРУЮ СКАРЛЕТ

Каля 300 тон бульбы гатунку «Рэд Скарлет» адгрузіў КСУП камбінат «Усход» фірме, якая займаецца пастаўкамі гародніны на продаж насельніцтву ў Рэспубліку Казахстан. Гэта першы вопыт работы сельгаспрадпрыемства на рынак азіяцкай краіны.

Прадстаўнік пакупніка таварыства «АБКА» Васіль Занудзенка кажа, што перш чым канчаткова вызначыцца з пастаўшчыком агародніны, яны аб'ехалі некалькі прадпрыемстваў. Глядзелі, як вырошчваецца бульба непасрэдна на полі, як апрацоўваецца пасля. Ацаніўшы ўсе характарыстыкі беларускай прадукцыі, прыйшлі да рашэння працаваць менавіта з камбінатам «Усход». Якасць бульбы, на погляд прадстаўніка фірмы, адпавядае патрабаванням казахскага рынку. Для Казахстана вельмі важны тавараны выгляд прадукту. «Мы хочам купіць столькі, колькі паспеем вывезці да маразоў, — гаворыць Васіль Занудзенка, — плануем тры тысячы тон. Гэта буйная здзелка. Мы паспрабавалі вашу «чырвоную» бульбу і на густ — яна куды лепей, чым, напрыклад, іспанскія гатункі, якія, да таго ж, перапоўненыя хіміяй. Гэта ўсё натуральнае, тое, што трэба».

Сёлета гаспадарка, якая традыцыйна забяспечвае плодаагароднінай прадукцыяй гамяльчан, плануе прадаць у краіны блізкага замежжа чвэрць вырашчанай прадукцыі. Большую частку — у Расійскую Федэрацыю. Партыю буракоў сёлета прадалі ва Украіну. Між іншым, тут працуюць не толькі з традыцыйнымі культурамі — бульбай, цыбуляй, буракамі і морквай. Сярод нетрадыцыйных — баклажаны, сельдэрэй, кінза, розныя віды капусты: брокалі, кваяістая, савойская, кальраві.

В. АЎРАМЕНКА.

У Мінску з'явіцца прафесійны цэнтр моды

Першы ў краіне прафесійны гандлёвы цэнтр моды будзе пабудаваны ў Мінску. Гэта ўнікальны камерцыйны праект, аналага якому на сёння ў Беларусі няма.

Як паведамілі аўтары праекта, цэнтр, які будуецца, адпавядае ўсім патрабаванням фармату «Grand Fashion Mall». Там будзе дэманстрацыйная зала для паказаў, галерэя буцікоў, убудаваны двухузроўневы паркінг, офісныя памяшканні, пункты харчаванQня і забаў і шмат чаго іншага. Гандлёвы цэнтр моды запраектаваны ў форме атрыума: зверху данізу ўнутры будзе пустая прастора, а па баках — гандлёвыя галерэі. Будаўніцтва цэнтра, агульная плошча якога складзе каля 15 тысяч квадратных метраў, вядзецца на скрыжаванні вуліцы Кальварыйскай і Тучынскага завулка. Здаць аб'ект у эксплуатацыю плануецца ў другой палове 2010 года.

Вікторыя ГУЛЬКО, «Мінск—Навіны».

Транспартная філасофія

ЯК Я ПРАВЯЛА ДЗЕНЬ БЕЗ АЎТО

22 верасня ў Беларусі ўпершыню быў аб'яўлены Днём без аўтамабіля. Яго асноўная мэта — паляпшэнне экалагічнай сітуацыі. У Мінпрыроды падлічылі, што калі пяць працэнтаў мінскіх жыхароў падтрымаюць акцыю, сталіца зэканоміць 300 мільёнаў рублёў. Нават міністры ў гэты дзень пайшлі на работу пешшу.

Я не езджу на ўласным аўто, але не ўзяць удзелу ў акцыі не магла. Таму ў гэты дзень адмовілася ад аўтобусаў, маршрутак і таксі. Іх выхлапныя газы нічым не саступаюць выкідам прыватных аўто. Больш за тое, я вырашыла зэканоміць электраэнергію ў краіне і адмовілася ад паездак на тралейбусах. Адзіны від транспарту, якім не змагла ахвяраваць, гэта метро.

ШЛЯХ У СЕМ ПРЫПЫНКАЎ

Да метро мне сем аўтобусных прыпынкаў. Падлічыла час, апранулася цяплей і рушыла. Некаторыя СМІ абяцалі, што сёння на маршруты выйдзе больш тралейбусаў і трамваяў, а вось ад аўтобусаў «Мінсктранс» адмовіцца. Падманулі. Мяне абганяюць звыклыя зялёныя МАЗы.

Я так старалася не забыць пра пальчаткі і каптурык, што забылася на асноўны атрыбут цяперашняга надвор'я — парасон. Пасля трох прыпынкаў пешшу мяне дагнаў дождж. Схавалася пад дахам прыпынку, але гарэзлівыя кроплі дасталі мяне і там. Час ідзе. Куды ты дзенешся — прыйдзецца пад'ехаць. Дачакалася тралейбуса (хоць маю праязны на аўтобус, я катэгарычна ігнарую гэты від транспарту). Праехала два прыпынкі, дождж скончыўся так жа раптоўна, як і пачаўся. Непахісная перад спакусай даехаць да канца, я выйшла з тралейбуса.

Аказваецца, на маім шляху ёсць цудоўная алея. Штораніцы без асаблівай асалоды я праязджаю яе і нават не здагадваюся, як прыемна лавіць лісце, што пад ногі кідае восень; як цікава гуляць у квач з ветрам; як шчасліва ўсміхацца прахожым, якія гэтак жа, як і я, асцярожна крочаць з прыўзнятай галавой, любуючыся пакуль яшчэ скупаватым золатам восені. І быццам не бывае транспарту на гэтым маршруце! Усе ідуць праз алею. І яны, здаецца, даўно ўжо адкрылі для сябе гэтую дарогу. Яны вітаюцца з кожным дрэўцам, яны ведаюць кожны пагорак. А міма праязджаюць пустыя тралейбусы з вялікімі вадзіцелямі: ім не трэба ўтрамбоўваць пасажыраў, зашчымліваць у дзвярах чарговую сумку.

А вось і метро. Я прыйшла так хутка, быццам станцыя сама ішла мне насустрач.

СУСТРЭЧА Ў ПАДАРУНАК

Выйсці на Кастрычніцкай і яшчэ два прыпынкі пад'ехаць на аўтобусе, вой, прагуляцца пешшу. Я іду той дарогай, якой апошні раз гуляла ўвесну. Нават сонейка пазнала мяне і радасна ўсміхнулася, як у той шчодры сонечны дзень. Спынілася на месце, паглядзела ў бліскучую рэчку. Восень пакрыўдзілася на мае ўспаміны пра вясну і пачала сыпаць лісце ў ваду. У галінках каштана заблукаў паветраны шарык. І раптам — знаёмы твар. Валера! Як даўно мы не бачыліся! І, напэўна, не ўбачыліся б яшчэ столькі, калі б я не пайшла сёння пешшу. Гэта восень ці вясна падарыла мне сустрэчу? <...>

Вось і скончыўся працоўны дзень

Я стамілася, але прагулка да метро павінна развеяць. З жахам назіраю, як складаюцца ў шпроты пасажыры аўтобусаў, як з крыўдай праводзяць аўтобус тыя, хто не змог уціснуцца і чакае наступнага, у які, магчыма, ім пашчасціць прасунуцца паміж сумак. Добра, што я не там. Няспешна крочу па праспекце і ем марожанае.

<...> Выйшла з метро і накіравалася да ўжо знаёмай алеі. А пасля алеі ёсць яблыневы сад, луг, узлесак... Па дарозе я патэлефанавала ўсім сябрам, з якімі даўно не было часу пагаварыць. Назбірала рамонкаў. (Дык і я думала, што ўжо няма! Пакуль не пайшла пешшу.) Я навучылася скарачаць шлях праз двары і паспела адпачыць ад работы, пакуль прыйшла дадому.

Праз год на Дзень без аўто арганізатары акцыі плануюць выдзяліць пешаходную вуліцу. А я не буду чакаць год. Наступны панядзелак зноў аб'яўляю Днём без транспарту. Далучайцеся!

Таццяна САЛДАЦЕНКА

ЗА ДАРОГУ ПЕШШУ

- адкрыцці (алеі, рамонкаў);
- асалода (пагуляць у квач з ветрам, убачыць сонца ў вадзе і шарык у галінках);
- нечаканая сустрэча са старымі знаёмымі;
- марожанае;
- тэлефонныя званкі без лішніх вушэй;
- не шчаміцца і не чакаць наступнага аўтобуса;
- зэканоміць час, не пераходзячы двойчы дарогу да прыпынка;
- падтрымаць фізічную форму, асабліва тым, у каго сядзячая праца;
- развеяцца пасля работы;
- палепшыць экалагічную сітуацыю і зэканоміць дзяржаўны бюджэт!

СУПРАЦЬ ДАРОГІ ПЕШШУ

- прачнуцца і выйсці раней;
- ёсць верагоднасць змерзнуць (выпраўляецца цёплым адзеннем і хуткім рухам);
- можна трапіць пад дождж (выпраўляецца парасонам і дажджавіком);
- стомленасць ад прагулак на далёкія адлегласці (выпраўляецца асэнсаваннем ідэі!)

Фестывалі

«ЗАМАХНУЦЦА НА ВІЛЬЯМА НАШАГА ШЭКСПІРА»

Герой Яўгена Еўсцігнеева ў фільме «Сцеражыся аўтамабіля» марыў паставіць «Гамлета» брытанскага класіка. Але ў Мінску ёсць актыўныя людзі, якія вырашылі арганізаваць цэлы фестываль «Глядзім Шэкспіра», але самым дзіўным з'яўляецца тое, што «Белгазпрамбанк» вырашыў стаць спонсарам і падтрымаў гэтую падзею.

Драматургія Шэкспіра моцна паўплывала на тэатральны фестывальны рух ва ўсім свеце. Фестывалі ў яго гонар адбываюцца на радзіме драматурга, ды і ў іншых краінах іх дастаткова для таго, каб творы Шэкспіра не гублялі сваёй папулярнасці, а самыя знакамітыя рэжысёры не імкнуліся прадставіць сваё прачытанне самых розных трагедый і камедый аўтара. І вельмі паспяхова... Напрыклад, культавы літоўскі рэжысёр Эймунтас Някрошус свайго «Атэла», пастаўленага ў Вільнюскім тэатры «Мена фортас» паказваў у самых розных краінах. Гэта проста цуд, што выпала шчасце паглядзець яго ў Беларусі — 26 верасня на сцэне Дома афіцэраў. Праўда, для многіх аматараў тэатра гэтае шчасце чыста тэарэтычнае: білетаў у касах няма. Што тут скажаш: мы разумеем, што значыць добра. І вось жа літоўская мова, на якой будзе пастаўлены спектакль, нікога не бянтэжыць. А з другога боку: хто не ведае гісторыю пра раўнівага маўра Атэла?

Зрэшты, хто не патрапіць на спектакль славутага літоўскага рэжысёра, можа суцешыцца, паглядзеўшы «Макбета», які ў Купалаўскім тэатры паставіў яшчэ адзін літовец і вучань Някрошуса Альгердас Латэнас. Ды і ўвогуле пастаноўкі паводле Шэкспіра ў беларускіх тэатрах з'яўляюцца даволі часта. Яшчэ адна патрапіла ў праграму фестывалю — «Утаймаванне свавольніцы» тэатра імя Горкага ў пастаноўцы Валянціны Ераньковай. Ужо сам факт, што беларускія тэатры стаяць у адной праграме з пастаноўкамі грандаў сцэны, даволі красамоўны. Ды і само імя Шэкспіра сведчыць пра жаданне бачыць у Беларусі тэатр Еўрапейскага ўзроўню.

Калі ласка, яшчэ адзін спектакль, яшчэ адно сусветнае імя: балгарскі рэжысёр Аляксандр Морфаў паставіў у санкт-пецярбургскім тэатры імя Камісаржэўскай камедыю «Сон у летнюю ноч». І так можна казаць пра кожнага з удзельнікаў гэтага Міжнароднага тэатральнага фестывалю, які адкрывае магчымасць убачыць добрыя гучныя пастаноўкі. Патрэба ў іх ёсць, калі меркаваць па глядацкім попыту. Ці паспрабуюць гэта выкарыстаць беларускія тэатры, якім пасля пабачанага трэба будзе паразважаць пра тое, чым і як яны збіраюцца здзіўляць родную публіку?

Ларыса ЦІМОШЫК.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-5

Працягваем гэты класіфікацыйны конкурс заданнем № 6 — камбінацыйнай мініяцюрай нашага чытача з Гомеля Леаніда Вітошкіна:



БЕЛЫЯ: a5, c1, e5, f4, g1, h2 (6). ЧОРНЫЯ: b4, b6, c3, c7, d4, f8 (6). Выйгрыш.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рубрыка «Шашкі».

Разгледзьце таксама і такую задумку гросмайстра і трохразовага чэмпіёна СССР Л. Вітошкіна, але ўжо ў рамках нашага бліца-41/1:



БЕЛЫЯ: b2, d4, e1, e3, h6 (5). ЧОРНЫЯ: b6, c3, c5, h2 (4). Таксама перамога белых.

Пераможцу бліца чакае сюрпрыз ад Анатоля Пярхальскага (Глыбокае) — яго зборнік звяздоўскай рубрыкі «Шашкі» за 2006 год у афармленні мясцовага «ФОТА-цэнтра».

Па-за конкурсам аўтар прапануе вашай увазе наступныя канцоўкі:



№ 1. БЕЛЫЯ: 16, 23, 31, 32, 43 (5). ЧОРНЫЯ: 7, 24, 28, 34 (4). 11, 2 (30) 35 (31) 49 (39) 34 (37) 32, 29x.

№ 2. БЕЛЫЯ: b6, d6, e1, e7, f6, g5 (6). ЧОРНЫЯ: a7, b4, c5, d4, f8, g3, h2 (7). g7, d8, d:a3, g3, f2x.

№ 3. БЕЛЫЯ: a7, f4, дамка f8 (3). ЧОРНЫЯ: a3, b4, g7, h6 (4). Пашукайце перавагу за белых самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

НОВЫ І ДАКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ

Дзмітрый Камчыцкі з Магілёва даслаў свой эцюд, які ўдзельнічаў у Рэспубліканскім конкурсе-18 (2006 год):

БЕЛЫЯ: c1, дамкі g3, h2 (3). ЧОРНЫЯ: b4, c5, d2, d4, e3, g7 (6). e1 (dc3 A) g1 (d4) b2, h8 (d2) gd4, e1 (a3) c3x. A (bc3) f4!, e3, e1x.

Быў апублікаваны падобны эцюд Пятра Шклудава (Наваполацк):

БЕЛЫЯ: c1, дамкі e1, h2 (3). ЧОРНЫЯ: a5, c3, d2, d4, e3, g7 (6). g1 (b4 A) b2, h8 і далей, як у Д. Камчыцкага. Але ж A (f6) b2, h8 (d2) gd4, e1x — новы варыянт, прычым дакладны.

Д. Камчыцкі прапануе і свой твор на 100-клетачнай дошцы:

БЕЛЫЯ: 19, 20, 21, 23, 24, 27, 30, 31, 32, 41, 42 (11). ЧОРНЫЯ: 7, 8, 9, 12, 15, 16, 17, 28, 35, 39, 40, 43, 45 (13).

22 (29) 4 (35:13 A) 35, 50x. A (15:13) 35, 50x.

З ЧЭМПІЯНАТУ ЕЎРОПЫ

Аб яго выніках мы паведамілі ў мінулым выпуску. Сёння паказваем фрагмент партыі гэтага спаборніцтва: БЕЛЫЯ (Р. Варык): 27, 28, 30, 34, 35, 36, 38, 39, 43, 46, 47, 49 (12). ЧОРНЫЯ (Я. Ватуцін): 2, 3, 9, 12, 13, 15, 16, 17, 18, 19, 24, 25 (12).

Тут чорныя падрыхтавалі камбінацыю: 1. ... 2-8! з пагрозай 2. ... 18-22 3. ... 8-12 4. ... 13:44 5. ... 24-29 і 6/ ... 25:45x. Белыя яе заўважылі і пайшлі 2. 39-33, аднак пазіцыйнае становішча іх ужо не магло выратаваць: 2. ... 9-14 3. 49-44 24-29!x.

Нагадваем, што наш міжнародны гросмайстар Яўген Ватуцін набраў 12 ачкоў і падзяліў 2—5 месцы, але па дадатковых паказчыках не здолеў увайсці ў першую тройку прызёраў.

СТАЛІЧНАЯ МОЛАДЗЬ ІГНАРУЕ ПРАФТЭХАДУКАЦЫЮ?

Даволі складана два апошнія гады запаўняюцца месцы ў многіх сталічных прафесійна-тэхнічных навучальных установах. Адна з прычын — дэмаграфічны спад. Другая — скіраванасць моладзі на атрыманне вышэйшай адукацыі. Так, па дадзеных Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, сёлета 74,4 працэнта выпускнікоў сталічных школ працягнулі навучанне ў ВНУ. Да таго ж адыграла сваю ролю і вяртанне школы да 11-годкі, дзякуючы якому ў выпускнікоў базавай школы з'явілася магчымасць усяго праз год атрымаць атэстат аб сярэдняй адукацыі.

Для таго, каб даць прафтэхустановам магчымасць поўнасцю ўкамплектавацца, тэрміны прыёму дакументаў ад абітурыентаў былі падоўжаны ў сталіцы да 15 верасня. А пераважнай формай конкурснага адбору быў конкурс адзнак, указаных у дакументе аб адукацыі.

— Аднак, нягледзячы на падаўжэнне тэрмінаў прыёму дакументаў ад абітурыентаў, сталічныя прафтэхустановы змаглі ўкамплектавацца толькі на 94 працэнты ад запланаванага, — паведаміла журналісту «Звязды» начальнік аддзела прафесійна-тэхнічнай адукацыі Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Алена ЧАРНЫХ. — З прафтэхустаноў, дзе рыхтуюць кадры для будаўнічай галіны, цалкам удалося ўкамплектавацца толькі ПТВ № 31 мантажных і спецыяльных будаўнічых работ. Нагадаю, што кантрольныя лічбы набору на будаўнічыя прафесіі былі павялічаны сёлета на 200 чалавек.

Да таго ж мы прынялі ў сталічныя прафтэхустановы вялікую колькасць іншагародніх навучэнцаў — 2459 чалавек, што складае 36,6 працэнта ад агульнай колькасці залічаных. Прафесійна-тэхнічную адукацыю ў сталічных установах адукацыі будуць атрымліваць 200 сірот, 44 навучэнцы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і 23 чалавекі з парушэннямі слыху.

З добрымі вынікамі на «фінішную прамую» прыёмнай кампаніі змаглі выйсці прафтэхустановы сферы абслугоўвання, чыгуначнага транспарту, электронікі, гандлю, кулінарыі і паліграфіі. А на некаторых спецыяльнасцях, такіх, як «аператар сувязі», «кантралёр аддзялення банка», «цырульнік» нават сфарміраваліся конкурсы і, адпаведна, вельмі высокія прахадныя балы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА. *г. Вілейка.*

Дапамога на нарыхтоўку

Амаль 300 тысяч мінчан атрымаюць аднаразовую грашовую дапамогу ў памеры 105 тысяч рублёў на нарыхтоўку сельскагаспадарчай прадукцыі. На гэтыя мэты Мінгарвыканкам выдзеліў 31,5 мільярда рублёў.

Як паведаміла намеснік старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароны Мінгарвыканкама Святлана Літвінка, аднаразовую грашовую дапамогу на нарыхтоўку сельгаспрадукцыі атрымаюць асобныя катэгорыі непрацуючых жыхароў Мінска, за выключэннем асобаў, якія знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні. Выплачвацца аднаразовая грашовая дапамога будзе ў кастрычніку адначасова з выплатай пенсіі па месцы яе атрымання.

Надзея ІЛЬЯШУК, *«Мінск—Навіны».*

ШКОЛЬНІКІ ДАПАМАГЛІ ЗАТРЫМАЦЬ ПАРУШАЛЬНІКА

Да старэйшых школьнікаў з вёскі Прылукі Брэсцкага раёна падышоў незнаёмы і спытаў, у якім месцы лепей перайсці мяжу. Аліна Умрыхіна і два яе аднакласнікі спрацавалі амаль прафесійна. Хлопцы «загаварылі» незнаёмца. А дзяўчына паведаміла на заставу. Памежнікі прыбылі хутка і падазронага затрымалі. Ім аказаўся раней судзімы грамадзянін Узбекістана, які доўгі час жыў у Маскве.

Яна СВЕТАВА.

Народная энцыклапедыя

Вясельнае застолле: ДЫК «ГОРКА» ЦІ СОЛАДКА?

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 23 верасня.)

Публічнае цалаванне

Сёння даволі цяжка вызначыць тую эпоху або той дакладны час, калі ў структуры вясельнага абраду ўзнікла такое выключнае па сваёй эмацыянальнай афарбоўцы рытуальнае дзеянне, як публічнае цалаванне жаніха і нявесты. Звычайна яно суправаджаецца аглушальным заклікам гасцей, якія разам скандзіруюць «Горка!». І вось якраз пад гэты калектыўны імператыў-загад жаніх і нявеста павінны ўстаць з-за стала і некалькі разоў пацалаваць адно аднаго.

У адным з тамоў серыі «Беларуская народная творчасць», прысвечаным апісанню вясельнага абраду, знаходзім наступную спробу патлумачыць сутнасць абрадавай дзеі: «Каханне маладых было асновай добрага настрою ўсіх гасцей. Гэта падкрэслівалася звычаем крычаць «горка», пасля чаго жаніх і нявеста павінны былі даказаць усім прысутным адданасць адно аднаму». (Вяселле. Абрад, с. 23).

Зразумела, што тлумачэнне мае, хутчэй, апісальны характар, чым тлумачальны. А што ж усё-такі стаіць за тым рытуальным дзеяннем, калі жаніха і нявесту літаральна прымушаюць цалаваць адно аднаго ў прысутнасці ўсёй радзіны і аднавяскоўцаў? Магчыма, гэта не што іншае, як далёкія водгукі тых архаічных абрадаў, калі хлопец выкрадаў дзяўчыну ў суседняга племені і тут жа пазбаўляў яе цнатлівасці, каб ні яна, ні сваякі затым не пярэчылі стварэнню новай сям'і.

За вясельным сталом пацалунак паміж жаніхом і нявестай адбываўся на вачах усёй радзіны, прычым пад яе прымусам і, што вельмі цікава, калі маладыя стануць нейкім чынам пярэчыць калектыўнаму патрабаванню, то гэта нязгода можа атрымаць катэгарычную негатыўную ацэнку. Магчыма, калектыўнае падбухторванне на пацалунак было знакам таго, што юнак і дзяўчына пераходзілі ў дарослае жыццё, якое вымагала зусім іншага характару і ўзроўню адносінаў паміж мужчынам і жанчынай. У дадзеным выпадку ўдзельнікі святочнага застолля станавіліся свайго роду настаўнікамі моладзі ў іх першых крокаў сумеснага жыцця. Яшчэ раз у сувязі з гэтым нагадаем, што за вясельны стол не дапускалася тая моладзь, якая не прайшла абрад ініцыяцыі і не атрымала права на стварэнне сям'і.

Не баючыся перабольшанняў, можна сцвярджаць, што вясельныя пацалункі — гэта старажытны народны звычай. Аднак у рытуальных дзеяннях, якія адбываюцца ў храме ў час вянчання, яны не прадугледжаны. Але пачынаючы з 1917 года, яны вельмі паспяхова былі ўключаны ў цырыманію рэгістрацыі шлюбу ў ЗАГСах. Цалавацца, што называецца «на вачах у грамады» стала навамоднай традыцыяй, запазычанай з класічнага вясельнага абраду.

І ўсё ж давайце яшчэ раз зірнём на агульную паслядоўнасць вясельнага абраду канца XIX — пачатку XX стагоддзяў. Пасля даволі «цнатлівага» вянчання пачыналася вясельнае застолле, падчас якога першыя тры чаркі выпіваліся (без асаблівых эмацыянальных узлётаў) за радаводныя карані маладых. Гэта была свайго роду падзяка продкам і адначасова прэзентацыя тых, хто бярэ на сябе адказансць працягваць радавод. І толькі пасля рытуальнага дыялогу з продкамі ўвага прысутных пераключалася на жаніха і нявесту, прычым пераключэнне мела ўзрыўны характар. Адны эмоцыі змяняліся іншымі: зварот да продкаў — цікі, удзячны, уважаны; зварот да маладых — спакуса, эратызм, гарэзлівасць.

Ускосным доказам таго, што пацалункі на вяселлі — гэта абрадавае пасвячэнне ў дарослае жыццё, можа служыць рытуальнае дзеянне, якое зрэдку яшчэ сустракаецца на нашых сучасных вяселлях. Госці настойліва заклікаюць жаніха і нявесту пацалавацца, а тым часам шаферка — бліжэйшая сяброўка нявесты — імкнецца «адкупіцца» ад гасцей цукеркамі, раскідаючы іх у розныя бакі.

Кожнае новае пакаленне людзей дапаўняла сэнс ключавых рытуальных дзеянняў сваім разуменнем. У цяперашні час на некаторых вяселлях можна пачуць сакраментальнае пажаданне, якое мае прамое дачыненне да разглядаемай праблемы: «Няхай толькі сёння жаніху і нявесце будзе горка, а ўсё астатняе жыццё — соладка». Пры гэтым госці дадаюць: чым больш разоў прагучыць слова «горка», тым лепшым будзе жыццё новай сям'і. Магчыма, і ў гэтым пераасэнсаванні ёсць пэўная доля праўды.

Разам з тым людзі сталага веку прапаноўваюць некалькі іншую трактоўку зместу рытуальнага заклінання «Горка!». Каб зразумець сакральна-магічны аспект гэтага тлумачэння, нам зноў спатрэбіцца звярнуцца да шэрагу тыпалагічна блізкіх абрадавых сітуацый. Давайце яшчэ раз узгадаем пачатак заручынаў, калі нечаканыя госці з'яўліся на парозе хаты будучай нявесты і завялі іншасказальны дыялог, каб, крый Божа, не сурочыць запланаваную акцыю. Хрэсьбіны нованароджанага, як правіла, імкнуліся прымеркаваць да саракавога дня. А да таго часу немаўля называлі незвычайным імем — Багданька — г.зн. дадзены Богам (параўнайце: адно з найбольш пашыраных сярод украінцаў імя — Багдан). Ідэальнай лічыцца сітуацыя, калі чалавек мае два імені: храмавае, духоўнае, якое не павінен ведаць нікто, акрамя хросных бацькоў і святара, а таксама свецкае імя або вулічную мянушку, якое, па перакананні біяэнергетыкаў і знаўцаў народнай традыцыі, не можа быць транслятарам шкоднага ўздзеяння на чалавека. А ўзгадайце, як мы паводзім сябе тады, калі першы раз наведваем парадзіху і яе дзіця? Баючыся сурочыць немаўля, мы тройчы плюнем праз левае плячо, а затым тройчы прамовім загадзя лжывую, але амаль абавязковую і ўсім зразумелую ў дадзеным кантэксце формулу-зман: «Цьфу! Які ж ты гідкі, непрыгожы, плюгавы!» Гэты прынцып міжасабовых стасункаў захоўваецца і ў сучасным жыцці соцыума. Мы не хочам гаварыць пра свае блізкія планы, каб не разбурыць задуманае. Калі ў нас пытаюцца пра наша матэрыяльнае становішча, мы сціпла заўважаем: «На хлеб з маслам хапае».

Усе ўзгаданыя сітуатыўныя кантэксты даюць нам нечаканую падказку і дапамагаюць расшыфраваць сэнс пажадання «Горка» ў структуры вясельнага абраду: маладым сапраўды жадалі сямейнага дабрабыту, узаемапаразумення і салодкіх пацалункаў, але каб збераглі іх ад людской зайздрасці і жадання нашкодзіць, крычалі зусім іншае, каб збіць нячыстую сілу з панталыку.

Даць душы волю, а таленту прастор

Знаёмства з этнаграфічнымі даследаваннямі XIX—XX стст., у якіх падаецца апісанне беларускага вясельнага рытуалу, сведчаць аб тым, што на нашых «вяселлях» на самай справе пераважала весялосць, прыўзняты настрой, імправізаваныя жарты, якія дапаўняліся прыпеўкамі непрыкрытага эратычнага характару. Святочны настрой залежаў не ад колькасці выпітага моцнага напою, а, хутчэй, якраз наадварот, яго строга абмежаванай колькасці. У «Могилевских губернских ведомостях» за 1856 г. прыводзяцца надзвычай павучальныя і паказальныя звесткі. Аўтар аднаго з артыкулаў, прысвечанага апісанню мясцовага вяселля, незадаволена заўважае: беларусы празмерную ўвагу надаюць выпіванню моцных напояў — за тры дні вяселля ўсёй вёскай яны выпілі «аж тры літры самагонкі!». Калі мы сёння расказваем аб гэтых нотках незадаволення нашым слухачам, то яны шчыра здзіўляюцца пачутаму, пры гэтым заўважаюць: аўтар, відаць, не дапісаў некалькіх важных слоў: «Па тры літры на кожнага!» Так, яшчэ ў пазамінулым стагоддзі, калі людзі дакладна ведалі, дзеля чаго яны прыйшлі на вяселле, асноўнае месца ў іх паводзінах займалі спевы і танцы, а на апошнім была спакуса падняць кілішак за маладых.

Аснову вясельнай фальклорнай традыцыі гэтага перыяду складалі песні, якія суправаджалі абрадавыя дзеянні «пасагу». Пасля таго, як маладых тройчы па сонцы абвядуць вакол стала, пачыналі спяваць «пасаг» — «бласлаўленне або заклацце, якому надавалі асаблівае значэнне і без якога ні шлюбу, ні вяселля не прызнавалі»:

Як сцякалі дзві рэчанькі,
Тож обідві быстрысенькі!
Як зайшоўся місяц з сонцам,
Тож абое яснэсенькі
Да й абідва маладзенькі.
Першы пасаг з-пад місяца,
Другій пасаг з-пад сонейка.
З-пад місяца маладый жэнішок,
З-пад сонэнька малада дзівонька.

«Пасаг» спявалі доўга, да ўсіх родных і людзей добрых, кожны раз паўтараючы яго спачатку. Пасля «пасагу» падавалі частаванне...» (Беларусы. Сям'я, с. 280).

Вясельныя песні, якія спявалі ў адрас маладой, можна падзяліць на некалькі груп. На першае месца мэтазгодна паставіць вуснапаэтычныя творы, прысвечаныя роду дзяўчыны, яе бацькам, якія паставалі-гадавалі дзіця:

— Малада дзевачка,
якая ты харошая!
Ці не сонца цябе радзіла,
Ці не месяц цябе гадаваў,
Ці не ветры цябе калыхалі,
Ці не зоркі цябе забаўлялі?

Часцей за ўсё нявесту параўноўвалі з кветкай, якая цешыць вока сваім харастом у веснавую пару:

Не мак цвіціць, не руковы
цвяточак —
А расцвіла ўся Галінчына
галоўка...

А які глыбокі жыццёвы сэнс пакладзены ў аснову песень, адрасаваных жаніху! Услухайцеся, задумайцеся, паразважайце над тым, якога бяздоннага багацця мы пазбавілі нашы сучасныя гарадскія вяселлі:

Маладзенькі Ванечка,
Умеў жонку выбіраці,
Умеў жонку выбіраці —
Умей яе шанаваці:
Каб босая не хадзіла,
Каб лапцікаў не насіла,
Часта ў госцейкі хадзіла.
Не карай яе дубцом,
Карай шчырым слаўцом.
Яна дубца не баіцца —
Шчыру слоўцу пакарыцца.

Высокім паэтычным сэнсам былі напоўнены творы, адрасаваныя адначасова абодвум маладым. Іх глыбокі сімвалізм дае права лічыць іх актуальнымі і ў нашы дні і друкаваць на запрашальніках, якія маладыя дасылаюць сваёй радзіне напярэдадні сваёй урачыстасці:

У нас сёння
нядзелечка-васкрасенне,
Зачынаецца таццянчына вяселле.
Піва з мёдам зліваецца —
на піцці,
Пара людзей злучаецца —
на жыццё.
Піва з мёдам зліваецца —
піць будуць,
Пара людзей злучаецца —
жыць будуць.

Корпус беларускай вясельнай паэзіі — адзін з самых прадстаўнічых жанраў ва ўсім традыцыйным фальклоры. Песеннае спаборніцтва магло доўжыцца не адну гадзіну. Часта яно перапынялася заклікамі музыкаў да танцаў. А гэта быў чарговы этап творчага спаборніцтва. Гармонік, дуда, скрыпка, цымбалы і бубен маглі «падняць мёртвага».Танцы на вясковым вяселлі немагчыма параўнаць ні з чым. Гэта несупынная экспрэсія, моцны выплеск станоўчай энергіі, фантастычны конкурс-спаборніцтва, падчас якога сямейныя пары або проста пары аднавяскоўцаў дэманстравалі не толькі адчуванне рытму, валоданне сваім целам, але і адчуванне партнёра, павагу да яго. Адзін танец мог доўжыцца амаль гадзіну, калі ўжо, здавалася, не было сілаў ні ў танцораў, ні ў музыкаў. Але аб гэтым больш падрабязна гаворка пойдзе далей.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Погляд

Навошта ствараць глебу для махінацый?

Маючыя адбыцца выбары ў парламент усё больш прыцягваюць да сябе ўвагу грамадскасці. Безумоўна, найбольш зацікаўленыя тут асобы — самі кандыдаты ў дэпутаты і палітычныя сілы, інтарэсы якіх яны прадстаўляюць. Парадокс заключаецца ў тым, што далёка не для ўсіх канчатковай мэтай з'яўляецца запаветны значок на лацкане. Маю на ўвазе прадстаўнікоў апазіцыі, якія ўжо колькі гадоў запар на зразумелых прычынах кіруюцца выключна алімпійскім прынцыпам наконт не перамогі, а ўдзелу. Удзелу менавіта ў перадвыбарнай кампаніі. Прычым складваецца ўражанне, што кожныя наступныя выбары не ўспрымаюцца імі як магчымасць узяць рэванш за папярэднія правалы. Як правіла, усё зводзіцца да актыўнага і як мага больш гучнага пошуку прычын, чаму і на гэты раз носьбітам заходняй дэмакратыі не ўдалося атрымаць крэдыт даверу беларусаў і заняць тое ці іншае крэсла.

Не новы, але праверан часам лейтматыў кожных выбараў любога ўзроўню — «недэмакратычнае» выбарчае заканадаўства. Як ні дзіўна, нехта дагэтуль свята верыць, што падгані Беларусь закон аб выбарах пад заходні шаблон, як «апошнія стануць першымі». Пра тое, што і «за бугром», і нават за акіянам з выбарчым правам не ўсё так гладка, айчынныя апазіцыянеры стараюцца памоўчваць. У аснову ставіцца, вядома ж, меркаванне «аўтарытэтных» міжнародных арганізацый.

Давайце бліжэй прыгледзімся да некаторых рэкамендацый замежных дабрадзеяў. Напрыклад, да рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ «стварыць агульнанацыянальны цэнтралізаваны рэестр выбаршчыкаў з прысваеннем кожнаму выбаршчыку асабістага ідэнтыфікацыйнага нумара». «Рэестр павінен весціся і абнаўляцца рэгулярна і на працяглай аснове, а не непасрэдна перад кожнымі выбарамі... Варта публічна паведамляць аб змяненнях у спісе выбаршчыкаў, якія адбыліся паміж часам прадастаўлення спісаў ва ўчастковыя выбарчыя камісіі і днём выбараў», — раіла Бюро па выніках парламенцкіх выбараў у Беларусі 2004 года.

Як вядома, цяпер у Беларусі спісы выбаршчыкаў складаюцца па кожным асобным ўчастку для галасавання і прадастаўляюцца выбаршчыкам за 15 дзён да выбараў. Пры гэтым кожны грамадзянін мае час і магчымасць абскардзіць неўключэнне, няправільнае ўключэнне ў спіс ці выключэнне са спісу, а таксама дапушчаныя ў спісе недакладнасці ў звестках аб сабе. У чым жа крамола? Няўжо адзіны спіс выбаршчыкаў — гэта дэмакратычна, а спісы па ўчастках ці па рэгіёнах — не? У такім выпадку давядзецца прызнаць неадпаведнымі «высокім стандартам» выбарчыя сістэмы Францыі, Германіі, ЗША, дзе справы ідуць прыкладна так, як і ў Беларусі.

Ды і ўвогуле, увядзенне адзінага пастаяннага спіса — гэта, хутчэй, выключэнне. І справа не толькі ў тэхнічных складанасцях і фінансавых выдатках. Непазбежным спадарожнікам падобнай арганізацыі выбарчага працэсу з'яўляюцца розныя роду юрыдычныя казусы, якія могуць істотна сказіць волевыяўленне выбаршчыкаў. Справа ў тым, што інфармацыя пра выбаршчыкаў, як бы пільна яна ні адсочвалася і аператыўна ні абнаўлялася, усё адно адстае ад жыцця. Нехта памёр, нехта пераехаў у іншы горад... І калі адпаведныя карэктывы не ўнесці ў спіс да выбараў, то аддаць свой голас за таго ці іншага кандыдата атрымліваюць магчымасць не толькі людзі, якія ўжо пражываюць у іншай мясцовасці, але і сапраўдныя «мёртвыя душы». Гэта, на жаль, адбываецца нават там, дзе адзіныя спісы для асобных рэгіёнаў, не кажучы ўжо пра краіны, у якіх вядзецца адзіны агульнанацыянальны спіс выбаршчыкаў.

Прыкладаў больш чым дастаткова. Так, напрыканцы 1990-х Францыю ўскалыхнула справа аб «фальшывых выбаршчыках» у трэцяй акрузе Парыжа, у выніку якой пад суд ледзь не трапіў экс-прэзідэнт Францыі Жак Шырак. Як высветлілася, у 1989 і 1995 гадах члены партыі «Аб'яднанне ў абарону Рэспублікі» — кіраўнікі парыжскай мэрыі займаліся выбарчымі махінацыямі з мэтай забяспечыць свайму шэфу патрэбны ўзровень падтрымкі ў сталіцы. Для гэтага ў «праблемныя» акругі завозіліся «правільныя» выбаршчыкі з іншых месцаў, а ў іх картачках выбаршчыкаў указваліся фіктыўныя адрасы. Паколькі спісы ў Францыі вядуцца на пастаяннай аснове і абнаўляюцца раз на год, а не падчас выбарчай кампаніі, то адсачыць пераезд групы выбаршчыкаў у другую акругу аказалася немагчымым.

Аднак махінацыі з інфармацыяй аб месцы жыхарства — даўно адпрацаваная на Захадзе тэхналогія. У ЗША нават існуе спецыяльны тэрмін — «джэрымендзерынг». Куды больш цікава і актыўна вядзецца работа з «мёртвымі выбаршчыкамі». Кожная такая «душа» — гэта пусты бюлетэнь, у які можна ўпісаць усё, што заўгодна. Дарэчы, і на гэтай ніве ЗША — наперадзе планеты ўсёй. Як стала вядома ў ходзе правядзення прэзідэнцкіх выбараў 2004 года, любы амерыканец, які паспеў адправіць выбарчы бюлетэнь па пошце да сваёй смерці, лічыцца паўнапраўным выбаршчыкам. Напрыклад, падчас той кампаніі ў Фларыдзе датэрмінова прагаласавалі больш за 1,8 млн грамадзян, большасць з якіх састарэлыя і хворыя людзі. Калі ўлічыць, што, паводле афіцыйных звестак, у штаце штодзень памірае 455 чалавек, а вынік выбараў у Фларыдзе ў 2000 годзе быў вырашаны ўсяго 537 галасамі, эксперты лічаць, што бюлетэні «мёртвых душ» мелі важнае значэнне ў барацьбе за крэсла ў Белым доме.

Нешта падобнае адзначаецца і ў наваспечаных дэмакратыях. Так, у 2003 годзе Віктар Юшчанка скардзіўся, што ў спіскі выбаршчыкаў унесена каля 1,5 млн (!) «мёртвых душ». У той час гэты факт з поспехам быў выкарыстаны для аспрэчвання афіцыйных вынікаў выбараў. А вось ужо летась, калі пры натуральным змяншэнні насельніцтва назіральнікі выявілі ў цэлым шэрагу абласцей павелічэнне агульнай колькасці выбаршчыкаў на 10—15 працэнтаў, «памяранцавы» лідар прамаўчаў...

І ўсё ж да заакіянскіх настаўнікаў маладым дэмакратыям яшчэ далёка. Нават уявіць нельга, каб украінцы так бліскуча перамаглі здаровы сэнс, як гэта зрабілі жыхары Тэхаса падчас выбараў у 2006 годзе. У той кампаніі прадстаўніца Рэспубліканскай партыі Гленда Даўсан з вялікім адрывам апярэдзіла на выбарах свайго апанента-рэспубліканца. І гэта нягледзячы на тое, што яна памерла... за два месяцы да галасавання!

Аказваецца, рэспубліканцы вырашылі працягнуць яе перадвыбарную кампанію, «каб не ўпусціць пераваг перад сапернікам». Пасля яе пасмяротнай перамогі справа засталася за малым — правесці спецыяльную працэдуру па замене «мёртвай душы» на жывога рэспубліканца.

Відавочна, што ўвядзенне адзінага цэнтралізаванага рэестра выбаршчыкаў не зможа моцна паўплываць на дэмакратызацыю выбарчага працэсу ў Беларусі. Некаторая ўніфікацыя і цэнтралізацыя інфармацыі аб насельніцтве, у тым ліку і ў мэтах уліку выбаршчыкаў, будзе праведзена ў адпаведнасці з нядаўна прынятым Законам «Аб рэгістрацыі насельніцтва». Аднак рэгістр наўрад ці калі-небудзь заменіць спісы выбаршчыкаў, якія аператыўна ствараюцца на месцах. Куды больш важным з'яўляецца выкананне патрабаванняў заканадаўства ўсімі ўдзельнікамі выбарчай кампаніі. У тым ліку кандыдатамі, ініцыятыўнымі групамі, назіральнікамі і членамі выбаркамаў, вылучанымі апазіцыйнымі аб'яднаннямі і партыямі.

Уладзімір АЛЯКСАНДРАЎ.

Информация о намечаемых на сентябрь 2008 года аукционах по продаже неиспользуемых объектов государственной собственности

Дата проведения	Местоположение недвижимого имущества (район, адрес, наименование землепользователя)	Наименование объекта продажи (существующее использование) и его общая площадь	Продавец	Место проведения аукциона (наименование территориального фонда государственного имущества, адрес, контактный телефон)
30.09.2008	г. Лепель, Минское шоссе, 14а	Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-12014 (здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения (здание спортзала))	Лепельский районный исполнительный комитет	Фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, тел. 47 60 96
30.09.2008	Могилевская область, Бобруйский район, Гороховский с/с, д. Петровичи, ул. Шоссейная, 2	Здание комплексного приемного пункта одноэтажное, площадью 108,4 кв.м, фундамент бетонный; стены кирпичные; крыша совмещенная	Бобруйское унитарное коммунальное предприятие «Райбытуслуги»	Фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62; тел. (80222) 22 33 75, 31 11 85, 31 12 16, 22 90 22
30.09.2008	Могилевская область, Бобруйский район, Брожский с/с, п. Редкий Рог, ул. Советская, 18а	Здание рукавичного цеха одноэтажное, площадью 175,7 кв.м; фундамент бетонный; стены кирпичные; крыша шиферная	Бобруйское унитарное коммунальное предприятие «Райбытуслуги»	Фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62; тел. (80222) 22 33 75, 31 11 85, 31 12 16, 22 90 22
30.09.2008	Могилевская область, Бобруйский район, Брожский с/с, п. Редкий Рог, ул. Советская, 18б	Здание рукавичного цеха одноэтажное, площадью 206,2 кв.м; фундамент бетонный; стены кирпичные; крыша совмещенная, рулонная	Бобруйское унитарное коммунальное предприятие «Райбытуслуги»	Фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62; тел. (80222) 22 33 75, 31 11 85, 31 12 16, 22 90 22
30.09.2008	Могилевская область, Бобруйский район, Ковалевский с/совет, д. Ламбово, ул. Юбилейная, д. 15	Здание дома быта одноэтажное, площадью 111,2 кв.м; фундамент бетонный; стены кирпичные; крыша совмещенная, рулонная	Бобруйское унитарное коммунальное предприятие «Райбытуслуги»	Фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62; тел. (80222) 22 33 75, 31 11 85, 31 12 16, 22 90 22
30.09.2008	Могилевская область, Бобруйский район, Вишневский с/с, д. Стасевка, ул. Фрунзенская, 15б	Здание комплексного приемного пункта одноэтажное, площадью 108,0 кв.м, фундамент бетонный; стены кирпичные; крыша совмещенная	Бобруйское унитарное коммунальное предприятие «Райбытуслуги»	Фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62; тел. (80222) 22 33 75, 31 11 85, 31 12 16, 22 90 22
30.09.2008	Могилевская область, Бобруйский район, Оссовский с/с, д. Дойничево, ул. Центральная, 4	Здание нежилое одноэтажное, площадью 400,9 кв.м; фундамент бетонный; стены кирпичные; крыша шиферная; сарай площадью 47,7 кв.м; забор решетчатый на бетонных и кирпичных столбах площадью 444 кв.м; мощение асфальтовое площадью 9 кв.м	Отдел образования Бобруйского районного исполнительного комитета	Фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62; тел. (80222) 22 33 75, 31 11 85, 31 12 16, 22 90 22
30.09.2008	г. Могилев, Гомельское шоссе, д. 55а	Цех по приготовлению клеев с пристройкой к цеху по приготовлению клеев — двухэтажное здание общей площадью 903,1 кв.м, асфальтобетонное покрытие площадью 360 кв.м; цементно-бетонное покрытие площадью 633 кв.м; забор кирпичный высотой 1,60 кв.м площадью 194 кв.м; ворота металлические площадью 6 кв.м; калитка металлическая площадью 1,8 кв.м; навес площадью 25 кв.м, крыша шиферная; тепловые сети протяженностью 30,5 кв.м; электрические сети подземные протяженностью 308,5 кв.м; канализационные сети протяженностью 228,5 кв.м; водопроводные сети протяженностью 67 кв.м; основное технологическое оборудование	Могилевское унитарное коммунальное предприятие пошива и ремонта обуви	Фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62; тел. (80222) 22 33 75, 31 11 85, 31 12 16, 22 90 22
30.09.2008	Могилевская область, Кировский р-н, Любоничский с/с, д. Любоничи, ул. Спортивная, 5а	Здание котельной с дымовой трубой — одноэтажное здание площадью 207,5 кв.м, стены кирпичные, железобетонные панели, фундамент бетонный, кровля совмещенная; водопроводные сети протяженностью 127 м; электрические сети протяженностью 180 м	Кировское унитарное коммунальное предприятие «Жилкомхоз»	Фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62; тел. (80222) 22 33 75, 31 11 85, 31 12 16, 22 90 22
30.09.2008	г.п. Октябрьский, ул. Янки Купалы, 15	Капитальное строение (магазин 4), общей площадью 276,2 кв.м	РУП «Калинковичиводстрой»	Фонд «Гомельоблимущество», г. Гомель, пр. Ленина, 3, тел. 70 38 49, 70 36 43
30.09.2008	Ельский район, г. Ельск, Мозырский тракт	Здание столовой, общей площадью 307,5 кв.м	РУП «Калинковичиводстрой»	Фонд «Гомельоблимущество», г. Гомель, пр. Ленина, 3, тел. 70 38 49, 70 36 43
30.09.2008	Ельский район, г. Ельск, Мозырский тракт	Здание бывшей конторы, общей площадью 163,0 кв.м	РУП «Калинковичиводстрой»	Фонд «Гомельоблимущество», г. Гомель, пр. Ленина, 3, тел. 70 38 49, 70 36 43
30.09.2008	Ивацевичский р-н, д. Алексейки, ул. Центральная, 36	Здание школы, сарай	Стайковский сельисполком	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 23 42 06
30.09.2008	Ивацевичский р-н, д. Южевичи, ул. Депутатская, 17	Здание школы	Стайковский сельисполком	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 23 42 06
30.09.2008	г. Дрогичин, ул. Октябрьская, 34	Здание трикотажного цеха	КУП по ОУ «Дрогичинский КБО»	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 23 42 06
30.09.2008	Кобринский р-н, д. Завершье (бывший в/г 19)	Здание хранилища 9	КУМПП ЖКХ «Кобринское ЖКХ»	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 23 42 06
30.09.2008	Столинский р-н, д. Видибор, ул. Заводская, 1	Административное здание, склад, заправочная станция, мастерские, котельная	УО «Столинский государственный профессиональный лицей с/х производства»	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 23 42 06
30.09.2008	Воложинский р-н, д. Раков	Производственно-складское здание — 613,3 кв.м, производственно-складское здание — 158,3 кв.м.	Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «НПО «Центр»	Фонд «Минскоблгосимущество», г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09
26.09.2008	Докшицкий район, Докшицкий сельсовет, д. Барсуки, ул. Школьная, д. 6Б	Неиспользуемое здание турбазы, общая площадь 277,3 кв.м	Докшицкий районный исполнительный комитет	Фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, тел. 47 60 96
26.09.2008	Ивановский р-н, д. Стрельно, ул. Советская, 7а	Здание прачечной	Сочивковский сельисполком	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 23 42 06
26.09.2008	Брестская область, Ивановский р-н, д. Радовня, ул. Школьная, 2а	Здание клуба	Крытышинский сельисполком	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 23 42 06
26.09.2008	Брестская область, Ивановский р-н, д. Замошье, ул. Победы, 3	Здание школы с сооружениями	Дружиловичский сельисполком	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 23 42 06
26.09.2008	Брестская область, Ивановский р-н, д. Кротово, ул. Центральная, 57/3	Здание школы с сооружениями	Достоевский сельисполком	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 23 42 06
26.09.2008	Ивановский р-н, д. Красиевка, ул. Советская, 1	Здание школы с сооружениями	Достоевский сельисполком	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 23 42 06
26.09.2008	Ивановский р-н, д. Якша, ул. Шевченко, 3	Здание школы с сооружениями		Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 23 42 06

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (20 верасня). Па гарызанталі: Града. Гарбата. Аброк. Сход. «Рэал». Скат. Бык. Тара. Стол. Сын. Каліф. Смага. Опт. Жар. Абак. Бант. Акт. Цыбуля. Слава. Харбін. Штаб. Накаўт. Кана. Дума. Агарак. Аск. Квота. Рыс. Лета. Анамастыка. **Па вертыкалі:** Капуста. Пласт. Брэст. Клад. Табу. Сажа. Морква. Крыга. Цана. Алах. Нарды. Апора. Борт. Бакас. Тын. Гардэ. Краса. Аўт. Кіл. Яхта. Елка. Аборка. Бульба. Бар. Ангіна. Бурак. Факт. Накрыўка.

Сканворд (23 верасня). Па гарызанталі: Шаўчэнка. Цырата. Валік. Вёска. Апока. Доказ. Лаза. Эстрада. Клапан. Сана. Гапак. Маліна. Статар. Цар. Рота. Аправа. Апал. Твэн. Кіп. Гарыла. Краса. Увага. Шок. Круча. Вісла. Антрацыт. **Па вертыкалі:** Хемінгуэй. Ксеракопія. Ветка. Арава. Патоп. Смала. Атака. Каралі. Вада. Пушкін. Этыка. Ворс. Люкс. Акула. Крагі. Чан. Казка. Ангара. Май. Карп. Колас. Рур. Капаніца. Фазан. Навал. Анафара. Артыст.

Дзённік бландзінкі

ПРАМОЎЛЕНАЕ

— Вам што, падабаецца эсэізм?

Спытаўся ў мяне пару гадоў таму вядомы літаратуразнаўца. І, прызнацца, паставіў у тупік... Тады мне здавалася ненармальнай падазронасць постсавецкай літаратурнай навукі да жанру эсэ, хоць, магчыма, яна і мела пад сабой глебу... Свабоднае выяўленне думкі, нязмушаная плынь развагаў, выяўленне творчай індывідуальнасці — можа, яны і сапраўды неслі пагрозу кананічнаму мысленню? Аднак сёння згадваю даўняе пытанне калегі і думаю, што баяўся ён, відавочна, іншага...

Напрыклад, таго, што ў літаратуры з прышэсцем павальнага эсэізму знікнуць героі і фабулы... Чужыя цытаты паглынуць уласна-аўтарскія думкі... З тэкстаў выпарацца дынамізм і структура... А адзіным, бясконца дубляваным сюжэтам стануць прыгоды самой культуры, а не чалавечыя лёсы. Знікне тое, чаго, сапраўды, так не хапае сённяшняй літаратуры для таго, каб у яе з'явіўся не толькі адмысловы, элітарны чытач, але і шараговы, масавы...

І ўсё ж я люблю эсэ як своеасаблівы тып мастацкага мыслення. Існуе дастаткова тэмаў, якія проста вымагаюць няспешнай гаворкі, спакойнага, лірычнага тону, аднолькавай увагі да кожнага згаданага аб'екта. Напрыклад — гісторыя мастацтва. Размова пра яе, на мой погляд, павінна адпавядаць экскурсійнай, няспешнай прагулцы па музейных залах у кампаніі гідэрудыта...

Калі вам хочацца пабыць у кампаніі такога разумнага, дасведчанага чалавека, абавязкова знайдзіце ў краме кнігу Сяргея Харэўскага «Прамоўленае», якая раскажа вам пра беларускае мастацтва больш, чым любы сучасны падручнік.

ДЗЕНЬ НАРОДЗІНАЎ

Неяк прачытала ў энцыклапедыі, што большасць дзяцей нараджаецца вясной. Такім чынам, тэорыя пра буслоў, якія ўвесну прыносяць у дзюбках дзетак, мае пад сабой падставы. Зноў жа, лёгка пралічыць, што і ад купальскай ночы праходзіць прыкладна дзевяць месяцаў... Але што цікава, што вясновы масавы прыход адбываецца ва ўсім свеце, незалежна ад паўшар'я і звычаяў. Энцыклапедыя паведамляла, што прычыны гэтай з'явы невядомыя...

А мне вось цікава, па якім такім законе перад кожным маім днём народзінаў, тыдні за два, у мяне пачынаюцца непрыемнасці? Быццам бы нябесная канцылярыя згадвае пра мяне і дадае тое, чаго не набрала за год. Гэта адбываецца з такой рэгулярнасцю, што аднойчы прыняла рашэнне не святкаваць дзень народзінаў у той дзень, які прапісаны ў маім пашпарце, а правадзіць яго так, як мне хочацца... І шчыра кажучы, гэта адно з самых мудрых і дарослых маіх рашэнняў за жыццё — не паддавацца на ўгаворы і пагрозы сяброў і сваякоў, і прымаць іх тады, калі мне зручна, а не калі ім хочацца.

ЗБІРАННЕ ЖАЛУДОЎ

Адкуль яно — гэтае неперадольнае жаданне збіраць жалуды і каштаны?

Чаму мяне так цягне да гэтых гладкіх, бліскучых шарыкаў-цыліндрыкаў? Нешта генетычнае? Ці прывітае азбукай, дзе была старонка, прысвечаная каштанава-жалудовым цацкам? Ці гэта выхавальніца дзіцячага садка падарыла мне думку, што гэта самыя каштоўныя рэчы на свеце. Не ведаю.... Але як толькі бачу каштан ці жалуд — цягну ў кішэню!

Вось і гэтая бабулька-збіральніца, якую сустрэла каля Батанічнага саду, пэўна не ведае, нашто яны ёй. Але кланяецца кожнаму...

ПРА ЦЫМЕС

Прыехаў знаёмы з Ізраіля. Зайшлі ў краму па торцік.

Ён: «Глядзі,»Цымес»!

Я: «Ведаю!»

Ён: «Ты не разумееш... Цымес у Мінску... Вы мне ніхто не паверыць! Давай купім! Не ўяўляю, каб такое было 10 гадоў таму!»

Я: «Саша, у нас і рыба фаршыраваная паўсюль ляжыць... І каўбаса «Яўрэйская» за 19 баксаў кіло. Хочаш — купім?»

Ён: «Ты не разумееш!»

Вось чаго я сапраўды не разумею, дык гэтай раптоўнай любові да яўрэйскай культуры, якая пачалася чамусьці толькі цяпер, калі і яўрэяў у краіне амаль не засталося!

Нядаўна расказалі, як у правінцыйным школьным музеі экскурсавод паказала залу, прысвечаную Халакосту, і радасна прадставіла: «А гэта нашы яўрэі!» Зноў гета, толькі музейнае.

Не ведаю, што больш засмучае, антысемітызм ці такі постфактумны сувенірна-таргашаўскі прагматызм некаторых беларусаў.

БАРАЦЬБА З ХОЛАДАМ

Сапраўдная жанчына тая, у доме якой заўсёды пахне кветкамі і пірагамі...

Цяпер пяку не столькі для таго, каб з'есці, колькі каб сагрэцца. Бо колькі ні ўключай абагравальнікі, пачуццё камфорту не наступае. А вось толькі запахне яблычным пірагом — мозг дае целу каманду «Цёпла!»

Ганна КІСЛІЦЫНА.

Прэт-а-партэ ў акварыуме

На мінулым тыдні ў Сіднеі адбыўся першы ў гісторыі падводны паказ моды — Cosmopolitan Neutrogena Underwater Fashion Show. Шоу адбылося ў рамках мерапрыемства «30 дзён моды і прыгажосці». Арганізатары размясцілі ў цэнтры горада каля гістарычнага будынка Customs House рэзервуар з вадой даўжынёй 10 метраў, які выкарыстоўваўся ў якасці по-

дыума. Вада была нагрэтая да +23 °С. У паказе ўзялі ўдзел дзевяць мадэляў-валанцёраў, сярод якіх былі заўважаныя аўстралійскія тэлевізійныя вядучыя і акцёры. Пасля таго, як добраахвотнікі пагрузіліся ў празрысты акварыум з вадой, іх задачай было паспрабаваць пазіраваць і дэманстраваць адзенне гледачам, якія сабраліся на плошчы. Варта адзначыць, што аўстралійскі часопіс Cosmopolitan раней ужо адрозніваўся падобнымі экстраардынарнымі і відовішчнымі шоу. Напрыклад, на сіднэйскім пляжы Bondi пры падтрымцы і арганізацыі Cosmopolitan, 1010 дзяўчат устанавілі сусветны рэкорд на самую вялікую колькасць дзяўчын у бікіні на адной фатаграфіі.

ФУТБОЛ ПАЧНЕЦЦА РАНЕЙ

26 верасня тэлеканал «ЛАД» пакажа матч чэмпіянату Кантынентальнай хакейнай лігі ЦСКА (Масква) — «Дынама» (Мінск) у прамым эфіры. Такім чынам, трансляцыя, раней заяўленая ў праграме ў 22.10, пачнецца ў 18.40.

У сувязі з гэтым у праграме адбудуцца і іншыя змяненні. Так, паказ праграмы «Навіны культуры» адмяняецца. «Калыханка» выйдзе ў 21.05, «Тэлебарометр» — у 21.24, «Экспедыцыя» — у 21.25. Чарговы эпізод серыяла «Справа была ў Гаўрылаўцы-2» гледачы ўбачаць у 21.30, паказ серыяла «Анатомія Грэй» (ЗША) пераносіцца на 00.05.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.01	19.00	11.59
Віцебск —	6.50	18.50	12.00
Магілёў —	6.51	18.50	11.59
Гомель —	6.47	18.47	12.00
Гродна —	7.16	19.16	12.00
Брэст —	7.17	19.16	11.59

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Дзмітрыя, Сямёна, Фёдара, Юльяна.*
К. *Амеліі, Аўрэліі, Святаполка, Сяргея, Уладзіслава.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА +14..+16°С	КІЕЎ +14..+16°С	РЫГА +15..+17°С
ВІЛЬНЮС +13..+15°С	МАСКВА +9..+11°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +9..+11°С

Дзве даты

25 верасня



1913 год — нарадзіўся Сяргей Грахоўскі, выдатны беларускі паэт, празаік, перакладчык. Аўтар шматлікіх паэтычных зборнікаў, аповесцяў, артыкулаў, успамінаў, эсэ. Пераклаў на беларускую мову асобныя творы А. Блока, А. Гайдара, Р. Тагора, А. Пушкіна, Т. Шаўчэнкі, Ж. Верна і інш. Многія яго вершы пакладзены на музыку. У 1936-м рэпрэсаваны. 10 гадоў правёў у сталінскіх лагерах. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992). Памёр у 2002 годзе.

1936 год — тэлеграмай з Сочы Сталін замяніў Г. Ягоду на пасадзе кіраўніка НКУС СССР М. Яжовым. Пачатак «яжоўшчыны».

Цытата дня:

«Не трэба змагацца за чысціню вуліц. Трэба падмятаць!».
Ілья Ільф (1897—1937), рускі пісьменнік.

ЧАЦВЕР

Чацвер — «мужчынскі» дзень тыдня, якому ў сучаснай сістэме адліку часу адпавядае цотны лік «чатыры». Чацвер, як і аўторак, сведчыць аб тым, што ў славянскім календары некалі адбыліся прынцыповыя змены, якія прывялі да відавочнага парадоксу. Парадкавыя нумары аўторка і чацвярга — цотныя (2-і і 4-ы), але цотныя лічбы ў многіх культурах свету былі праявай жаночага пачатку, і ім павінны былі адпавядаць такія дні тыдня, як серада і пятніца. Парадокс жа стаўлення да аўторка і чацвярга ў тым, што яны адлюстравалі жаночы (цотны) пачатак у парадкавай нумарацыі, але пры гэтым маюць назвы мужчынскага роду, на чым пераважна і грунтуецца станоўчае стаўленне да іх.

● Чацвер лічыцца найбольш спрыяльным днём для шматлікіх доўгатэрміновых перспектыўных пачынанняў, напрыклад, для пачатку будаўніцтва новай хаты, для ўдалых заручын, правядзення зажынак.

● Гэты дзень меў яркую гаспадарчую накіраванасць. З яго надыходам квасілі капусту, займаліся засолкай агуркоў, стрыглі пазногці (у час маладзіковай фазы Месяца), каб жыць у дастатку на працягу года.

● У той жа час наяўнасць літары Р у назве дня нарадзіла ў народнай свядомасці асацыятыўную забарону садзіць агародніну — яе з'яduць чаРвякі. Выключэннем з'яўляецца Чысты чацвер, калі сеюць расаду капусты ці садзяць саму капусту.

● На беларускім Палессі ў чацвер выпякалі вясельны каравай. І толькі ў тым выпадку, калі жаніх нарадзіўся ў чацвер, прыгатаванне каравая пераносілася. Часцей на сераду, радзей — на пятніцу.

● Любая гаспадыня ведае, што саліць агуркі, квасіць капусту і г.д. трэба ў чацвер на маладзіку. Пры гэтым перад пачаткам працы неабходна перахрысціцца і прачытаць наступныя словы: «На маім стале ляжыць хлеб, соль. Чакаю ў госці Хрыста і Маці Багародзіцу. Чым ёсць пачастую, а іх папрашу: дайце блаславенне для майго сялення, для майго квашэння, для ягаднага варэння. Госпадзі, блаславі, мне ў працы дапамажы. Амінь».

● Па назіраннях нашых продкаў, людзі, народжаныя ў чацвер, часцей за ўсё маюць прыгожую знешнасць: светлы твар са здаровым румянцам, ясныя вочы. Галаву яны носяць з гордасцю і годнасцю. Ніколі не просяць нешта пазычыць, лепш зацягнуць патужэй пояс, не з'яўляюцца кар'ерыстамі, не чытаюць маралі. Любяць ваду, добра плаваюць. Смачна гатуюць, любяць прымаць у сябе гасцей, спяваць душэўныя песні. Народжаныя ў чацвер — добрыя сябры, клапатлівыя бацькі, якія, аднак, больш за ўсё паважаюць утульнасць і спакой.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Хлопец — дзяўчыне:
— У мяне да вас такое пачуццё, што яго не перадаць словамі!
— Перадайце грашыма.

☺

Дарагая Марыя Іванаўна! Тэлеграму аб Вашым прыездзе атрымалі. Чакаем. У астатнім усё добра.

Ваш любячы зяць.

☺

— Каханы, скажы, я прыгожая?
— Так...
— А падрабязней?
— Так, прыгожая...

☺

Не можаш уцячы з работы ціха — уцякай хутка.

☺

— Ты што такі сумны?
— Ды вось — сын у мяне нарадзіўся...
— А як назвалі?
— Людовік...
— А чаму Людовік?!
— Ды таму, што чатырнаццаты...

☺

Раніца, 1 студзеня. Абыход у гарадской бальніцы. Урач уваходзіць у палату, глядзіць у спіс:
— Іваноў тут?
— Я.
— Як прозвішча?

☺

Сустракаюцца дзве сяброўкі. Адна кажа:
— Ты ведаеш, мой палюбоўнік паабяцаў падарыць мне норкавае футра.
— Грандыёзна!
— А яшчэ ён паабяцаў мне купіць машыну «Ферары».
— Грандыёзна!
— А яшчэ мы паедзем летам на Канары. А ў цябе што новага?
— А я пайшла на курсы культуры прамовы. Замест слоў «не свішчы!» навучылася казаць «грандыёзна!».

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81

№ 28 (278)

Як выкарыстаць ураджай

Хатняя перапрацоўка прадукцыі саду і агарода на першы погляд здаецца простай справай, але гэта не так. Яна патрабуе пэўных тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў.

Тэрмін «кансерваванне» выкарыстоўваюць для абазначэння аднаго са спосабаў апрацоўкі прадуктаў, калі іх кладуць у шкляную ці эмаліраваную пасудзіну і награваюць (пастэрылізацыя) або кіпяцяць (стэрылізацыя). З дапамогай гэтых няхітрых прыёмаў разбураюцца мікраарганізмы (плесня, мікробы), але захоўваецца харчовая каштоўнасць і смакавыя якасці. Такім чынам, у хатніх умовах можна атрымаць якасныя нарыхтоўкі практычна ўсіх прадуктаў. Абавязкова захоўваць рэжымы стэрылізацыі, пастэрылізацыі, захоўвання. Трэба ведаць і тое, што не з кожнага гатунку пладоў, ягад і агародніны можна атрымаць выдатнае варэнне, кампот, марынады, саленні і іншую прадукцыю. Прадукты для нарыхтовак павінны быць свежыя, не пашкоджаныя хваробамі і шкоднікамі, не гнілыя.

Для *кампотаў* адбіраюць плады найлепшай якасці, спелыя, але дастаткова цвёрдыя, з механічнымі пашкоджаннямі для нарыхтовак не прыдатныя.

Для *варэння* выкарыстоўваць сыравіну высокай якасці, адбіраючы плады аднолькавай велічыні і адной ступені спеласці. З недаспелых пладоў атрымліваецца нясмачнае варэнне без водару, а з пераспелых — цёмнае, разварanае і мае непрыгожы выгляд.

Для прыгатавання *пюрэпадобных прадуктаў* (працёртых, соку з мякаццю) прыдатныя плады любой якасці, абы толькі яны былі прыдатныя для яды. Форма, памер, велічыня, афарбоўка пладоў значэння не маюць.

Чытачка расказвала, што сёлета іх парадаваў ураджай яблыкаў, прасіла атрымаць рэкамендацыі аддзела захоўвання і перапрацоўкі Беларускага інстытута пладаводства, часта карыстаецца парадамі і поўнасцю давярае супрацоўнікам гэтай ўстановы. Можа яшчэ хто з задавальненнем выкарыстае іхнія парады.

ПРАЦЁРТЫЯ ЯБЛЫКІ

Для прыгатавання пюрэ можна выкарыстаць любыя здаровыя яблыкі, акрамя недаспелых. Ачышчаныя і парэзаныя скрылікамі плады праварваюць для размякчэння ў эмаліраванай альбо з нержавеючай сталі каструлі, дадаўшы 1 шклянку вады на 1 кг пладоў. Затым масу праціраюць праз сіта з нержавеючага металу ці капрону. Даюць цукар (50 г на 1 кг працёртай масы), падагараваюць, старанна перамешваючы, да поўнага растварэння цукру, у гарачым (95 — 100 градусаў) выглядзе разліваюць у слоікі і стэрылізуюць у кіпячай вадзе: паўлітровыя слоікі — 20 хвілін, літровыя — 25 хвілін.

З такога працёртага пюрэ няцяжка прыгатаваць павідла, мармелад, дадаўшы цукар і павялічыўшы працягласць варкі.

СУШКА ЯБЛЫКАЎ

Прыдатныя яблыкі розных гатункаў. Лепш выкарыстоўваць кіславатыя. Часцей за ўсё для гэтых мэтаў выкарыстоўваюць яблыкі, якія ападаюць. Іх мыюць у вадзе, падкісленай воцатам, каб змыць забруджанні і рэшткі ядахімікатаў, калі дрэвы апрацоўваліся для барацьбы са шкоднікамі. Яблыкі рэжуць скрылікамі таўшчынёй 5—7 мм. Каб яблыкі не пацямнелі ў час падрыхтоўкі да сушкі, іх адразу ж апускаюць у халодную падсоленую ваду (10—15 г солі на 1 л вады), ці падкісленую (2—4 г лімоннай кіслаты на 1 л вады). Сушаць яблыкі ў печы ці духоўцы. Тэмпературу спачатку падтрымліваюць 70—75 градусаў, затым даводзяць да 80—85 градусаў. Калі выпарыцца прыкладна 2/3 вады, тэмпературу зніжаюць да 50—55 градусаў. Сушка доўжыцца гадзін 6—10. Затым гатовы прадукт ахалоджваюць, адбіраюць недасушаныя скрылікі, якія затым дасушваюць. Правільна высушаныя яблыкі эластычныя, пры сціскванні не ломяцца і не выдзяляюць сок.

«Цяжкая» ідэя

Каб клубні касачоў ды і іншых шматгадовых раслін не вылазілі з грунту ў час зімовых адліг і часовых пацяпленняў, пакладзіце які-небудзь цяжкі прадмет, напрыклад, цэглу, плоскі камень на тое месца, дзе пасаджаны клубеньчыкі. Калі вясной зямля пачынае раставаць, здыміце гэты цяжар з раслінак, яны, як і ўсё жывое, пасля спакойнай зімоўкі, без стрэсаў, удвайне рады веснавому сонцу.

Галоўныя работы

Заканчваецца верасень, паводле назіранняў, самая халодная дэкада месяца. На парозе кастрычнік, але сіноптыкі з апаскай гавораць пра «бабіна лета», кажуць, што раз у некалькі гадоў яго наогул не бывае. Нягледзячы на любое надвор'е, добры гаспадар не пакіне свой сад-агарод непрыбраным перад зімой.

Садаводам трэба заканчваць уборку зімовых гатункаў яблыкаў. Ачысціць сад ад рознага смецця, зняць са штамбаў лоўчыя паясы, зробленыя з паперы ці саломы, і спаліць іх. Падрыхліць зямлю пад дрэвамі і кустамі, унесці арганічныя і мінеральныя ўгнаенні. Паглядзіце на свой сад, можа там ёсць вельмі старыя дрэвы і кусты, якія не даюць належнага ўраджаю, хворыя расліны, выкарчуйце іх.

Кастрычнік — месяц пасадкі новых дрэў, парэчак, маліны, агрэсту, буякоў садовых, журавінаў, брусніц. Купленыя вамі саджанцы прыкапайце да вясны, не забудзьцеся засцерагчы іх ад мышэй яловымі лапкамі або галінкамі ядловуцу.

Агароднікам трэба выбраць бульбу і караняплоды агародных культур. Да канца кастрычніка трэба зрэзаць белакачанную капусту. Калі раптам яе «прыхопяць» замаразкі ў 5—7 градусаў, не спяшайцеся яе загружаць у склеп, пачакайце, пакуль яна не «адыдзе» на карані і толькі потым здаровыя ладныя качаны закладвайце на захоўванне.

Цвятную капусту, у якой не паспелі сфарміравацца галоўкі, можна паставіць разам з каранямі ў скрынкі ў падвалах без святла на дарошчванне. Скрынкі да лістоў запаўняюць зямлёй, тэмпература паветра павінна быць 1—4 градусы цяпла.

Пасля ўборкі ўраджаю агарод трэба ачысціць ад раслінных рэшткаў, якія можна скласці ў кампост. Для падзімніх пасеваў морквы, салаты, кропу, пятрушкі градкі падрыхтаваць загадзя і сеяць пасля першых замаразкаў, каб насенне не паспела прарасці.

У кастрычніку, калі замаразкі не нашкодзілі, яшчэ цвітуць многія расліны. У асноўным гэта шматгадовыя астры і хрызантэмы. Сезон закончыўся, час паступова рыхтавацца да зімы.

Гарчыца белая і іншыя сідэраты

«Дзе можна купіць сідэратныя культуры?» — гэта пытанне цікавіць Гурноўскага Аляксандра з Баранавіцкага раёна і многіх іншых чытачоў. Насенне сідэратаў гарчыцы белай, азімага жыта, рэдзькі алейнай, канюшыны і інш. павінна прадавацца ў магазінах і кіёсках, дзе прадаецца насенне агародных культур, часам у гаспадарчых магазінах і ў магазінах «Усё для саду і агарода».

Кветка, якая кліча восень

«У мінулым годзе хрызантэмы ў нашым садзе зацвілі позна, у другой палове кастрычніка, а некаторая з іх так і не распусціліся, змерзлі ў бутонах. Як пасадзіць і правільна сфарміраваць куст хрызантэмы, каб ён паспяваў парадаваць нас да замаразкаў».

Т. Сацыевіч, Круглянскі раён.

Хрызантэма — адна з самых папулярных кветак, у яе гонар наладжваюць карнавалы, выстаўкі. У Японіі яе называюць кіку, што ў перакладзе з японскага азначае «сонца», там гэтыя кветкі лічаць сімвалам сонца. У Кітаі, які таксама з'яўляецца радзімай хрызантэмы, яе імем названы дзявяты месяц года і дзявяты дзень гэтага месяца.

«Хрызантэма» ў перакладзе з грэчаскай мовы азначае «залатая кветка». Належыць яна да сямейства астравых. Цвітуць хрызантэмы са жніўня да снежня і па тэрмінах цвіцення падраздзяляюцца на раннія (жнівень — сярэдзіна кастрычніка), сярэднія (канец кастрычніка — лістапад) і познія (снежань). Бываюць махровыя, паўмахровыя ці рамонкападобныя гатункі. А вось па форме суквецця — дробнакветкавыя (дыяметрам да 10 см) і буйнакветкавыя (дыяметрам звыш 10 см).

Буйнакветкавыя хрызантэмы вырошчваюць, як правіла, у цяпліцах, дробнакветкавыя або грунтовыя вырошчваюць у адкрытым грунце. Сярод дробнакветкавых хрызантэм выдзяляюць групу так званых карэйскіх, якія хоць і ўстойлівыя да паніжэння тэмператур, але на зіму іх трэба ўкрываць. Пасля першых замаразкаў кусты падразаюць да 15—17 см і ўкрываюць сухімі галінкамі, а зверху іх насыпаюць сухія лісты. Можна ўкрываць тарфакрошкай, слоем да 10 см.

Калі на час замаразкаў кусты хрызантэмы ўкрыць, то яны яшчэ доўга будуць радаваць нас кветкамі. Увосень буйна- і дробнакветкавыя хрызантэмы выкопваюць, высаджваюць у гаршкі ці скрынкі і ставяць у светлае, ацепленае памяшканне. Моцна паліваюць, таму што мноства дробных лісцікаў патрабуе многа вільгаці.

У хрызантэм, якія адцвілі, сцёблы абразаюць да 15 см ад зямлі. Выкопваюць, часткова стрэсваюць зямлю, абрываюць усе лісты, выдаляюць ніжнія, няхворыя, і пасаджваюць у скрынку, засыпаўшы кампостам. Захоўваць трэба ў сухім памяшканні, якое добра праветрываецца, пры тэмпературы 5—7 градусаў.

Як сказала аматар-кветкавод, аграном па спецыяльнасці, Лідзія Чарнышова, вельмі важна пры вырошчванні хрызантэм правільна іх сфарміраваць. Буйнакветкавыя хрызантэмы фарміруюць так, каб на кожным парастку заставаўся толькі адзін бутон. Усе астатнія кветкавыя пупышкі, як і парасткі, якія вырастаюць з пазух лістоў, абрываюць. Колькасць бутонаў, якія хрызантэма здольна ўтвараць, залежыць ад тэрмінаў яе чаранкавання. Калі чаранкаванне праводзілася ў лютым — сакавіку, на расліне ўтвараюцца 4 бутоны: першы веснавы з'яўляецца ў маі-чэрвені; другі (першы кронавы) — з сярэдзіны чэрвеня да канца ліпеня; трэці (другі кронавы) — у жніўні; апошні — увосень, у верасні-кастрычніку. Калі чаранкаваць у красавіку-маі расліна ўтварае толькі тры бутоны, у чэрвені — два бутоны і ў ліпені — толькі адзін. Веснавы бутон ніколі не дае паўнацэнных буйных суквецця, яны, як правіла, недаразвітыя. Таму, калі расліна дасягне вышыні 10—15 см (у красавіку), яго абрываюць пры пярвічным прышчыкванні. Першы кронавы бутон дае добра сфарміраванае суквецце толькі ў ранніх і сярэдняранніх гатункаў. У позніх гатункаў хрызантэм чарговы парастак трэба выламаць да таго, як на ім утворыцца першы кронавы бутон. А ўвогуле, гаворыць Лідзія Паўлаўна, пачатак і канец цвіцення хрызантэм залежыць ад гатунку.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, упасных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.407 Індэкс 63850. Зак. № 5249. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12